**ДУ «МІНСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ А.С.ПУШКІНА»**

**АДДЗЕЛ БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА**

# *БІБЛІЯТЭКІ МІНШЧЫНЫ Ў 2015 ГОДЗЕ: АГЛЯД ДЗЕЙНАСЦІ*

**МІНСК**
**2016**

# Оглавление

**Арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва** ………………………... 3

**Змест і арганізацыя работы з чытачамі** …………………… 5
Год моладзі ў Рэспубліцы Беларусь ……………………… 5
Фарміраванне прававой культуры насельніцтва …………... 9
Бібліятэкі і экалагічная асвета …………………………… 14
Вечнае рэха Чарнобыля ………………………………... 18
Бібліятэкі ў дапамогу фарміраванню здаровага ладу жыцця ……………………………………. 19
Бібліятэка – цэнтр зносін для людзей з абмежаванымі магчымасцямі ……………………….. 26
Сямейнае выхаванне ……………………………………. 33
Патрыятычнае выхаванне ……………………………… 35
Эстэтычнае выхаванне …………………………………. 38
Духоўна-маральнае выхаванне ………………………... 40
Краязнаўчая работа ……………………………………. 43

**Бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей** ……………………….. 59
Агляд дзейнасці дзіцячых бібліятэк Мінскай вобласці ў 2015 годзе ……………………………………………….. 59
Мерапрыемствы па прапагандзе чытання ……………….. 61

**Камплектаванне і арганізацыя адзінага фонду** …………... 93

**Інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне** ………… 96

**Метадычная дзейнасць** ……………………………………. 99

## Арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва

На 31.12.2015 г. сетку публічных бібліятэк Мінскай вобласці складаюць 475 бібліятэк. На працягу 2015 г. сетка скарацілася на 12 адзінкі: дзейнасць спынілі па 2 бібліятэкі у Вілейскім, Любанскім, Мінскім раёнах, па 3 – у Клецкім і Лагойскім раёнах, 1 – бібліятэка ў Старадарожскім раёне.

У 2015 годзе былі рэарганізаваны ў Бярэзінскім раёне Сялібская сельская інтэграваная бібліятэка в сельскую; ў Барысаўскім – бібліятэка-філіял «Цэнтральная дзіцячая бібліятэка ім. А.П.Гайдара» ў дзіцячы аддзел ЦБ; у Нясвіжскім раёне – Лявонавіцкая сельская інтэграваная бібліятэка ў сельскую бібліятэку; у Старадарожскім раёне Дражнаўская сельская бібліятэка ў сельскі клуб.

Інтэграцыя публічных бібліятэк ажыццяўляецца з улікам сацыякультурнай і дэмаграфічнай сітуацыі. На 01.01.2016 года на тэрыторыі Мінскай вобласці дзейнічаюць 109 інтэграваных бібліятэк, 101 з якіх знаходзіцца ў ведамаснай падпарадкаванасці Міністэрству культуры, 8 – Міністэрству адукацыі.

У 2015 годзе створана 19 бібліятэк, 16 з якія знаходзяцца ў ведамстве Міністэрства культуры: 3 – у Барысаўскім; 2 – у Слуцкім; 10 – у Стаўбцоўскім; 1 – Узденскім раёнах і ў ведамстве Міністэрства адукацыі 3: Любань – 1; Лагойск – 2.

На 01.01.2016 г. ў Мінскай вобласці налічваецца 42 бібліятэкі-клуба. У 2015 годзе спынілі сваю дзейнасць 3 бібліятэкі-клуба у Клецкім раёне і 1 у Любанскім.

З мэтай поўнага ахопу бібліятэчным абслугоўваннем насельніцтва маланаселеных і аддаленых вёсак пры публічных бібліятэках дзейнічаюць 398 бібліятэчныя пункты, а таксама 18 біблібусаў, якія абслугоўваюць больш за 478 аддаленых населеных пунктаў. Колькасць чытачоў – 5 216, колькасць кнігавыдач – 52 819.

У 2015 г. карыстальнікамі бібліятэк вобласці з’яўляліся 463,1 (з улікам чытачоў абласной бібліятэкі). У бібліятэках

вобласці ў цэлым назіраецца тэндэнцыя да памяншэння колькасці чытачоў: у параўнанні з 2014 г. паменшылася на 80 034 тыс. чал. Колькасць наведванняў склала па вобласці 3 595,8 тыс. наведванняў.

Чытальнасць па вобласці склала 18,4; абарачальнасць фонду – 4,5. Кнігавыдача па вобласці склала 8 583,2 экз. дакументаў (з улікам абласной бібліятэкі), што на 1 190,6 тыс. экз. менш, чым у 2014 г.

Агульны бібліятэчны фонд паменшыўся на 349,5 тыс. экз., цяпер ён налічвае 7 377,9 тыс. экз. Новыя паступленні паменшыліся на 82 695 тыс. экз. у параўнанні з папярэднім годам і ў 2015 склалі 330,7 тыс. экз. За справаздачны год з бібліятэчнага фонду выбыла 697,9 тыс. дакументаў, што на 1 268,3 тыс. экз. больш, чым у 2014 г.

У рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы ўстойлівага развіцця сяла на 2011-2015 гг. у Мінскай вобласці дзейнічаюць 270 бібліятэкі ў аграгарадках. Агульны фонд бібліятэк аграгарадкоў налічвае 2 689,4 тыс. экз. Кнігавыдача ў 2015 г. складае 2 442,7 тыс. экз., што на 363,1 тыс. экз. Менш, чым у 2014 годзе. На 01.01.2016 год карыстальнікамі бібліятэк аграгарадкоў з'яўляліся 135,7 – на 23 547 тыс. чалавек меньш у сраўненні з прошлым годам. Колькасць наведванняў на 01.01.2016 года склала 1 084,9

У Мінскай вобласці камп'ютарызавана 475 бібліятэк. Зараз агульная колькасць камп'ютараў складае 1 094 (з улікам абласной бібліятэкі), з якіх у Мінскай абласной бібліятэцы імя А.С. Пушкіна – 118, у цэнтральных бібліятэках – 488, дзіцячых – 40, гарадскіх філіялах – 44, гарпасялковых – 31, сельскіх – 369, у бібліятэках аграгарадкоў – 335.

Усяго па вобласці выхад у глабальную сетку маюць 355 бібліятэк, з іх у цэнтральных бібліятэках – 23, дзіцячых – 18, гарадскіх – 26, гарпасялковых – 18 (у тым ліку ў аграгарадках – 6), сельскіх – 269 (у тым ліку ў аграгарадках – 234).

Уласныя сайты маюць 33 бібліятэк Мінскай вобласці (з улікам абласной бібліятэкі) : абласная бібліятэка, цэнтральных – 18, дзіцячых – 5, гарпасялковых – 1, сельскіх бібліятэк – 9.

Сацыяльная роля бібліятэк павышалася на працягу ўсяго года за кошт выкарыстання сучасных тэхналогій, што спрыяла ўдасканаленню ўсёй сістэмы бібліятэчнага абслугоўвання. У мінулым годзе публічныя бібліятэкі вобласці працягвалі актывізацыю дзейнасці па аказанні дадатковых платных паслуг насельніцтву.

У сярэднім па вобласці аказваецца 40 відаў паслуг. Самымі запатрабаванымі платнымі паслугамі застаюцца выдача дакументаў з камерцыйнага фонду і чытальнай залы, ксеракапіраванне і сканіраванне.

У бібліятэках вобласці працуюць 1 629 бібліятэчных работнікаў.

## Змест і арганізацыя работы з чытачамі

### *Год моладзі ў Рэспубліцы Беларусь*

2015 год быў аб'яўлены ў нашай краіне Годам моладзі.

Бібліятэкі вобласці арганізавалі і правялі на працягу азначанага перыяду шэраг культурна-асветніцкіх акцый для моладзі, накіраваных на выхаванне патрыятызму, міласэрнасці, духоўнасці, прыцягненне ўвагі да здаровага ладу жыцця. Комплекс мерапрыемстваў бібліятэк уключаў працу па падтрымцы грамадзянскай актыўнасці моладзі, развіццё яе творчага патэнцыялу, прыцягненне да чытання, прывіццё літаратурна-мастацкага густу, прававое, эстэтычнае, экалагічнае выхаванне. Бібліятэкі вобласці прынялі актыўны ўдзел у злёце маладых паэтаў Міншчыны "Слова Купалы да творчасці кліча", які адбыўся ў маі 2015 г.

Амаль усе бібліятэкі працавалі па рэалізацыі мэтавых праграм і праектаў для моладзі. Так, бібліятэкі Бярэзінскага раёна адрасавалі моладзі і падлеткам 5 доўгатэрміновых бібліятэчных праектаў: "70 патрыятычных спраў", "Жывая кніга", "Дзяўчыне ў эпоху рызыкі", "Быць падлеткам няпроста", "Дыскатэка – тэрыторыя агітацыі і выхавання". У рамках

праектаў арганізоўваліся акцыі, агіт-кампаніі: “Чытай, пакуль малады”, “Каб у жыцці адбыцца, трэба з кнігай падружыцца”, “Школьнікам да твару чытанне”, “Чытаем разам кнігі пра вайну”, “Гімн каханню паэтычным радком”. У рамках праекта “Отечества верные сыны” ў гарадской бібліятэцы №7 г. Барысава былі арганізаваны наступныя мерапрыемствы: літаратурна-музычная кампазіцыя “По танковому следу они пришли в свою Победу”, літаратурнае падарожжа “Баллада о войне Василя Быкова, літаратурна-музычны вечар “И позвала Отчизна в бой”, гадзіна гісторыі “Подвигу солдата поклонись: Беларусь в Великую Отечественную войну»” і інш. Заслаўская гарадская бібліятэка Мінскага раёна працягвала работу па рэалізацыі праекта для моладзі “IDEA BOX” (“Вместилище идей” 2013-2015 г.г.) У рамках праекта бібліятэка прадставіла буктрэйлер “Пагартай кнігу”, анлайн-рэкамендацыю “На всех парусах – в море книжное”, буктрэйлеры самых модных сучасных аўтараў, паводле якіх зняты мастацкія фільмы. Прылуцкая інтэграваная сельская бібліятэка Мінскага раёна правяла акцыю “Маладзёжная book-сімпатыя”, мэта якой – выяўленне найбольш папулярных сярод моладзі твораў. Бібліятэка правяла апытанне моладзі ва ўзросце ад 14 да 25 гадоў на тэму: “Ці выбірае маладое пакаленне кнігу?”

Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М.Багдановіча працавала па рэалізацыі праектаў “Моладзі пра Беларусь”, “Моладзь Беларусі не жыве ў скрусе”. Працягвалася рэалізацы праекта “Традыцыі і культура харчавання народаў свету”, які быў арганізаваны сумесна з УА “Маладзечанскі дзяржаўны палітэхнічны каледж”. Бібліятэка правяла краязнаўчы квэст “Маладзечанскім гасцінцам”, прысвечаны выдатным мясцінам г.Маладзечна. Гарадская бібліятэка-філіял №1 правяла экспрэс-інфармацыю “Вместе мы – сила. Жизнь молодёжи на Молодечненской земле”, Радашковіцкая гарадская пасялковая бібліятэка – відэалекторый “Молодёжь выбирает знания”. Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка распрацавала літаратурна-асветніцкі праект “Бібліятэка. Моладзь. Кніга”. Сярод асноўных яго задач – выяўленне і

падтрымка пачынаючых маладых аўтараў,сустрэчы беларускіх пісьменнікаў з моладдзю.

Слуцкая цэнтральная раённая бібліятэка арганізавала акцыю “Моладзь. Традыцыі. Будучае”, у рамках якой правяла маладзёжны фарсайт-дыспут “Героі на ўсе часы”, літаратурны пачастунак “Маладзёжны фармат”. Гарадская бібліятэка-філіял №1 арганізавала інфакомпас “Мы маладыя. Нам выбіраць”, Квасыніцкая сельская бібліятэка – інфармацыйную панараму “На парозе дарослага жыцця”.

Цікавую работу з моладдзю праводзілі бібліятэкі Салігорскага раёна. Пры цэнтральнай раённай бібліятэцы працуе маладзёжны клуб “Чытальня”, у рамках якога адбыліся наступныя мерапрыемствы: тэматычны вечар “Вечеринка в стиле 90-х”, фотавыстава “День фотографии в библиотеке”, гадзіна інфармацыі “Встреча путешественников”, вечар “Тёплое воскресенье в библиотеке”, вечар адпачынку “Чайная вечеринка”, вечар жывой музыкі “Осенняя акустика”. Да Дня моладзі арганізавана маладзёжная бібліятэчная пляцоўка “Мы покоряем пространство и время”. У клубе “Поколение NEXT” для маладой аўдыторыі былі праведзены: чайная вечарына “Давайте знакомиться!”, майстар-клас па макіяжы “Раскрой в себе Афродиту”, гараскоп-кактэйль “Звёзды – приют ангелов”. Цэнтральнай раённай бібліятэкай арганізаваны маладзёжны экспрэс “Свободное время интересно и с пользой”, дзень маладзёжнай перыёдыкі «ЗаПРЕССУйся”. Інтэлектуальную гульню “Молодёжь и социальные сети” правяла Навапальская сельская бібліятэка, дыскусію “Что значит жить достойно?” – Доўгаўская сельская экалагічная бібліятэка. У радыёпраграме “Наше радио” прагучаў бібліяграфічны агляд літаратуры “Молодёжь – наша гордость и наше будущее”. На сайце цэнтральнай раённай бібліятэкі прадстаўлена віртуальная выстава “Молодёжное пространство – открытый формат”; да злёту маладых спецыялістаў раёна бібліятэка падрыхтавала крэатыўную выставу-адвайзер “Молодость - LAKE, или Лучшие журналы живут в библиотеке”.

Капыльская цэнтральная раённая бібліятэка імя А.Астрэйкі стварыла і актыўна прапагандавала электронную прэзентацыю да 70-годдзя Перамогі “Память в сердце стучит”, краязнаўчыя фільмы, відэафільмы, буктрэйлер “Мы выбіраем жыцце”. У бібліятэках раёна працуюць клубы для моладзі: “Пераходны ўзрост” (Грозаўская сельская бібліятэка), “Серпанцін” (Бабаўнянская сельская бібліятэка), “Адкрытая кніга” (Быстрыцкая сельская бібліятэка). Пры Клецкай цэнтральнай раённай бібліятэцы працуе юнацкі клуб “Равеснік”, у рамках якога праведзены мерапрыемствы: “Святой день Великой Победы”, “Быть здоровым – это стильно, или Жизнь стоит того, чтобы жить”, “В рабстве вредных привычек” і інш.

У Жодзінскай цэнтральнай гарадской бібліятэцы створаны маладзёжны патрыятычны цэнтр “Главное достояние Беларуси – молодёжь”, у рамках якога праведзены дзень інфармавання “2015 год – Год молодёжи”, акцыя “Наш подарок Победе – прочитанная книга о войне”, конкурс “Суперчитатель – 2015 среди молодёжи”, агляд-прэзентацыя мультымедыйных прадуктаў “Что читать, слушать и смотреть молодым”.

Цікавыя культаралагічныя акцыі праведзены бібліятэкамі Мінскага раёна: дыспут “Книга и молодёжь” – (цэнтральная раённая бібліятэка), вечар-дыялог “Моладзь у лабірынце часу” (Сеніцкая сельская бібліятэка), актуальная размова “Будучыня ў тваіх руках, моладзь” (Самахвалавіцкая сельская бібліятэка), інтэлектуальная гадзіна “Книга. Молодежь. Интеллект”, прома-акцыя “Чтение на молодёжной волне” (Заслаўская гарадская бібліятэка). Бібліятэкамі Дзяржынскага раёна арганізаваны круглы стол “У двух кроках ад дарослага жыцця” (Юркаўская інтэграваная сельская бібліятэка), “Дзень маладога чытача і маладзёжнага чытання” (Грычынская сельская бібліятэка), прэзентацыя “Современные молодёжные субкультуры” (Фаніпальская гарадская бібліятэка) і інш.

## *Фарміраванне прававой культуры насельніцтва*

2015 год характарызаваўся ростам палітычнай актыўнасці насельніцтва, актывізацыяй працы бібліятэк вобласці, накіраванай на павышэнне ўзроўню прававой культуры карыстальнікаў. Гэта звязана з важнай палітычнай падзеяй года – выбарамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

З мэтай распаўсюджвання інфармацыі аб выбарчай кампаніі ў бібліятэках вобласці афармляліся тэматычныя папкі, папкі-дасье і дайджэсты, працавалі цэнтры сацыяльна-прававой інфармацыі, інфармацыйна-адукацыйныя цэнтры, куткі выбаршчыкаў, афармляліся кніжныя выставы, тэматычныя паліцы: “Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь – 2015”, “Падлетку пра заканадаўства” (Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П.Труса); “Выбары – справа кожнага”, “Насустрач выбарам”, “Зрабі свой выбар” (Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка); “Насустрач свайму будучаму”, “Беларусь – ты маё багацце” (Вілейская цэнтральная раённая бібліятэка імя П.Новік); “Молодому избирателю”, “Выбарчая кампанія: крок за крокам” (Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М.Танка); “Беларусь ад выбараў да выбараў”, “Галасуем за будучыню Беларусі” (Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка) і інш.

Бібліятэкі вобласці правялі шэраг цікавых культуралагічных акцый насустрач выбарам. Так, у бібліятэках Клецкага раёна прайшлі святочныя праграмы “Квітней мой родны край” (Зубкаўская сельская бібліятэка), “Беларусь мая сінявокая” (Рассветаўская сельская бібліятэка), круглы стол “Права на выбар” (Комлеўская сельская бібліятэка-клуб). На нарадзе ідэалагічных работнікаў раёна дырэктар Уздзенскай сеткі бібліятэк выступіла з дакладам “Прэзідэнт Рэспублікі Беларусі – гарант Канстытуцыі правоў і свабоды чалавека і грамадзяніна”. Сустрэча з адміністрацыяй і выкладчыкамі Уздзенскага дзяржаўнага сельскагаспадарчага ліцэя таксама прысвячалася гэтай актуальнай палітычнай тэме. У бібліятэках Пухавіцкага раёна былі арганізаваны цыклы гутарак

і абмеркаванняў, аглядаў па тэмах: “Беларусь выбірае Прэзідэнта”, “Перадвыбарчыя праграмы кандыдатаў у Прэзідэнты”. У бібліятэках Смалявіцкага раёна прайшлі гадзіны інфармацыі “Усе на выбары” (Усяжская сельская бібліятэка), “Моё будущее” (Чырванасцяжская сельская бібліятэка). Лагойская цэнтральная раённая бібліятэка ў раённай газеце надрукавала бібліяграфічны агляд “У дапамогу выбаршчыкам”, на мясцовым радыё гучала гутарка “Усё аб выбарах“.

У бібліятэках Бярэзінскага раёна ў рамках акцыі “Выбіраем Прэзідэнта – вызначаем лес краіны” праведзена інтэрактыўная гульня “Выбары ў маладзёжны парламент”, агіт-кампанія “Галасуйце за нашага кандыдата!” Жодзінская цэнтральная гарадская бібліятэка правяла інфармацыйны ўрок “Политическая культура молодёжи : право избирать и быть избранным”.

Значная ўвага надавалася рабоце з моладдзю і асабліва з тымі, хто ўпершыню прымаў удзел у выбарах. Буйкаўская сельская бібліятэка Мядзельскага раёна арганізавала тэматычную гадзіну “Галасуем упершыню”; Усяжская сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна – “Выбарчы марафон”, “Галасую ўпершыню”; бібліятэкі Клецкага раёна арганізавалі вечары пытанняў і адказаў, бібліятэкі Салігорскага раёна правялі інфармацыйна-прававую гадзіну “Твой голос нужен Беларуси”, прававы ўрок “Сёння школьнік – заўтра выбаршчык”, прававы лікбез “Я голосую впервые” і інш.

Практыка апошніх гадоў паказала, што бібліятэкі становяцца інфармацыйна-прававымі цэнтрамі для сваёй мясцовасці. Тут фарміруюцца фонды прававой дакументацыі, прадастаўляецца доступ насельніцтву да прававой і сацыяльна важнай інфармацыі, распаўсюджваюцца прававыя веды, выхоўваецца прававая культура, фарміруецца эфектыўны дыялог бібліятэк з уладай.

З мэтай адбору, захавання і прадастаўлення дакументаў і матэрыялаў па прававых ведах і прававым выхаванні ў бібліятэках вобласці працуюць публічныя цэнтры прававой інфармацыі (ПЦПІ), у якіх асаблівая ўвага надаецца

ўдасканальванню інфармацыйнай структуры, развіццю электронных баз дадзенных і новых інфармацыйных тэхналогій.

Місія бібліятэк у якасці інфармацыйных і адукацыйных установ, што адпавядаюць запатрабаванням мясцовага самакіравання, ажыццяўляецца праз рэалізацыю асветніцкіх праектаў і праграм.

Бібліятэкі Салігорскага раёна працягвалі працаваць у межах праекта "Право и молодежь: век XXI" і школы прававых ведаў "Правовой меридиан". У рамках прафілактычнай акцыі "Дружим с законом" для навучэнцаў УА "Салігорскі дзяржаўны каледж" прайшла сустрэча з інспектарам па справах непаўналетніх Салігорскага РАУС па тэме: "Размышляя о правах молодежи". Адкрыты дыялог "Закон в нашей жизни" з ўдзелам участковага інспектара Салігорскага РАУС адбыўся ў Старобінскай гарадской пасялковай бібліятэцы. Велічкоўская сельская бібліятэка арганізавала адкрыты дыялог "Закон на нашей земле", Чырвонаслабадская гарадская пасялковая экалагічная бібліятэка правяла гадзіну разважання "Не навреди себе и другим". Навасвержанская сельская бібліятэка Стаўбцоўскага раёна працавала па рэалізацыі мэтавай праграмы "Моладзь: права і здароўе", у рамках якой праведзена шмат цікавых і запамянальных мерапрыемстваў.

Ва ўсіх бібліятэках вобласці афармляліся тэматычныя папкі, папкі-дасье, канвалютныя папкі, пастаянна папаўняліся новымі матэрыяламі тэматычныя картатэкі, БД.

З мэтай рэкламавання прававой інфармацыі бібліятэкі актыўна працавалі над афармленнем куткоў прававых ведаў, сацыяльна-інфармацыйных цэнтраў, кніжных выстаў, адкрытых праглядаў літаратуры, дзе экспанаваліся матэрыялы нарматыўна-заканадаўчага, юрыдычна-кансультацыйнага і сацыяльнага характару.

У бібліятэках Крупскага раёна аформлены выставы, куткі прававых ведаў "Навіны заканадаўства"; "Закон і мы"; у бібліятэках Смалявіцкага раёна – "Моладзь і права", "Государство для народа", "Грамадзянін Рэспублікі Беларусь –

гучыць ганарова”; у Мядзельскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя М. Танка – “Ты і закон”, “Прававая планета”, “Дзяржаўная сімволіка”, “Правы на кожны дзень”, “Падлетак. Закон. Права”; у бібліятэках Старадарожскага раёна – “Мы і закон”, “Юрыдычны компас”, “Вы маеце права”, “Замацаваны законам” і інш.

Пад асаблівай увагай бібліятэк дзеці з так званай “групы рызыкі”, якія знаходзяца на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх. Бібліятэкары ставяць перад сабой задачу адцягнуць іх ад шкодных звычак, далучыць да сістэматычнага чытання, развіваць творчыя здольнасці, прыцягваць да ўдзелу ў мерапрыемствах, якія праводзіць бібліятэка.

Наладжваюцца плённыя кантакты з цэнтрамі ваенна-патрыятычнага выхавання моладзі, з клубамі ветэранаў, з музеямі, установамі адукацыі, аховы здароўя, культуры, з праваахоўнымі органамі. Для моладзі арганізоўваюцца сустрэчы з інспектарамі па справах непаўналетніх, супрацоўнікамі міліцыі, дзе падлеткі маюць магчымасць атрымаць адказы на пытанні, якія іх хвалююць.

Сярод такіх мерапрыемстваў можна адзначыць: урок прававых ведаў “Ты грамадзянін, а гэта значыць…“ (Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка); вечар пытанняў і адказаў “Сто пытанняў участковаму інспектару” (Ляўкоўская сельская бібліятэка-клуб Старадарожскага раёна); прававы дыялог “Правы моладзі ў наш век” ( Зоркаўская сельская бібліятэка-клуб Пухавіцкага раёна); вечар-сустрэча “Закон і ты” (Сузваздаўская сельская бібліятэка Валожынскага раёна); актуальны дыялог “Закон і ты” (Бобрская гарадская пасялковая бібліятэка Крупскага раёна) і інш.

У бібліятэках Маладзечанскага раёна прайшлі: турнір знаўцаў права “Па лабірынтах права”, прававая гадзіна “Имею право, но обязан ” (гарадская бібліятэка-філіял №6), урок ведаў “Это мои права” (Палачанская сельская бібліятэка аграгарадка); у бібліятэках Старадарожскага раёна – прававая гадзіна “Быть защитником – великое достижение” (цэнтральная раённая бібліятэка), вечар пытанняў і адказаў “Прававы багаж

пенсіянера”, інфармацыйная гадзіна “Хочу и надо, могу и должен” (Падарэская сельская бібліятэка), круглы стол “Живу по законам страны” (Языльская сельская бібліятэка); у бібліятэках Мінскага раёна арганізаваны: дыспут “Права і мы” (Сеніцкая сельская бібліятэка), пазнавальная гульня “Закон і ты” (Прылуцкая сельская бібліятэка, Крупіцкая сельская бібліятэка-музей), гутарка-дыялог з дэпутатам Нацыянальнага сходу 2 і 3-га склікання Мазуркевіч Г.А. “Знаешь ли ты, как рождается закон”; у бібліятэках Крупскага раёна адбыліся ўрокі прававых ведаў “Закон у дапамогу інвалідам і пенсіянерам”, “Малады спецыяліст: правы і абавязкі” (цэнтральная раённая бібліятэка), прававая гадзіна “Ведай свае правы – будзь абароненым” (Ухвальская сельская бібліятэка, прававы турнір “Закон і мы ”(Коласаўская сельская бібліятэка); у бібліятэках Смалявіцкага раёна прайшоў брэйнстормінг “От права до права” (Забалоцкая сельская бібліятэка), турнір знаўцаў права “Каб жыць з годнасцю”, дыспут “Права на жыццё” (Клянніцкая сельская бібліятэка). Жодзінская цэнтральная гарадская бібліятэка правяла дзень інфармацыі “Права и обязанности молодого специалиста”, прававое рэвю “Молодая семья: права, обязанности и льготы”, прэзентацыю прававой літаратуры “На защите прав и интересов”. Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П.Труса падрыхтавала відэапрэзентацыю “Улада дзяржаўная – справы мясцовыя”, Дзешчанская сельская бібліятэка – гадзіны прававых ведаў “О правах ребёнка и обязанностях взрослых” і інш.

У бібліятэках вобласці праведзены шэраг карысных і дзейсных мерапрыемстваў для розных катэгорый карыстальнікаў. Адкрытыя дыялогі, дыспуты, круглыя сталы, прававыя ўрокі, гадзіны прававой інфармацыі, інфарміны, дні прававых ведаў, дні прафілактыкі правапарушэнняў, дні прававой культуры – такі далёка не поўны спіс формаў работы па распаўсюджванні прававых ведаў, які дае магчымасць прадставіць карыстальнікам вычарпальную інфармацыю аб законах Беларусі, дапамагаць ім спасцігаць іх сэнс, выкарыстоўваць у вырашэнні сваіх праблем.

## *Бібліятэкі і экалагічная асвета*

2011-2020 гг. аб’яўлены ў Рэспубліцы Беларусь Дзесяцігоддзем біяразнастайнасці. Экалагічная асвета набывае першараднае значэнне для паспяховага развіцця сучаснага грамадства. Інфармацыйнае забеспячэнне гэтай важнай сферы сацыяльнага жыцця з’яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці бібліятэк Мінскай вобласці. Бібліятэкі праводзяць цікавую работу па фарміраванні ў насельніцтва экалагічнай свядомасці, выхаванні і прывіцці беражлівых адносін да навакольнага асяроддзя.

Важнае значэнне надаецца афармленню інтэр’еру бібліятэк: эфектна аздобленая арыгінальнымі раслінамі ў прыгожых кашпо прастора, утульна арганізаваныя “зялёныя куткі”, экалагічныя пакоі, выставы з выкарыстаннем вырабаў з прыродных матэрыялаў, выставы малюнкаў, кветак, розных кампазіцый.

Галоўная ўмова паспяховай дзейнасці бібліятэк у гэтым кірунку – прадуманае камплектаванне фонду па экалогіі, падпіска на перыядычныя выданні. З выкарыстаннем новых інфармацыйных тэхналогій палепшыліся магчымасці бібліятэк у доступе да інфармацыі, пашырыўся рэпертуар бібліятэчных паслуг. Фонды бібліятэк пастулова папаўняюцца дакументамі на розных носьбітах, створаны спецыяльныя базы дадзеных па экалагічнай тэматыцы, бібліятэчныя сайты, інтэрнэт-рэсурсы.

Сістэматычны і паслядоўны характар гэтаму напрамку працы забяспечваюць мэтавыя праграмы. Бібліятэкі Мінскага раёна працуюць па рэалізацыі доўгатэрміновай мэтавай рэгіянальнай праграмы “Экалогія. Бібліятэка. Чалавек”; Заастравецкая сельская бібліятэка Клецкага раёна працуе па рэалізацыі мэтавай праграмы “Экалогія пачынаецца з душы”; бібліятэкі Смалявіцкага раёна – па праграме “Экалогія і бібліятэка” (2011-2015 гг.); бібліятэкі Мядзельскага раёна – па праграме “Наш экадром – Мядзельшчына (2012-2015гг.); бібліятэкі Старадарожскага раёна – па праграме “Прырода. Экалогія. Мы”; бібліятэкі Крупскага раёна – па праграме

“Любіць і аберагаць непаўторнае хараство”; бібліятэкі Валожынскага раёна – па праграме “Бібліятэка і экалогія” (2013- 2015гг.), Пяршайская сельская бібліятэка Валожынскага раёна – па праграме “Жывая планета”, Дзераўнянская сельская бібліятэка Стаўбцоўскага раёна – па праграме “Свою земную красоту природа дарит нам с тобою”.

Эфектыўнай формай работы з’яўляецца выставачная дзейнасць бібліятэк. Найбольш цікава былі афармлены наступныя выставы, цэнтры, куткі, паэтычныя кампазіцыі: “Як добра жыць пад чыстым небам” (Сіняўская сельская бібліятэка), “Экалагічная хатка” (Заастравецкая сельская бібліятэка) Клецкага раёна; “Давайте беречь планету – во всей Вселенной другой такой нету!” (бібліятэка-філіял №2 г.Жодзіна); “Непаўторны свет прыроды” – (Капыльская цэнтральная раённая бібліятэка імя А.Астрэйкі); “Мая зямля – адна загадка” (Ждановіцкая сельская бібліятэка), “Таямніцы і загадкі прыроды” (Каладзішчанская сельская бібліятэка), “Как не любить эту землю” (Юзуфоўская сельская бібліятэка Мінскага раёна) і інш.

Мядзельская цэнтральная раёная бібліятэка імя М.Танка пасродкам электроннай БД “Мядзельшчына – край блакітных азёр” сістэматызуе матэрыял мясцовага характару, дапамагае чытачам аператыўна атрымаць інфармацыю з апошніх публікацый пра дасягненні і праблемы развіцця Нарачанскага рэгіёна.

Сумесна з райвыканкамамі, сельсаветамі, лязгасамі і іншымі арганізацыямі бібліятэкі вобласці арганізоўваюць мерапрыемствы па добраўпарадкаванні тэрыторый бібліятэк, вуліц, вёсак, удзельнічаюць у рабоце па ўборцы сваіх населеных пунктаў. Бібліятэкі Бярэзінскага, Пухавіцкага, Лагойскага і іншых раёнаў пастаянна арганізоўваюць акцыі “Чысціня маёй вёскі”, “Чыстая вуліца”, “Чысты двор”; бібліятэкары Мядзельскага раёна наводзяць парадак на могілках, на аўтобусных прыпынках, у месцах адпачынку; бібліятэкары Крупскага, Валожынскага раёнаў разам з

работнікамі лясгаса праводзяць акцыі “Пасадзі дрэва”, “Чысты лес” і інш.

Бібліятэкі вобласці праводзяць вялікую работу па распаўсюджванні экалагічных ведаў сярод насельніцтва, выхаванні беражлівых адносін да прыроды, ашчаднага выкарыстання прыродных рэсурсаў.

У бібліятэках паспяхова праводзіліся конкурсна-гульнёвыя і пазнавальныя праграмы, віктарыны, слайд-прэзентацыі, экалагічныя ўрокі, гадзіны карысных, цікавых паведамленняў, экалагічнае лато, брэйн-рынгі, падарожжы, конкурсы, гадзіны памяці, урокі смутку.

Так, раённы агляд-конкурс “Захаваем прыроду разам”, літаратурны конкурс “Аб родным краі скажу свае слова”, творчы конкурс малюнкаў “Вясёлка” арганізавала Мінская цэнтральная раённая бібліятэка. У Гатаўскай бібліятэцы аграгарадка прайшла выязная прэзентацыя Мінскага заапарка з выставай жывёл. У Ждановіцкай сельскай бібліятэцы арганізавана выязная выстава Мінскага заапарка пад дэвізам “Гэтыя цудоўныя жывёлы”. У Каладзішчанскай сельскай бібліятэцы праведзены літаратурны вечар “Вялікія пісьменнікі аб прыродзе”, у Самахвалавіцкай сельскай бібліятэцы – відэалекторый “Зелёные лёгкие городов”. Сустрэчы чытачоў з леснікамі “На варце лясных абшараў” набылі сваё сталае месца ў працоўных планах бібліятэкараў Ратамскай сельскай бібліятэкі Мінскага раёна.

Дзень экалогіі “Зямля – наш агульны дом”, дзень экалагічнай перыёдыкі “Экалагічныя праблемы на старонках перыядычных выданняў”, гутарка-перасцярога “Экалогія: трывога ўзрастае” арганізавала Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка. Пазнавальна-гульнёвую праграму “Скарбы прыроды Беларусі”, якая прайшла ў рамках праекта “Моладзі аб Беларусі”, арганізавала Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М.Багдановіча; экспрэс-падарожжа “Па старонках Чырвонай кнігі Капыльшчыны”, экалагічную вандроўку “Па рэках Капыльшчыны” правяла Капыльская цэнтральная раённая бібліятэка імя А.Астрэйкі; бібліятэчны экадысант да

гідралагічнага помніка прыроды рэспубліканскага значэння, крыніцы “Юцкоўскай”, выставу-прэзентацыю “У вандроўку па роднай зямлі”, мультымедыйную прэзентацыю “Сем цудаў Волмы” арганізавалі бібліятэкі Дзяржынскага раёна; экалагічны круіз “Природа Солигорщины”, экалагічны альманах “Красота родной земли” арганізавалі бібліятэкі Салігорскага раёна; месячнік “Ахоўваць прыроду – значыць любіць Радзіму”, прэзентацыю выставы фотаздымкаў мясцовага жыхара Т.У.Казака “Мясцінам родным прысвячаю…” правялі бібліятэкі Пухавіцкага раёна.

Цікавыя і разнастайныя формы работы выкарыстоўваюць бібліятэкі Мінскай вобласці пры падрыхтоўцы да дат экалагічнага календара: Дня птушак, Міжнароднага дня зямлі, вады, Дня аховы навакольнага асяроддзя. Так, акцыі “Птушыная сталовая” з падкормкай птушак зімой праводзяцца ў бібліятэках Нясвіжскага, Мядзельскага раёнаў. Экалагічную гадзіну “Таямнічы свет балот”, экалагічны дыялог “Не шкодзь прыродзе, жыві з ёй у згодзе” правяла Ухвальская сельская бібліятэка, пазнавальна-экалагічную гадзіну “Беларускія балоты – багацце нашай краіны” – Дакудаўская сельская бібліятэка-клуб, пазнавальную гадзіну “Цудоўны мір вады” – Бобрская гарадская пасялковая бібліятэка Крупскага раёна; пазнавальную гадзіну “Вада – крыніца жыцця” – Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М.Танка, гадзіну развагі “Потомкам – чистую Нарочь” (Крывіцкая гарадская пасялковая бібліятэка Мядзельскага раёна). Тыдзень экалагічных ведаў “Мир природы открывает книга” са змястоўнымі і цікавымі мерапрыемствамі па экалогіі правялі бібліятэкі Старадарожскага раёна; слайд-прэзентацыю “На гэтай зямлі нам жыць!”, экалагічны маніторынг “Дайце планеце шанс”, віктарыну “Барометры прыроды” арганізавалі бібліятэкі Вілейскага раёна; экалагічны ўрок “Крылатыя суседзі”, гадзіну экалогіі “Белый аист летит”, “Гэта зямля твая и мая” правялі бібліятэкі Стаўбцоўскага раёна.

Амаль у кожнай бібліятэцы вобласці па-ранейшаму працуюць аматарскія аб’яднанні экалагічнай асветы : клубы кветкаводаў “Флора” (Салігорская цэнтральная раённая

бібліятэка); “Лотас” (Свірская  гарадская пасялковая бібліятэка Мядзельскага раёна); літаратурна-экалагічны клуб “Фларыда” (Заастравецкая сельская бібліятэка Клецкага раёна) і інш.

## Вечнае рэха Чарнобыля

Бібліятэкі вобласці арганізавалі і правялі шэраг культурна-асветніцкіх акцый, прысвечаных чарговай гадавіне аварыі на Чарнобыльскай АЭС: вечар-сустрэчу “Чарнобыль у нашай памяці” (Даматканавіцкая сельская бібліятэка), дзень смутку “Попел Чарнобыля стукае у дзверы” (Сякерыцкая сельская бібліятэка), Клецкі раён; круглы стол “Балючы ўспамін” (Сугваздаўская сельская бібліятэка), відэафільм “Чарнобыльскія джунглі” (Івянецкая гарадская пасялковая бібліятэка), Валожынскі раён; літаратурны набат “Чарнобыльская рэха” (Слуцкая цэнтральная раённая бібліятэка), абмеркаванне  твораў беларускіх пісьменнікаў “Бедой зажжённое слово” (Вежская сельская бібліятэка), слайд-рэквіем “Чернобыльской весне забвенья нет” (Лучнікоўская сельская бібліятэка), Слуцкі раён; гадзіну памяці “Чарнобыль – наш боль” (Хацежынская сельская бібліятэка), вечар памяці “Вечное эхо Чернобыля” (Замастоцкая сельская бібліятэка), відэалекцыю “Чарнобыль – наша памяць” (Юзуфоўская сельская бібліятэка), Мінскі раён; выставу-рэквіем “Чарнобыль. Трагедыя. Мужнасць” (Камароўская сельская бібліятэка), літаратурную гадзіну “Чарнобыль – боль, які спальвае сэрцы” (Сваткаўская сельская бібліятэка), гадзіну-роздум “Чарнобыль у нашай памяці” (Будслаўская сельская бібліятэка), гадзіну памяці “Чарнобыль звоніць у званы” (Старлыгская сельская бібліятэка), інфармацыйна-пазнавальную гадзіну “Экран пра Чарнобыль: 29-гадовы шлях ” (Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М.Танка); тэматычную  кампазіцыю-рэквіем “Спаси и помилуй нас, Черный аист” (Старадарожская цэнтральная раённая бібліятэка), мультыпрэзентацыю “Чернобыль – трагедия 20 век” (Залужская сельская бібліятэка-клуб), дзень смутку “Чернобыль и мы” (Ляўкоўская сельская

бібліятэка), Старадарожскі раён; дзень смутку “Чорны летапіс Беларусі” (Лагойская цэнтральная раённая бібліятэка), гадзіну памяці “Чарнобыль – вечны неспакой” (Янушкавіцкая сельская бібліятэка), гадзіну смутку “Балючая памяць Беларусі” (Плешчаніцкая гарадская бібліятэка), вечар-успамін “Чарнобыль вачамі сведкі” (Каменская сельская бібліятэка), Лагойскі раён; вечарыну-смутак “Чернобыль в нашей памяти” (Куркаўская сельская бібліятэка), гадзіну смутку “Чарнобыль – наш боль і перасцярога” (Арджанікідзіеўская бібліятэка-філіял), літаратурную хвіліну “Чарнобыль у беларускай паэзіі” (Прылепская сельская бібліятэка), Смалявіцкі раён; вечар-рэквіем “Чернобыль – чёрная боль” (Заўшыцкая сельская інтэграваная бібліятэка), літаратурна-музычную гадзіну “Чернобыль в белорусской поэзии” (Велічкоўская сельская бібліятэка), Салігорскі раён; экалагічны вечар “Чарнобыльскі бумеранг” (Негарэльская сельская бібліятэка), Дзяржынскі раён; абмеркаванне аповесці А.Аляшкевіча “Чарнобыльскія матылькі”, цыкл “Ахвяры Чарнобыля – дзеці” (Багушэвіцкая сельская бібліятэка-клуб), вечарыну памяці “Званы Чарнобыля ў сэрцах любашанцаў” (Любашанская сельская бібліятэка), Бярэзінскі раёні інш.

## *Бібліятэкі ў дапамогу фарміраванню здаровага ладу жыцця*

Работа па папулярызацыі здаровага ладу жыцця, фізічнай культуры з мэтай прафілактыкі ў насельніцтва шкодных звычак стала неад’емнай і планамернай часткай дзейнасці бібліятэк Мінскай вобласці. Сёння ў краіне створана адзіная дзяржаўная сістэма па прапагандзе здаровага ладу жыцця. Сведчанне гэтаму Дзяржаўная праграма прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі на 2011-2015 гг., Дзяржаўная праграма нацыянальных дзеянняў па папярэджванні і пераадольванні п’янства і алкагалізму на 2011-2015 гг., рэспубліканскія акцыі “Скажи СПИДу – нет”, “Беларусь без тытуню”, “Да 21 года без алкаголю”, абласная

акцыя “Шкодным звычкам – не, жыццю – так”. Інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк у гэтым напрамку шырокія і разнастайныя. Асноўны матэрыял бібліятэкары чэрпаюць з кніжных фондаў, перыядычных выданняў, Інтэрнэта. Карыстальнікам прадастаўляецца інфармацыя, назапашаная ў пакетах дакументаў, электронных каталогах, электронных базах дадзеных, праз Інтэрнэт.

Ва ўсіх бібліятэках вобласці афармляюцца куткі здароў’я, кніжныя і электронныя выставы, адкрытыя прагляды літаратуры, тэматычныя паліцы, накіраваныя на папулярызацыю здаровага ладу жыцця. Бібліятэкары імкнуцца разнастаіць формы прадастаўлення матэрыялу, выкарыстоўваючы ілюстрацыі і відэаматэрыялы, ствараючы інсталяцыі, прапануюць карыстальнікам новыя формы выстаў.

Дзеля больш шырокага інфармавання аб шкодных звычках у Жодзінскай цэнтральнай гарадской бібліятэцы створаны і сістэматычна папаўняюцца электронныя БД “Алкоголизм: профилактика и лечение”, “Здоровый образ жизни”, “Вредные привычки”, “Алкоголь и здоровье”. Змястоўныя выставы былі аформлены ў бібліятэках г.Жодзіна: прэзентацыя электронных часопісаў “Здаровы лад жыцця”, выстава-пытанне “Хотите дожить до 100 лет?», выстава “Спасай взятых на смерть”, выстава-напамін “Коварный разрушитель здоровья” (цэнтральная гарадская бібліятэка). Выставы “За здаровы лад жыцця”, “Здароўе – жыцця крыніца” аформлены ў бібліятэках Клецкага раёна. У Слуцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы аформлена выстава-парада “Праз кнігу – да здароўя”, у Лучнікоўскай сельскай бібліятэцы – выстава “Ствары і захавай сваё здароўе”, у Падлескай сельскай бібліятэцы Слуцкага раёна – выстава “Пресса от недуга и стресса”. У бібліятэках Мінскага раёна арганізаваны выставы “Неверагодна, але факт” (Ждановіцкая сельская бібліятэка), “Быць здаровым – модна, карысна, прыгожа”, “Здароўе і прыгажосць – лепшыя сябры” (Каладзішчанская сельская бібліятэка), “К здоровью с книгой” (Самахвалавіцкая сельская бібліятэка) і інш.

Установка на змяненне адносін да свайго здароўя, да прынцыпаў здаровага ладу жыцця закладзена у рэгіянальных праграмах і праектах, распрацаваных бібліятэкамі вобласці. Так, сетка бібіліятэк Салігорскага раёна працуе ў рамках мэтавага праекта “Здоровый Я – здоровая страна!”; бібліятэкі Слуцкага раёна працягваюць праграму “За здаровы лад жыцця”; бібліятэкі Нясвіжскага раёна працуюць па праграме “Здоровье – образ жизни”; Праўдзінская сельская бібліятэка Пухавіцкага раёна рэалізуе праграму “Здаровы лад жыцця – гэта шлях для кожнага” (2015-2016гг.); бібліятэкі Бярэзінскага раёна працягваюць працу па праектах “Тэрыторыя агітацыі і прапаганды – дыскатэка” (2012-2016гг.), “Дзяўчыне ў эпоху рызыкі”, “Жывая кніга”, “Усёй грамадой супраць п’янства” (2015-2016гг.) і інш. У рамках праекта “С.М.С. (Семья. Молодежь. Социум)” гарадская біябліятэка №1 г. Барысава і УА “Барысаўскі дзяржаўны коледж галіновых тэхналогій” арганізавалі гульнёвы марафон “Формула здоровья” і гадзіну пратэсту “Наркотики: реальность или мир иллюзий”. Ва ўсіх бібліятэках вобласці адбыліся сустрэчы з медыцынскімі работнікамі, дзе спецыялісты знаёмілі чытачоў са статыстыкай у раёне, расказвалі аб шкодзе, якую наносяць чалавеку алкаголь, курэнне, наркотыкі, выпадковыя сувязі. Менавіта ўдзел спецыялістаў, валодаючых пэўнай інфармацыяй і здольных адказаць на самыя разнастайныя пытанні, дапамагае наладзіць дыялогавыя формы работы з чытачамі.

У бібліятэках Слуцкага раёна адбыліся сустрэчы з медыкамі, псіхолагамі, сацыяльнымі работнікамі, прадстаўнікамі праваахоўных органаў. У рамках акцыі “ВИЧ! Скрытая угроза – открытая борьба” праведзены: інфармацыйны кур’ер “Моладзь за жыццё без СНІДУ і наркотыкаў” (гарадская бібліятэка-філіял №2), урок “СНІД: не застанемся абыякавымі” (Сяражская інтэграваная сельская бібліятэка), прэс-рэвю “XXI стагоддзе і СНІД” (Лучнікоўская сельская бібліятэка). Слуцкая цэнтральная раённая бібліятэка правяла бібліядрайв “Каб жыць было здорава” і інфармацыйную сераду “Стыль жыцця – здароўе”.

Бібліятэкі Салігорскага раёна у рамках мэтавага праекта “Здоровый Я – здоровая страна!” правялі шэраг мерапрыемстваў “Под знаком милосердия и гуманности”. Гэта мультымедыйная прэзентацыя “Сёстры милосердия” (цэнтральная раённая бібліятэка), тэматычны вечар “Здоровое поколение – здоровое будущее” з удзелам псіхолога, вечар карысных парад “Из копилки советов здоровых людей” (цэнтральная раённая бібліятэка).

У бібліятэках Чэрвеньскага раёна адбыліся вечары-сустрэчы з псіхологам ТЦСАН “Смяротная дыета”, з інспектарам па справах непаўналетніх Чэрвеньскага РАУС “Кайф или Life? Вот в чем вопрос”, з інспектарам раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях “Пусть знает каждый гражданин – пожарный номер 101”, з медсястрой раённай бальніцы “СНІД не выбірае – выбіраеш ты”.

Дзяржынская цэнтральная раённая бібліятэка правяла слайд-рэпартаж “Не отнимай у себя завтра”, гадзіны пытанняў і адказаў “Обманутые судьбы, или Унесённые спайсом”, актуальны дыялог “Падение в пропасть” з дэманстрацыяй відэафільма. Цікавае мерапрыемства ў фармаце ток-шоу «Современная молодежь» : надежды на будущее или потерянное поколение?“ адбылося ў Уздзенскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя П.Труса. У адкрытым дыялогу ўдзельнічалі моладзь, настаўнікі, супрацоўнікі РАУС, урачы, настаяцель храма і інш. У рамках акцыі “Здароўе і маладосць” бібліятэкі Валожынскага раёна правялі конкурс “Здароўем даражыць умейце”, (цэнтральная раённая бібліятэка); у бібліятэках Нясвіжскага раёна праведзены дыскусія “За здоровое поколение”, пазнавальная праграма “Подросток. Стиль жизни” з удзелам медыцынскіх работнікаў і інш.

Ва ўсіх бібліятэках вобласці арганізоўваліся месячнікі, тыдні моды на здароўе, тыдні цвярозасці, дэкады барацьбы з СНІД, наркаманіяй, аб’яўляліся шматлікія акцыі.

Бібліятэкамі вобласці праводзілася актыўная работа да Сусветнага дня прафілактыкі СНІД, да Міжнароднага дня барацьбы з наркаманіяй, да Міжнароднага дня без тытуню.

Тэматыка мерапрыемстваў featured рознабаковая і запатрабаваная. Карыстальнікі бібліятэк з цікавасцю знаёміліся з літаратурай, якую прапанавалі бібліятэкары па тэме мерапрыемстваў, з электроннымі рэсурсамі.

Цікавая работа ў гэтым напрамку праводзілася ў бібліятэках Любанскага раёна. Гадзіну шчырай размовы “Не загубі свой лёс” правяла цэнтральная раённая бібліятэка, актуальны дыялог “Вредным привычкам – книжный заслон” – Рачэнская сельская бібліятэка, мультымедыйную прэзентацыю “Моладзі аб СНІДзе” – Малагарадзяціцкая сельская бібліятэка, урок ведаў “СНІД: ведаць і змагацца” – Забалацкая сельская бібліятэка. У бібліятэках Стаўбцоўскага раёна праведзены трэнінг “Як кінуць курыць?”, дыскусійны стол з удзелам фельчара “Рабства па ўласным жаданні”, круглы стол “Бацькі супраць наркотыкаў” з удзелам сацыяльнага работніка (Горкаўская сельская бібліятэка). У бібліятэках Лагойскага раёна адбылася гадзіна здароўя “Суд над курэннем: за і супраць”, “Курэнне – небяспечная звычка” (Акцябрская сельская бібліятэка), інфарміна “Бясшкодных наркотыкаў не бывае” (Плешчаніцкая гарадская бібліятэка), у рамках тыдня падлетка ў Засоўеўскай сельскай бібліятэцы-клубе адбылася сустрэча з фельчарам ФАП “Падлетак і здароўе”. У Смалявіцкай цэнтральнай бібліятэцы імя М.Багдановіча, Слабадскойя сельскай бібліятэцы – “Мы против курения”

Актыўную работу па прапагандзе здаровага ладу жыцця, прафілактыцы шкодных звычак сярод насельніцтва праводзяць бібліятэкі Бярэзінскага раёна. Вось прыклады некаторых мерапрыемстваў: тыдзень прафілактыкі ўжывання спайсаў “Стоп спайс”, агітмарафон “Дай жыццю шанс – не ўжывай спайс!”, тыдзень прафілактыкі ўжывання курыцельных сумесяў “Спайс”, тыдзень антытытунёвай прапаганды “Нікацін – вораг №1!”, акцыі “Школа без тытунёвага дыму”, “Вакзал без тытунёвага дыму”, “Жанчыны супраць курэння”, “Калектыў без цыгарэтнага дыму”, “Моладзь супраць СНІДу”. Доўгатэрміновы праект Бярэзінскай цэнтральнай раённай бібліятэкі “Усёй грамадой – супраць п’янства” адзначаны падзякай губернатара

вобласці. Многа цікавых мерапрыемстваў адбылося ў рамках пералічаных акцый. Сельскія бібліятэкі раёна прынялі актыўны ўдзел у прапагандзе здаровага ладу жыцця. Можна назваць акцыі на дыскатэках: “Цыгарэта спальвае маладосць”, “Хочаш жыць – кідай курыць” (Багушэвіцкая, Брадзецкая сельскія бібліятэкі), дзень здароўя “Як курэнне ўплывае на здароўе” (Паплаўская сельская бібліятэка), урок бяспекі “Мабільная атака: чым небяспечны мабільнік” і агіт-акцыя “Курыць не модна – дыхай лягчэй” (Сялібская сельская бібліятэка).

Беларускія чацвяргі цыкла “Кніга супраць шкодных звычак” прадугледжвалі гутаркі з наведвальнікамі сельскіх бібліятэк з выкарыстаннем адпаведных тэме твораў беларускіх пісьменнікаў. Моладзі былі адрасаваны дні прафілактыкі шкодных звычак “На прыступках пекла”, “Дзеці ночы – служкі зла”, літаратурныя “суды” па кнігах Я.Хвалея, Ю.Станкевіча і інш.

Цікавыя і актуальныя мерапрыемствы былі арганізаваны ў бібліятэках Мінскага, Мядзельскага, Пухавіцкага, Барысаўскага, Вілейскага, Валожынскага, Клецкага, Капыльскага і іншых раёнаў. На многіх мерапрыемствах педагогі, урачы, псіхолагі і іншыя спецыялісты знаёмілі прысутных з статыстычнымі звесткамі аб распаўсюджванні шкодных звычак у вобласці і раёнах, расказвалі пра прафілактычныя меры, якія прымаюцца ўладамі і медустановамі, даводзілі, наколькі важна кожнаму чалавеку, асабліва моладзі, беражліва ставіцца да свайго здароўя, адказвалі на шматлікія пытанні.

Фізічная культура і спорт – неад’емная частка фарміравання здаровага ладу жыцця. Таму бібліятэкі праводзяць шматлікія акцыі, прысвечаныя фізічнаму здароўю падрастаючага пакалення. У бібліятэках вобласці праведзены наступныя мерапрыемствы: спартыўны калейдаскоп “Выбірай спорт, выбірай здароўе” (Гатаўская сельская бібліятэка), гадзіна здароўя “Спорт – элексір здароўя” (Каладзішчанская сельская бібліятэка Мінскага раёна), літаратурна-спартыўнае інфармацыйнае рэвю “Спорт і здароўе – адзіныя сябры”

(ДУ “Мінскі РЦК”); інфармацыйная гадзіна “Алімпійскія зоркі Беларусі” (Сароцкая сельская бібліятэка), спартыўная гульня “Зов пущи” (Соснаўская сельская бібліятэка Любанскага раёна); спартыўная гадзіна “Алімпійскі настрой”, спартыўнае свята “Галоўны рэкорд – здароўе”, гульнёвая праграма “Краіна Спартландыя”, хвілінкі здароўя “Сонца, паветра і вада – нашы лепшыя сябры” (Капыльская цэнтральная раённая бібліятэка імя А.Астрэйкі); дзень здароўя “Улыбка, спорт, здоровье – нам в жизни ценное подспорье”, “Жизнь прекрасна – не трать её напрасно” (Чырванасцяжская сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна) і інш.

Цікавыя мерапрыемствы праходзілі на пасяджэннях клубаў і аматарскіх аб’яднанняў. Прыхільнікаў здаровага ладу жыцця збірае на свае пасяджэнні культурна-аздараўленчы клуб “АІР”, які больш 15 гадоў плённа працуе пры Клецкай цэнтральнай раённай бібліятэцы. Для ўдзельнікаў клуба арганізаваны пазнавальныя мерапрыемствы: “Свет мой зеркальце, скажи, или Что говорит наш окружающий мир”, “Релаксация и сонастройка организма человека”, “Модель семейных отношений”, “Древо жизни” і інш.

У Маладзечанскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя М.Багдановіча працуе маладзёжны клуб “Гармония”, дзе прайшлі наступныя пасяджэнні: “Истина жизни в здоровье”, “Горькие плоды сладкой жизни” з удзелам урача скурна-венералагічнага дыспансера, занятки з псіхолагам РТЦСАН. На занятках “Школы здароўя” (гарадская бібліятэка-філіял №1) Маладзечанскага раёна прайшлі мерапрыемствы “Быць здаровым – гэта здорава”, “Дарога да добрага здароўя”, “Лёсы, разбітыя ўшчэнт”. У рамках клуба “Ключ к здоровью” (Жодзінская цэнтральная гарадская бібліятэка) адбыліся такія мерапрыемствы: асарці карысных парад ад урача-рэабілітолага “Физические методы реабилитации”, ад кансультанта клуба “Здоровый образ жизни” пад назвай “По ступенькам правил здорового питания”, майстар-клас “Уход за кожей лица” менеджара кампаніі “Oriflame”, гутарка з урачом “Туберкулёз –

профилактика”, кансультацыя “Бросьте вызов лишнему весу” і інш.

Партнёрства з установамі адукацыі, медыцыны, культуры стала дадатковым і вельмі важкім рэсурсам у прапагандзе здаровага ладу жыцця. Цеснае супрацоўніцтва наладжана бібліятэкамі вобласці з цэнтрамі гігіены і эпідэміялогіі, тэрытарыяльнымі медыцынскімі аб’яднаннямі, аб’яднаннем “Чырвоны крыж”, аддзеламі па рабоце з моладдзю, БРСМ, праваахоўнымі органамі і інш.

### *Бібліятэка – цэнтр зносін для людзей з абмежаванымі магчымасцямі*

Кіруючыся прынятай на 2011-2015гг. “Дзяржаўнай праграмай па стварэнні безбар’ернага асяроддзя жыццядзейнасці фізічна аслабленых асоб”, у Мінскай вобласці створана адзіная дзяржаўная сістэма рэабілітацыі сацыяльна неабароненых катэгорый насельніцтва. Бібліятэкі рэгіёна актыўна падключыліся да рэалізацыіі гэтай праграмы, выкарыстоўваючы свой прафесійны рэсурс: праводзяць вывучэнне сацыякультурнай сітуацыі ў зонах абслугоўвання, па выніках якога ствараюць базы дадзеных пажылых людзей, інвалідаў, дзяцей-сірот, складаюць планы работы з азначанай катэгорыяй насельніцтва. Галоўная ўмова далучэння гэтага кантынгенту да кнігі – зрабіць бібліятэку даступнай, таму бібліятэкары актыўна выкарыстоўваюць у абслугоўванні пазастацыянарныя формы, індывідуальнае абслугоўванне на даму, у бібліятэках працуе служба “Кніга – 103”. Па тэлефоне бібліятэкары праводзяць кансультацыі па розных пытаннях, міні-прэзентацыі новай літаратуры. У бібліятэках можна атрымаць не толькі неабходную інфармацыю, але і копію дакумента ў электронным ці друкаваным выглядзе. Жыхары аддаленых вёсак абслугоўваюцца біблібусам. Так, пункты выдачы працуюць пры дамах сацыяльных паслуг Бабаўнянскай бальніцы сястрынскага догляду, Быстрыцкай бальніцы-хоспісе, Капыльскім доме-інтэрнаце Капыльскага раёна. Працягваецца

абслугоўванне хворых, якія знаходзяцца на стацыянарным лячэнні ў бальніцах, Пухавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкай, Рудзенскай і Свіслацкай гарпасялковымі бібліятэкамі, Зазер’еўскай сельскай бібліятэкай, Палажэвіцкай сельскай бібліятэкай Старадарожскага раёна, Уздзенскай цэнтральнай раённай бібліятэкай. Штогод супрацоўнікі Лагойскай цэнтральнай раённай бібліятэкі праводзяць мерапрыемствы ў доме-інтэрнаце для інвалідаў і састарэлых. Любушанская сельская бібліятэка Бярэзінскага раёна абслугоўвае хворых Дулебскага кругласутачнага знаходжання, адрасуючы ім сеансы кнігатэрапіі “Лечымся кнігай”, агляды цікавых публікацый раённай газеты, рэйды міласэрнасці, святы радасці. Сумесна з СДК на базе Дулебскага аддзялення праведзена акцыя-віншаванне “Не старэць – не хварэць”.

Бібліятэкі Нясвіжскага раёна распрацавалі духоўна-культурны праект “Под напев молитв пасхальных” для пражываючых у доме-інтэрнаце. У рамках праекта прайшоў дзень прыемных сустрэч да Дня інвалідаў “Чалавек сярод людзей”. З дапамогай біблібуса абслугоўваюцца людзі пажылога ўзросту і інваліды, якія знаходзяцца ў сацыяльным прытулку “Сямейны прычал” (вёска Вайганы Валожынскага раёна).

У Пухавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы сфарміраваны фонд агучанай літаратуры для людзей з слабым зрокам. Ён налічвае каля 113 экзэмпляраў твораў на аўдыякасетах і CD-дысках. Інфармацыя пра фонд змешчана на інфармацыйных стэндах бібліятэкі. Бібліятэка наладзіла цесныя кантакты з раённым таварыствам інвалідаў па зроку. Бібліятэкары праводзяць для інвалідаў рэкамендацыйныя гутаркі, бібліяграфічныя агляды кніг на аўдыякасетах, электронных дысках пад назвай “Вы тоже можете читать”.

У Смалявіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы працягваецца работа па абслугоўванні карыстальнікаў з слабым зрокам. Арганізаваны фонд агучанай літаратуры, які налічвае 165 дыскаў, набыта агучаная літаратура, арганізавана камп’ютарнае месца.

У бібліятэках вобласці ствараюцца сацыяльна-інфармацыйныя цэнтры, куткі сацыяльна-бытавой інфармацыі, цэнтры псіхалагічнай дапамогі, пункты псіхалагічнай падтрымкі, псіхолага-кансультацыйныя цэнтры, дзе ўтрымліваюцца рашэнні мясцовых органаў улады, графікі прыёму грамадзян дэпутатамі, матэрыялы фактаграфічнага характару аб медыцынскіх цэнтрах, установах сістэмы сацыяльнай абароны насельніцтва, адукацыі, службы быту з указаннем іх адрасоў, тэлефонаў, рэжыму працы, матэрыялы аб працоўным, пенсіённым заканадаўстве, ільготах. У бібліятэках афармляюцца папкі-дасье, інфадайджэсты, рэкамендацыйныя спісы літаратуры, памяткі, лісткі.

Бібліятэкі вобласці знаходзяцца у пастаянным пошуку нестандартных форм і метадаў работы, распрацоўваюць мэтавыя праграмы, праекты па арганізацыі вольнага часу інвалідаў і людзей сталага ўзросту, спрыяюць іх далучэнню да паўнацэннага жыцця.

Шмат гадоў у Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя І.Каладзеева рэалізуецца праект “Библиотека без границ”, мэта якога – стварэнне безбар’ернага культурнага асяроддзя. Супрацоўнікі цэнтра сумесна з аддзяленнем дзённага прабывання маладых інвалідкаў ДУ “Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва” і барысаўскім аддзяленнем грамадскага аб’яднання “Беларуская ассацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам” ствараюць камфортнае асяроддзе зносін і стымулююць сваіх падапечных да творчай дзейнасці. Цэнтр арганізуе для іх у бібліятэцы выставы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, бібліяграфічныя агляды, відэагутаркі, слайд-гутаркі, майстар-класы, урокі духоўнасці, экскурсіі, мерапрыемствы з элементамі тэатралізацыі. Так, было праведзена мерапрыемства “Художник русских сказок”, прысвечанае 115-годдзю з дня нараджэння Юрыя Васняцова, адбылося пасяджэнне клуба “Парус”, членамі якога з’яўляюцца маладыя людзі з абмежаванымі магчымасцямі. У рамках імідж-праекта “Мне через сердце виден мир” гарадской спецыялізаванай бібліятэкі №5 па рабоце з інвалідамі па зроку

прайшлі мерапрыемствы: калядныя чытанні “Под чистым снегом Рождества”, літаратурна-музычная кампазіцыя “От всей души, с любовью к Вам”, “Прекрасен мир любовью материнской!”, гадзіна паэзіі “Таланты родного города”, восеньскія пасядзелкі “Ваших лет золотые россыпи” і інш. На працягу года ў бібліятэцы працавалі клуб “Милосердие” і гурток гучнага чытання “Собеседник”. Для інвалідаў, якія працуюць на прадпрыемстве УП “Светоприбор” ОО “БелТИЗ” праводзіліся радыёгутаркі, радыёчасопісы, агляды новай літаратуры і чытанне агучанай літаратуры праз радыёвузел прадпрыемства.

У бібліятэцы працуе тыфлакуток, дзе інвалідам па зроку прадастаўляецца доступ да інфармацыйных рэсурсаў бібліятэкі з дапамогай камп’ютарных тэхналогій.

Бібліятэкі раёна праводзяць шматлікія цікавыя мерапрыемствы для інвалідаў па зроку ў рамках месячніка “Белая трость”.

Бібліятэкі Салігорскага раёна працуюць па рэалізацыі праектаў “Мы – вместе”, “Мир равных возможностей”; бібліятэкі Старадарожскага раёна – па праграме “Праз кнігу – да міласэрнасці”; Плешчаніцкая гарадская бібліятэка Лагойскага раёна – па праграме “Бібліятэка – за міласэрнасць“; Выгалавіцкая сельская бібліятэка-клуб Мядзельскага раёна другі год рэалізуе мэтавую праграму “Міласэрнасць (2015-2016)”, тут жа плённа працуе “Школа міласэрнасці”. Па праграме “Вера. Надзея. Любоў” дзейнічаюць бібліятэкі Слуцкага раёна, па праграме “Вы не адны , пакуль мы з вамі” – бібліятэкі Мінскага, Валожынскага раёнаў і інш.

У бібліятэках вобласці расце і пашыраецца дабрачынная і гуманітарная дзейнасць. Бібліятэкі ў межах дабрачынных акцый міласэрнасці штогод арганізоўваюць наведванні інвалідаў і пажылых людзей на даму, хатнія сустрэчы, віншаванні са святамі і днямі нараджэнняў, праводзяць месячнікі, дні добрых паслуг і інш.

Так, бібліятэкі Клецкага раёна арганізавалі акцыі “Не забыт трудовым коллективом” (цэнтральная раённая бібліятэка), “Пусть в вашем сердце молодость поет” (Галавацкая сельская

бібліятэка), “Цеплыню душы людзям”, “Возьму твою боль” (Сякерыцкая сельская бібліятэка); бібліятэкі Уздзенскага раёна правялі акцыі “С книгой радость входит в каждый дом” (Слабадская сельская бібліятэка-клуб), “Дом з кнігай – дом без адзіноты” (Нёманская сельская бібліятэка), “Дакраніся да мяне дабрынёй” (Хатлянская сельская бібліятэка); бібліятэкі Валожынскага раёна арганізавалі акцыі, урокі міласэрнасці “Спяшайцеся рабіць дабро” (Каменская сельская бібліятэка), “Ты не адзін у гэтым свеце” (Вішнеўская сельская бібліятэка), “Калі лёс іншых хвалюе нас” (Суднікаўская сельская бібліятэка) і інш.

Належная ўвага надаецца дабрачыннай і гуманітарнай дзейнасці ў бібліятэках Бярэзінскага раёна. Прыкладам таму наступныя акцыі: “Падзелімся тым, што маем”; “Мама – маме”; “Рука дапамогі земляку” і інш. (Брадзецкая сельская бібліятэка), “Цацка” (Багушэвіцкая сельская бібліятэка); агіт-акцыя ў працоўных калектывах і школах горада “Нас усіх на міласэрнасць праверыць старасць” (цэнтральная раённая бібліятэка); “Жыві, мая вёсачка” з цыклам “Пакуль памятаем – не знікнем” (святы маленькіх вёсак” – сельскія бібліятэкі). На базе цэнтральнай раённай бібліятэкі да святаў наладжваліся кірмашы дабрачыннасці і лаўкі бясплатных тавараў для малазабяспечаных адзінокіх састарэлых, інвалідаў і шматдзетных маці. Па арганізацыі вольнага часу людзей з фізічнымі абмежаваннямі бібліятэкі раёна працавалі ў рамках рэгіянальнай праграмы “Адрас міласэрнасці – бібліятэка”. Да Дня пажылых людзей у цэнтральнай раённай бібліятэцы прайшоў месячнік міласэрнасці “Мудрай старасці – паклон”. У бібліятэках экспанавалася перасоўная фотавыстава “Сонечныя бабулі бярэзінскіх аграгарадкоў” з гадзінамі цікавых паведамленняў “Узрост шчасцю не перашкода”. Да Дня настаўніка ў сельскіх бібліятэках прайшлі сустрэчы з настаўнікамі-пенсіянерамі “Школа – мая радасць і жыццё”. Вечар шчырасці “Нам года не беда” адбыўся у цэнтральнай раённай бібліятэцы. Ужо 10 гадоў школа аптымізму “Не выжываю – а жыву” (цэнтральная раённая бібліятэка) збірае

землякоў з фізічнымі абмежаваннямі, іх сваякоў і людзей сталага ўзросту на цёплыя, душэўныя спатканні.

Многія карыстальнікі ідуць у бібліятэку не толькі атрымаць пэўную інфармацыю ці новую кнігу, але і запоўніць свой вольны час. З мэтай аб'яднання блізкіх па ўзросту і захопленнях людзей і пераадолення іх адзіноты ў бібліятэках працуюць аматарскія аб'яднанні. Супрацоўнікі Смалявіцкай цэнтральнай раёнай бібліятэкі імя М.Багдановіча сумесна з прадпрыемствам БелТІЗ арганізавалі літаратурна-музычны клуб для інвалідаў "У свечи". У клубе прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя 70-годдзю Вялікай Перамогі, прымеркаваныя да Міжнароднага дня інвалідаў, літаратурныя вечарыны па творчасці І.Бродскага і У.Высоцкага "Поэзии забытые страницы», для інвалідаў па зроку. На пасяджэннях клуба "Нам года не беда" (Забалацкая сельская бібліятэка) адбыліся: вечар-віншаванне "Восень жыцця", інфармацыйная гадзіна "Всё в ней гармония, всё диво", "Сто парад на здароўе". Клуб "Отрада" (Сноўская сельская бібліятэка Нясвіжскага раёна) наладзіў вечар-успамін "Жаночыя гісторыі", калядныя і велікодныя пасяджэнні "Рождество в кругу друзей", "Праздник светлой Пасхи". На пасяджэннях клуба "Золотая осень" (Жодзінская цэнтральная гарадская бібліятэка) адбыліся мерапрыемствы "Старость меня дома не застанет", "И руки ваши золотые для нас шедевры создают". У Салігорскім раёне працуюць клубы "Ветеран" (гарадская-бібліятэка №2), "Земляки" (Ананчыцкая сельская інтэграваная бібліятэка), "Молодушки" (Доўгаўская сельская экалагічная бібліятэка) і інш. У Лагойскім раёне створаны літаб'яднанне "Рунь" (пры цэнтральнай раённай бібліятэцы), клуб "Сябрына" (пры Плешчаніцкай гарадской бібліятэцы).

У Пухавіцкім раёне праводзяцца цікавыя мерапрыемствы ў рамках клубаў "Чысты чацвер" (цэнтральная раённая бібліятэка), "Клуб цікавых сустрэч" (Мар'інагорская гарадская пасялковая бібліятэка), "Залаты ўзрост" (Свіслацкая гарадская пасялковая бібліятэка). У Старадарожскім раёне працуюць клубы "Дабрадзея" (Дражнікаўская сельская бібліятэка),

“Пасядзелкі” (цэнтральная раённая бібліятэка), “Золотая осень” (Каваліцкая сельская-бібліятэка клуб). У клубе “Задушэўная размова” (Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка) адбылася святочная імпрэза “Задушэўнай размове – 15”, гадзіна дэгустацыі “Будзь лоўкі на нарыхтоўкі” і інш.

У Слуцкім раёне працуюць клубы “Пяшчота” (Замосцкая сельская бібліятэка), “Дабрыня” (Селішчанская сельская бібліятэка); у Мінскім раёне – клубы “Дабрадзея” (цэнтральная раённая бібліятэка), “Русь” (Ждановіцкая сельская бібліятэка), “Залатая восень” (Лугаваслабадская сельская бібліятэка), “Ля самавара”( бібліятэка Мінскага РЦК).

Бібліятэчныя мерапрыемствы, адрасаваныя людзям з абмежаванымі магчымасцямі, скіраваны на шчырасць адносін, душэўнае разняволенне і станоўчыя эмоцыі, узаемадапамогу, нясуць ідэі аптымізму і гуманізму, духоўнай еднасці. Формы мерапрыемстваў розныя: святы, пасядзелкі, сеансы музыкі і кнігатэрапіі, гутаркі, агляды, сустрэчы з прадстаўнікамі сацыяльных службаў, медыцынскімі работнікамі. Практыкуецца правядзенне ўрокаў дабрыні, міласэрнасці, духоўнасці. Варта вылучыць сярод іх наступныя: літаратурна – музычная гасцёўня “Мы – молодые” (гарадская спецыялізаваная бібліятэка №18 г. Маладзечна сумесна з ОО БЕЛТИЗ), акцыя “Клопат” (збор кніг для псіханеўралагічнага дома-інтэрната г. Маладзечна, гарадская бібліятэка-філіял №1), свята “Для пожилого человека всегда важна библиотека” (сельская бібліятэка аграгарадка Лебедзева); вечар-віншаванне “По жизни с добротой и мудростью” (Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П.Труса); рэтрастужка “Пад ціхі шолах восеньскай лістоты” (Слуцкая цэнтральная раённая бібліятэка), агеньчык “З павагай да ўзросту і мудрасці” (Лучнікоўская сельская бібліятэка); агеньчык “Дзякуй табе, дарагая матуля” у рамках клуба “Аднавясковец” (Бучацінская сельская бібліятэка Слуцкага раёна); хатнія сустрэчы “Мы ў даўгу перад сваімі бацькамі” (Нарацкая сельская бібліятэка), “Дом без адзіноты” (Пузыроўская сельская бібліятэка-дом вольнага часу), “Сагрэем душы добрымі словамі”

(Свірская гарадская пасялковая бібліятэка Мядзельскага раёна); тэматычны вечар “Поделись теплом своей души”, гадзіна творчасці “Пасхальные сувениры своими руками” (Салігорская гарадская бібліятэка №2), “Душа по капле собирает свет” (Доўгаўская сельская экалагічная бібліятэка), літаратурна-музычны вечар “Старость меня дома не застанет” (Велічкоўская сельская бібліятэка Салігорскага раёна).

Бібліятэкі Крупскага і Чэрвеньскага раёнаў пастаянна праводзяць акцыі для інвалідаў па зроку “Белая трость”.

У рабоце з сацыяльна неабароненымі катэгорыямі насельніцтва вельмі важным момантам з’яўляецца кансалідацыя спецыялістаў зацікаўленых арганізацый, устаноў, ведамстваў, якія маюць дачыненне да праблем людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Гэта органы ўлады, службы сацыяльнай абароны, аховы здароўя, установы культуры, асветніцкія і дашкольныя арганізацыі , рэабілітацыйныя цэнтры, грамадскія аб’яднанні.

### *Сямейнае выхаванне*

Сям’я і дзеці – важнейшы аб’ект нацыянальна-дзяржаўных інтарэсаў, адзін з галоўных фактараў забяспечэння сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця краіны. Бібліятэка дапамагае бацькам і дзецям у вырашэнні праблем сямейнага выхавання, захавання сямейных традыцый, правядзення творчага і змястоўнага вольнага часу.

Бібліятэкары ў сваёй дзейнасці стараюцца ахапіць усе бакі жыцця сучаснага грамадства. У бібліятэках Вілейскай цэнтральнай бібліятэчнай сістэмы ладзяцца такія мерапрыемствы: “Дзеці – надзея бацькоў”, “Духоўнае выхаванне ў сям’і” (Любанская СБ), “Святы ручай кахання” – вечарына для закаханых (Партызанская СБ) і г.д.

У рамках святкавання Дня маці ў раённай дзіцячай бібліятэцы Нясвіжскай ЦБС прайшла акцыя “Поздравь маму с праздником” – 14 кастрычніка ўсе жадаючыя змаглі набыць паштоўку і напісаць віншаванне для сваёй матулі.

У аддзеле абслугоўвання Дзяржынскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы працаваў клуб сямейнага чытання “Тата, мама і я – чытаючая сям’я”, дзе былі праведзены такія мерапрыемствы, як гадзіна пяшчоты “Вось яна якая, мамачка мая”, фестываль сямейнай творчасці “Добрых рук цудоўнае стварэнне” і інш.

Чэрвеньская ЦБС таксама надае шмат увагі сямейнаму выхаванню. Дню маці і Дню сям’і прысвячаліся літаратурна-музычная кампазіцыя “Мама. Маці. Матуля” (ЦБ); вусны часопіс “В семейном кругу” (Смілавіцкая г/п бібліятэка); гадзіна інфармацыі “Семья – учимся быть мудрыми” (Грабёнская с/б).

Любанская ЦБД здзяйсняе праграму “Дзеці. Сям’я. Кніга”. Дзіцячая бібліятэка разам з супрацоўнікамі аддзела бібліятэчнага маркетынгу вітала сваіх юных чытачоў разам з іх бацькамі, дзядулямі і бабулямі тэатралізаванай праграмай “Рэзідэнцыя Дзеда Мароза запрашае”. У Любанскай РЦБ на працягу года афармляліся кніжныя выставы-віншаванні: выстава-парада лепшых кніг для мужчын “Чтоб стать мужчиной, мало им родиться”, парад кніг “Пра жанчын і не толькі”, выстава-настрой “Семья – время перемен, или Пора вечных ценностей”, выстава-падзяка “Паклон Вам, мілыя матулі”. Да гадавых свят рыхтаваліся паэтычныя віншаванні ў выглядзе буклетаў, кніжных закладак, паштовак.

Актыўна працавала Дзяржынская ЦБС. “Маміна кафэ” запрасіла ў Грычынскую с/б дзяцей, і іх матуль, і настаўнікаў. Сапраўдным гімнам кожнай маці прагучалі словы прызнання ў любві да іх з вуснаў дзяцей. Свята сям’і “Пусть не гаснет свет в окне” адбылося ў Энергетыкаўскай п/б. Мэтай мерапрыемства было – звярнуць увагу дзяцей і бацькоў на сэнс слова “сям’я”, зрабіць сумесныя вывады пра неацэнную каштоўнасць такой мадэлі існавання ў жыцці чалавека.

З мэтай папулярызацыі сямейных каштоўнасцяў у раённай цэнтральнай бібліятэцы г. Салігорска адбыўся круглы стол «Каханне дваіх – сям'і выток». Арганізатарам мерапрыемства стаў кіраўнік моладзевага праваслаўнага брацтва святых Пятра і Фяўронні Мурамскіх пры храме Нараджэння

Найсвяцейшай Багародзіцы Віктар Бровушкін. У ходзе мерапрыемства прайшоў псіхалагічны трэнінг «Сям'я і сямейныя каштоўнасці», падрыхтавана кніжная выстава «Сям'я – шчаслівыя разам!».

Работа бібліятэк з сям’ёй прадугледжвае далучэнне бацькоў і дзяцей да багацця бібліятэчных фондаў, павышэнне ўзроўню псіхолага-педагагічнай культуры бацькоў, аказанне ім дапамогі ў выхаванні дзяцей, арганізацыю вольнага часу сям’і. Дзейнасць у гэтым напрамку Клецкай СПБ вядзецца рознымі формамі і метадамі, але перавага аддаецца індывідуальнай рабоце з кожнай канкрэтнай сям’ёй. Умногіх бібліятэках працуе “сямейны абанемент”, актыўнымі чытачамі якога з’яўляюцца дарослыя і дзеці. Сістэматычна папаўняюцца новымі матэрыяламі тэматычныя картатэкі “Наш дом – наша сям’я”, тэматычныя папкі газетна-часопісных матэрыялаў “Для вас, бацькі”, дзе змяшчаюцца парады псіхолагаў, юрыстаў, медыцынскіх работнікаў. Яны аказваюць значную дапамогу ў выхаванні дзяцей і падлеткаў.

### ***Патрыятычнае выхаванне***

Развіццё краіны немагчыма без фарміравання пачуцця павагі да свайго краю. Важна, якім стане чалавек будучага, у якой меры ён засвоіць дзве сацыяльныя ролі – грамадзяніна і патрыёта.

Чэрвеньская ЦБС актыўна ўдзельнічала ў патрыятычным выхаванні моладзі. Так, да 70-годдзя Вялікай Перамогі былі прымеркаваны патрыятычны ўрок ”Маленькія салдаты вялікай вайны” і гістарычны экскурс “У камень апранутыя стагоддзі” (ДБ). На працягу года ў бібліятэцы афармляліся кніжныя паліцы, прагляды літаратуры, кніжныя выставы ваеннай тэматыкі, такія як: “Неугосимая память поколений”, “Страница военной истории”, “Оружие победы” і г.д.

Бібліятэкі Дзяржынскай ЦБС працягвалі творчую рэалізацыю краязнаўчага праекта “Ішоў мой край дарогамі вайны”. Ажыццяўлялася абнаўленне і папаўненне фактаграфічнай

дакументальнай базы дадзеных з фотаархівам “Мае землякі – удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны”. Для альманаха “Салдаты Перамогі” былі прадстаўлены звесткі аб 106-ці ветэранах і ўдзельніках Вялікай Айчыннай вайны, якія нарадзіліся або жылі на Дзяржыншчыне.

У 2015 годзе ў Бярэзінскай цэнтральнай раённай бібліятэцы працягваўся юбілейны праект “70-годдзю Перамогі – 70 патрыятычных спраў”. Скарбонка спраў праекта ўключае 30 акцый і 70 мерапрыемстваў ваенна-патрыятычнага характару, ініцыяваных ЦБ і рэалізаваных у творчай садружнасці з культурнымі і адукацыйнымі ўстановамі, грамадскімі маладзёжнымі і ветэранскімі арганізацыямі раёна.

У Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя П.Пранузы быў распрацаваны праект “Непокорённая Беларусь”, у рамках якога быў арганізаваны шэраг сустрэч з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, гадзіны патрыятызму, ток-шоў. Працягвае сваю дзйнасць клуб патрыятычнага выхавання для падлеткаў “Патрыёт”.

Бібліятэкамі Вілейскай ЦБС быў наладжаны шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных 70-годдзю Вялікай Перамогі: кніжныя выставы “Гэта быў час, які нельга забыць” (Партызанская с/б), “Прачытай кнігу аб вайне, стань бліжэй да подзвігу” (Вязынская с/б) і г.д.

У рамках праекта «Победа во имя живущих» ва ўсіх бібліятэках прайшлі акцыі “Ветераны живут рядом”, “И глаза молодых солдат с фотографии старой глядят”, фестываль ваеннай кнігі “Это наша Победа”, гістарычны рэпартаж “О тех, над кем склоняется Победа”. Бібліятэкары наведвалі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, арганізоўвалі з імі сустрэчы.

У бібліятэках Любанскага раёна былі праведзены наступныя мерапрыемствы: акцыя “Прачытаць пра вайну, каб памятаць” (Рачэнская с/б), прэзентацыя зборніка вершаў “На парозе вечнасці” (Камунараўская с/б), вечар-сустрэча “Наш ветэран” (Кузьміцкая с/б), патрыятычная гадзіна “Кніга Памяці расказвае” (Забалацкая с/б), патрыятычны аповед-рэквіем “Я был на той войне” (Соснаўская с/б, філіял №37), тыдзень

воінскай славы “Мы встречаем День Победы”(Сароцкая с/б), патрыятычная гадзіна “Малыя героі Вялікай вайны” (Рэдкавіцкая с/б) і інш.

Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка сумесна з рэдакцыяй раённай газеты “Да новых перамог” рэалізавала цікавы сумесны конкурсны праект “Напісана вайной – увекавечана літаратурай”. Удзел у ім бралі чытачы і бібліятэкары гарадскіх і сельскіх бібліятэк. Конкурс ставіў сваёй мэтай прыцягнуць увагу жыхароў Клеччыны да гісторыі роднай краіны пасродкам бібліятэчных фондаў ваенна-патрыятычнай тэматыкі, ваенна-гістарычнай літаратуры, заахвоціць прачытаць або перачытаць лепшыя творы аб Вялікай Айчыннай вайне. Кожны месяц на хвалях радыёэфіра “Веснік Клеччыны” гучалі выступленні ўдзельнікаў конкурсу ў трох узроставых катэгорыях. Для падвядзення вынікаў конкурсу было вызначана журы, у склад якога ўвайшлі галоўны рэдактар ДУ Рэдакцыя газеты “Да новых перамог”, вядучы радыёпраграмы “Веснік Клеччыны”, супрацоўнікі аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі.

Да Дня Перамогі ў чытальнай зале Жодзінскай раённай бібліятэкі была арганізавана выстава «Сирень Победы. Коллекция сортов сирени и книг, посвящённых Великой Победе и героям войны». У цэнтры выставы памясцілі вазу з букетам бэзу, на інфармацыйных паліцах – фотаздымкамі з апісаннем гатункаў бэзу, прозвішчам селекцыянера, фота героя ВАВ, звесткі аб ім, а таксама кнігі, прысвечаныя героям і ваенным падзеям.

З мэтай папулярызацыі бібліятэчных фондаў, прысвечаных гераічнаму мінуламу краіны, ў бібліятэках Мінскага раёна былі аформлены выставы: “І зноў гартаюцца ваеныя старонкі” (Ждановіцкая с/б), “Ад пачатку вайны, да перамогі” (Хацежынская с/б), “Памяць мінулай вайны” (Ратамская с/б), “2015 год – год ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны”, “Творцы Перамогі” (б-ка ДУ “Мінскага РЦК”), «Великую Победу в сорок пятом будет вечно помнить вся земля» (Заслаўская г/б), “Ад пачатку вайны – да парада

Перамогі” ( Заслаўская дг/б), “Пісьменнікі беларусі аб вайне” (Сеніцкая с/б), “Книги опалённые войной” (Самахвалавіцкая с/б), “Вайна ў лёсе людзей” (Крупіцкая с/б-музей).

### *Эстэтычнае выхаванне*

Эстэтычнае выхаванне, далучэнне людзей да скарбніцы сусветнай культуры і мастацтва – найважнейшыя складнікі фарміравання цэласнай асобы, творча развітай індывідуальнасці. Таму адным з вядучых кірункаў дзейнасці бібліятэк з’яўляецца living рознабаковае эстэтычнае і інтэлектуальнае развіццё асобы.

У Дзяржынскай ЦБС працягвалася рэалізацыя праекта “Тэрыторыя творчасці”, які дае магчымасць кожнаму, хто валодае пэўнымі здольнасцямі, праявіць сябе ў творчасці. “Душа і рукі ствараюць шэдэўры” – такую назву мела выстава карцін і вышыванак крыжыкам, наладжаная бібліятэкай.

У 2015 годзе чытачы Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя П. Пранузы мелі магчымасць пазнаёміцца з габеленамі вядомай беларускай мастачкі, сябра Саюза мастакоў Беларусі Галіны Крываблоцкай; жывапісам кандыдата фізіка-матэматычных навук Валянціны Ранцевіч, акварэямі і пастэллю сябра Саюза мастакоў і Саюза дызайнераў Беларусі Генадзя Чыстага.

Валожынская ЦРБ на працягу года ладзіла кніжныя выставы “Музыка, застылая ў камяні” (да Сусветнага дня архітэктуры), “Каханне ў жыцці і творчасці А. Блока” (да 135-годдзя з дня нараджэння), “Стэфанія Станюта – сонечная душа” (да 110-годдзя народнай артысткі Беларусі), “Іншага веку грамадзянін” (да 220-годдзя А.Грыбаедава), працавала бібліятэчная карцінная галерэя, дзе дэманстраваліся карціны мясцовых і беларускіх мастакоў: В.Янкілевіча, В. і В. Ярэськаў і інш.

Пры зале мастацтва Маладзечанскай цэнтральнай раённай бібліятэкі працаваў клуб “Гасцёўня сямі муз”. Прайшлі вечарыны, прысвечаныя 205-годдзю Івана Фаміча Хруцкага – “Дзівосны пэндзаль акадэміка Хруцкага” і 250-годдзю з дня

нараджэння Міхаіла Клеафаса Агінскага “Чароўна гучаў паланэз” інш. Цікавымі і карыснымі для наведвальнікаў былі ўрок эстэтыкі “Пагаворым пра прыгажосць і густ ” (сельская бібліятэка в. Краснае), віражы эстэтыкі “Промні асветніцтва” (сельская бібліятэка-клуб в. Вязынка), гутарка-практыкум “Заўсёды заставацца прыгожай” (сельская бібліятэка аграгарадка Гарадок), пазнавальны прагляд “Мода, стыль і прыгажосць”(сельская бібліятэка пасёлка Чысць) і інш.

Жодзінская ЦБС на працягу года шмат увагі надавала актывізацыі чытання на роднай мове. Арганізоўваліся кніжныя выставы, сустрэчы з пісьменнікамі, буккросінг «Чытаем кнігі пра Беларусь» (ЦГБ), літаратурны вернісаж «Сугучча сэрцаў, народжанае словам» (ЦГБ), выстава-паралель з аглядам «Мая беларуская кніга» (ЦГБ), выстава-рэпартаж з аглядам «Лаўрэаты першай Нацыянальнай літаратурнай прэміі» (ЦГБ). Афармляліся выставы да юбілеяў беларускіх класікаў.

У Любанскай ЦБС да Тыдня беларускага пісьменства і друку бібліятэкі падрыхтавалі фальклорнае свята “Жывая вада бацькоўскіх крыніц” (РЦБ), інфармацыйную гадзіну “Дзень беларускага пісьменства і друку” (Рачэнская с/б), дзень беларускай мовы “Беларус, роднай мовы сваёй не цурайся!” (Стараюрковіцкая с/б), гучныя чытанні “Чытаем кнігі на роднай мове” (Загальская с/б), кніжныя выставы “Дзень Кірылы і Мефодзія” (Палічынская с/б), “Нам кніжку падарыў Францыск Скарына” (Обчынская с/б), “Беларускія першадрукары” (Арлёўская с/б).

Дню беларускага пісьменства прысвяцілі «Свята трыумфу кнігі» ў раённай цэнтральнай бібліятэцы г. Салігорска. Да мерапрыемства была падрыхтавана мультымедыйная прэзентацыя пра беларускіх асветнікаў – Францыска Скарыну, Сымона Буднага, Еўфрасінню Полацкую, Міколу Гусоўскага. У рамках літаратурнага кафэ «Час пік» адбылася сустрэча «Вершы, як музыка душы!» з членам паэтычнага аб'яднання "Лабірынт" Нінай Сямёнавіч, аўтарам зборніка «Чаромхавая завіруха».У Заслаўскай ГДБ адбылася сустрэча з пісьменніцай-зямлячкай, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі С.А.Быкавай і

прэзентацыя яе кнігі «Аб чым маўчаць уцёсы». Гэта казачныя гісторыі для дарослых і дзяцей старэйшага школьнага ўзросту. На сустрэчы прысутнічала мастачка, выкладчыца Заслаўскай школы мастацтваў Тукач Алена Анатольеўна, якая зрабіла мастацкае афармленне выдання.

Юбілейная дата бярэзінскай СШ №3 стала нагодай для правядзення акцыі "Школа пад кніжным ветразем", якую ў кастрычніку наладзілі супрацоўнікі Бярэзінскай раённай бібліятэкі ў творчай садружнасці з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры. Знаны сярод школьнай моладзі тэатр "Жывая кніга" пры Бярэзінскай раённай бібліятэцы прапанаваў старшакласнікам "літаратурныя шэдэўрыкі" – творы кароткага жанру сучасных беларускіх аўтараў. Ажылі старонкі апавядання А. Бадака з інтрыгуючай назвай "Адзінокі васьмікласнік жадае пазнаёміцца".

## *Духоўна-маральнае выхаванне*

Бібліятэкі Жодзінскай ЦБС маюць сталыя кантакты з прыходамі Смалявіцкага благачыння па праграме «Супрацоўніцтва паміж Рэспублікай Беларусь і Беларускай Праваслаўнай Царквой». Бібліятэка супрацоўнічае з гарадскім адукацыйным аб'яднаннем «Вытокі» (духоўна-маральнае выхаванне дашкольнікаў і школьнікаў на праваслаўных традыцыях беларускага народа), якое аб'ядноўвае кіраўнікоў сацыяльнага прытулку, сацыяльнага сямейнага цэнтра, дзіцячага дома, настаўнікаў агульнаадукацыйных і нядзельных школ, выхавацеляў дашкольных устаноў, бібліятэкараў. Супрацоўнікі бібліятэкі выступаюць на пасяджэннях аб'яднання з аглядамі, здзяйсняюць інфармацыйнае забеспячэнне мерапрыемстваў.

У цэнтральнай гарадской бібліятэцы на абанеменце працуе пад дэвізам «Для тых, хто жывы не толькі хлебам ...» духоўны цэнтр «Духоўная прастора» з фондам праваслаўнай літаратуры. Інфармацыйны цэнтр «Вечныя ісціны» (ДБ) рэгулярна папаўняецца новымі экзэмплярамі.

У горадзе Вілейка і раёне прайшоў Тыдзень праваслаўнай кнігі. На мерапрыемствах прысутнічалі прадстаўнікі розных

узроставых катэгорый і прафесій: бібліятэкары, святары, краязнаўцы, ветэраны працы, вучні старэйшых класаў. Бібліятэкары падрыхтавалі для жыхароў вёсак Людвінова і Даўгінава прэзентацыю Слуцкага Святога Евангелля, кніжную выставу “Православие – путь к сердцу”. На працягу года ў бібліятэках дзейнічалі кніжна-ілюстраваныя выставы “Духоўнае святло чалавека”(р/б), “Святло праваслаўнай кнігі”(Нарачанская с/б), “Дарога да Бога” (Вязынскаяс/б ), “Дарога да храма – дарога з дарог” (Даўгінаўская с/б); агляд кніг, выдадзенных Беларускім Экзархатам “Чтобы в море книжном разобраться, дай, Бог, читателю ума” (р/б, Нарочанская с/б) і нш.

Цікава і павучальна прайшла для вучняў малодшых класаў сустрэча з настаяцелем храма Пакровы Найсвяцейшай Багародзіцы святаром Андрэем Гладкім на тэму: “Православная книга – путь к духовности”, якую арганізавала Клецкая ДБ. Айцец Андрэй пазнаёміў дзяцей з кнігамі, выдадзенымі у XVIII стагоддзі, з цікавымі фактамі гісторыі стварэння кнігі. У гонар свята праваслаўнай кнігі ў бібліятэцы прайшоў Дзень праваслаўнай кнігі. Была арганізавана кніжная выстава “Духовных книг божественная мудрость”, праводзіліся гутаркі, агляды кніг. Для вучняў старэйшых класаў клірык храма Уваскрэсення Хрыстова Генадзь Белавус правёў гутарку-ўспамін “Вялікая Перамога – адзіная памяць”.

У Маладзечанскай СПБ пры сельскай бібліятэцы в. Турэц-Баяры працуе школа духоўнасці “Крынічанька” для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту. Дапамагае ў арганізацыі заняткаў школы святар царквы Святога Благавернага князя Аляксандра Неўскага, айцец Мікалай, які расказвае пра праваслаўныя святы, значэнне веры ў жыцці чалавека, адказвае на пытанні. У мінулым годзе на Каляды дзеці выступалі з віншаваннем ў царкве. На Вялікдзень чыталі вершы, паказалі спектакль “Чырвоны капялюшык на новы лад”, спявалі песні. Прайшлі інфармацыйныя гадзіны: “Православная книга – путь к познанию Божьего мира”, “Добро и зло – причины наших поступков”, “Богатство человека – друзья” і іншыя.

Работу ў аспекце маральна-духоўнага выхавання бібліятэкі Валожынскай СПБ каардынуюць з зацікаўленымі арганізацыямі, і найперш са святарамі розных рэлігійных канфесій. З іх дапамогай збіраюцца матэрыялы па гісторыі мясцовых помнікаў культавага дойлідства – цэркваў, касцёлаў, капліц. Папаўняецца новымі матэрыяламі зборнік “Дарога да святыняў”. У справаздачным годзе выпушчаны наступныя буклеты: ”310 год касцёлу і кляштару францысканцаў у Івянцы”, “Сымон Будны” – да 485-годдзя з дня нараджэння. Пры бібліятэцы ў Івянецкай гарпасялковай бібліятэцы.дзейнічае маральна-духоўны інфармацыйны цэнтр “Дарога да храма”, клуб па інтарэсах “Існасць”, у рамках якога ў справаздачным годзе адбыліся пасяджэнні: “Каляднае свята” – музычна-драматычная кампазіцыя, “Залатавуст з Турава” – дзень праваслаўнай кнігі да 885-годдзя К.Тураўскага, “Евангелле напрыстольнае” – да 440-годдзя з часу выдання, “Праваслаўныя святыя зямлі беларускай” – прэзентацыя кнігі, “О, цудоўны новы свет, або Цывілізацыя без асобы” – гадзіна існасці.

Амаль дванаццаць гадоў пры Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэцы дзейнічае клуб духоўна-маральнага выхавання падлеткаў і моладзі “Ноеў каўчэг”, які наведваюць каля пяцідзесяці чалавек. Клуб уваходзіць у склад духоўна-асветніцкага  цэнтра “Існасць”, які ў амустудзені 2015 года адзначыў сваё пяцігоддзе. Праваслаўныя лекторыі, а затым і нядзельная школа, школа праваслаўнага выхавання для дарослых, якія штотыднёва праходзяць з удзелам святароў Нясвіжскага благачыння ў канферэнц-зале бібліятэкі пачалі карыстацца папулярнасцю сярод насельніцтва раёна.

У рамках месячніка праваслаўнай кнігі ў Дзяржынскай ЦРБ прайшла гадзіна духоўнай шчырасці “Что есть любовь?” з дыскусіяй па пытаннях: “Што такое закаханасць?”, “Ці існуе сапраўднае каханне”, “Як адрозніць закаханасць ад кахання?” У рамках мерапрыемства дэманстраваўся мастацкі фільм-прытча “И через тысячу лет”, які нікога не пакінуў абыякавым і выклікаў эмацыянальнае ўзрушэнне ў моладзі, дазволіў ім асэнсаваць духоўную чысціню і глыбіню сапраўднага кахання.

На мерапрыемстве прысутнічаў святар Свята-Пакроўскай царквы г. Дзяржынска іерэй Павел (Сенкевіч). Ён расказаў аб першадрукары Іване Фёдараве. Вялікую цікавасць выклікала ў моладзі царкоўнае выданне 1894 года “ТРІОДЬ ЦВѢТНАЯ”, па якім і сёння вядзецца царкоўная служба. Дзяржынская цэнтральная раённая бібліятэка прыняла ўдзел у І Рэспубліканскім конкурсе «Библиотека – центр духовно-нравственного просвещения и воспитания», аб’яўленым Беларускім Экзархатам і Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі. На суд журы прадставілі работы па гісторыі праваслаўя Дзяржыншчыны: папкі-дасье, прысвечаныя Святой Блажэннай Валянціне Мінскай, былому настаяцелю дзяржынскага Свята-Пакроўскага храма мітрафорнаму протаіерэю Мікалаю Ледніку, гісторыі Свята-Праабражэнскай Вітаўскай царквы і Вітаўскай цудатворнай крыніцы; бібліяграфічныя спісы “Праваслаўныя храмы Дзяржыншчыны” (інфармацыя аб дзеючых храмах і тых, якія не захаваліся па розных прычынах, якія яшчэ будуюцца ці толькі зарэгістраваны), “Подвижница благочестия. Святая Блаженная Валентина Минская”, “Сокровища духовной мудрости” (выданні XIX стагоддзя, перададзеныя ў фонд бібліятэкі Свята-Пакроўскім храмам); віртуальнае духоўнае падарожжа “Православные святыни Дзержинщины”.

У цэнтральнай раённай бібліятэцы г.Салігорска ў рамках інфармацыйна-асветніцкага праекта «Бібліятэка. Праваслаўе. Духоўнасць» і дыскусійнага клуба «Праваслаўе і сучасны свет» праходзілі сустрэчы са святарамі, праводзіліся духоўныя гутаркі, гадзіны праваслаўя, маральнасці, праваслаўныя сустрэчы.

## Краязнаўчая работа

У справаздачным годзе краязнаўства заставалася адным з прыярытэтных напрамкаў работы бібліятэк Мінскай вобласці. Інфармацыйныя магчымасці бібліятэк дазваляюць сёння забяспечыць шырокі спектр краязнаўчай дзейнасці, якая ўключае масавую работу, прэзентацыю кніг, арганізацыю

экскурсій, выстаў, музейную дзейнасць, захаванне дакументаў “жывой гісторыі” шляхам збору ўспамінаў, фотаздымкаў, экспанатаў пры непасрэдным удзеле чытачоў.

Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк вобласці вялася ў 2015г. у адпаведнасці з рэгіянальнымі і мясцовымі праграмамі “Зямля бацькоў – майго жыцця крыніца” (Клецкі раён), “І для мяне не было б Беларусі без маленькай Радзімы маёй” (Капыльскі раён), “Мая зямля, мае землякі” (Дзяржынскі раён) і інш. Акрамя таго, бібліятэкі распрацавалі разнастайныя краязнаўчыя праекты: грамадска-культурны “Святло знаёмай зоркі” на 2008-2016 гг. (Бярэзінскі раён); “Дзяржыншчына літаратурная”, “Ішоў мой край дарогамі вайны”, “Імя ў гісторыі раёна”, “Датуль завёмся мы народам, пакуль шануем карані”, “Зямля, дзе пачаўся мой лёс: мае землякі ў гісторыі раёна і краіны” (Дзяржынскі раён); духоўна-краязнаўчы “Слуцк – валошка ў вянку Беларусі” (Слуцкі раён) і інш.

У 2015 г. ва ўсіх бібліятэках вобласці адзначаліся наступныя падзеі:

- 70-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне (праходзілі кніжныя выставы, дні памяці, электронныя прэзентацыі, акцыя “Прачытай кнігу аб вайне”, цыкл радыёперадач “Бібліятэкары – удзельнікі Вялікай Айчыннай” (Маладзечанскі раён), вечары з цыкла “Партрэт земляка на фоне вайны” ў Бярэзінскай ЦРБ і інш.);
- Дзень беларускага пісьменства (ладзіліся кніжныя выставы, літаратурныя мазаікі, вусныя часопісы, інфармацыйныя гадзіны);
- Міжнародны дзень роднай мовы (выставы, вечарыны, інфармацыйныя хвіліны, брэйн-рынгі, віктарыны, гадзіны беларусазнаўства, паэтычныя гадзіны).

На працягу года ў бібліятэках арганізоўваліся краязнаўчыя выставы, папаўняліся тэматычныя папкі, складаліся летапісы вёсак, праходзілі літаратурна-музычныя вечарыны, краязнаўчыя гадзіны і падарожжы, сустрэчы з землякамі – ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны. Бібліятэкі вобласці прымалі актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні

святаў вёсак. Значную пошукавую работу вялі краязнаўчыя клубы Клецкай ЦБС: літаратурна-этнаграфічны клуб "Нашчадкі" (Галынкаўская с/б), літаратурна-краязнаўчыя клубы "Спадчына" (Сіняўская і Кухчыцкая с/б) і "Родны край" (Янавіцкая с/б). Пасяджэнні клубаў прысвячаліся самай рознай тэматыцы, формы работы былі таксама разнастайнымі: дні краязнаўства, краязнаўча-літаратурныя падарожжы, тэматычныя вечары, гадзіны, урокі. Працягвалі сваю дзейнасць клуб "Спадчына" (Нясвіжская ЦРБ), краязнаўчыя гурткі Салігорскай ЦБС, краязнаўчы клуб "Крыніца" пры Старадарожскай ЦРБ і іншыя аб'яднанні.

2015 год быў юбілейным для некаторых раёнаў і гарадоў Мінскай вобласці. 615-годдзе. Валожына і 75-годдзе ўтварэння Валожынскага раёна бібліятэкі сістэмы адзначылі мерапрыемствамі, якія можна аб'яднаць пагульнай назвай – "Валожынскі край: ад мінулага да сучаснага". Круглы стол "Валожыншчына: учора, сёння, заўтра" ў раённай бібліятэцы сабраў прадстаўнікоў розных пакаленняў, а таксама членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтаў-зямлякоў М.Шакуна, М.Курылу. У рамках святкавання юбілею раёна Ракаўская с/б стала актыўным удзельнікам і арганізатарам свята сваёй вёскі "Мы маем гонар свой, мы маем Ракаў", у праграме якога асаблівае месца мела п'еса, у якой паказана жыццё ракаўчан ад рэвалюцыі і да нашых дзён, Гасцямі свята сталі знакамітыя людзі краю: прафесар БДУ, пісьменнік В.Рагойша, браты Янушкевічы і многія іншыя.

З нагоды 1030-годдзя заснавання Заслаўя Мінская ЦРБ адзначылася web-вандроўкай "Город чудный – город древний" і мерапрыемствам "Здесь воздух на истории настоян", падчас якіх моладзь праз удзел у інтэрактыўных віктарынах, гульнях пазнаёмілася з гісторыяй і сучаснасцю горада Заслаўе.

З нагоды 75-годдзя Нясвіжскага раёна ЦРБ арганізавала гарадскі краязнаўчы рынг "Я люблю мой Нясвіж". У бібліятэках Салігоршчыны прайшоў шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных 50-годдзю ўтварэння раёна: тыдзень краязнаўчай перыёдыкі "Падарожжа па роднай краіне", экскурс у гісторыю "Мая

Салігоршчына", краязнаўчая віктарына "Паклон табе, зямля бацькоў" і інш.

Барысаўская ЦРБ прыняла ўдзел у міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Историческая память и опыт мемориализации событий Великой Отечественной войны в Беларуси и зарубежных странах" – супрацоўнік бібліятэкі выступіў з дакладам "Пребывание Константина Симонова в городе Борисове в июне 1941 года". У цэнтральнай раённай бібліятэцы складаецца кніга ўспамінаў землякоў "Вайна маю памяць дагэтуль катуе", якая ў справаздачным годзе папоўнілася 20 ўспамінамі дзяцей вайны – жыхароў Беразіно. На сённяшні дзень кніга ўтрымлівае больш за сто ўспамінаў і складаецца з васьмі тэматычных раздзелаў. Падборка найбольш уражваючых успамінаў і архіўных фотадакументаў была прадстаўлена аўтарам праекта на старонках "Беларускага гістарычнага часопіса" № 4 за 2015 г.

Дзяржынская ЦРБ працягвала рэалізацыю краязнаўчага праекта "Ішоў мой край дарогамі вайны", у рамках якога ажыццяўлялася абнаўленне і папаўненне фактаграфічнай дакументальнай базы дадзеных з фотаархівам "Мае землякі – удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны". Для альманаха "Салдаты Перамогі" былі прадстаўлены звесткі аб 106 ветэранах і ўдзельніках Вялікай Айчыннай вайны, якія нарадзіліся або жылі на Дзяржыншчыне. Па матэрыялах альманаха была складзена кніга "Солдаты Победы. Дзержинский район", якая выйшла ў выдавецтве "Беларускі дом друку".

Коласаўская с/б сумесна з Крупскай ЦРБ распрацавала праект "Вяртаюцца да нас салдат імёны", накіраваны на пошук родных тых салдат, якія загінулі ў час вайны і пахаваныя ў в. Замкі Крупскага раёна.

Валожыншчына ў чарговы раз стала месцам правядзення святочных мерапрыемстваў, прысвечаных 145-годдзю з дня нараджэння мастака з сусветным імем – Фердынанда Рушчыца. Валожынская ЦРБ арганізавала выставу "Жывапісец, графік, педагог", агляд творчасці знакамітага земляка. На працягу ўсяго года ў ЦРБ дзейнічала выстава "Рушчыц: жыццё і творчасць".

Бібліятэку наведвалі ўдзельнікі міжнароднага пленэра, прысвечанага юбілею мастака. У свяце прынялі ўдзел супрацоўнікі раённай адміністрацыі, прадстаўнікі дыпламатычнага корпусу Літвы, Польшчы, дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі У. Пракапцоў і яго калега з Літвы, прадстаўнікі Інстытута Польшчы ў Мінску, дэлегацыя Вільнюскага раёна, іншыя афіцыйныя асобы і мясцовыя жыхары. Адкрываў свята паэт Віктар Шніп радкамі сваёй паэмы “Балада Фердынанда Рушчыца”.

У рамках праекта “Родным краем ганаруся” Капыльскай ЦБС ушаноўвалася памяць землякоў Мікалая Гурскага, Кузьмы Чорнага, Яна Скрыгана. Песачанская с/б арганізавала пазнавальную гадзіну “Мовазнавец са Свінкі” да 110-годдзя М.І.Гурскага, кніжную паліцу “Сэрца, у якім месціцца цэлы свет” – да 115-годдзя з дня нараджэння Кузьмы Чорнага.

Маладзечанская ЦРБ у 2015 г. сумесна з мясцовым радыё рэалізоўвала праект “Мой родны кут”, які даследуе гісторыю вёсак Маладзечаншчыны. Краязнаўца Міхась Казлоўскі прэзентаваў сваю кнігу “Язэп Драздовіч. Праз церні да зорак”. Бібліятэка ўдзельнічала ў арганізацыі правядзення XIV Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі “Маладзечна-2015”, свята паэзіі, песні і народных рамёстваў “З адною думкаю аб шчасці Беларусі” ў Купалаўскім мемарыяльным запаведніку “Вязынка”, штогадовага рэспубліканскага свята “Ракуцёўскае лета” на базе філіяла Літаратурнага музея М.Багдановіча “Фальварак “Ракуцёўшчына”, а таксама брала ўдзел у ІІ Міжнародным форуме “Гарадок і яго яўрэйская гісторыя: мінулае і сучаснасць”, які праходзіў у в. Гарадок Маладзечанскага раёна.

Пры Лагойскай ЦРБ дзейнічае радыёўніверсітэт “Імі ганарыцца Лагойшчына”, на хвалях якога прагучалі гутаркі: “Натхняючы асабістым прыкладам: да 95-годдзя з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза П.М.Бахарава”, “Яго самыя чыстыя колеры: да 75-годдзя з дня нараджэння мастака-кераміста С.Р.Саўрыцкага” і інш.

У рамках акцыі “Вяртанне Ваньковіча на радзіму” бібліятэкі Бярэзінскага раёна ладзілі месячнік славы “Гонар зямлі Бярэзінскай”. Бярэзінская ЦРБ арганізавала вечарыны “Вядомыя і знакамітыя”, “За гонар маем лічыць земляком” да 215-годдзя слыннага земляка, партрэтыста Валенція Ваньковіча. У юбілейных мерапрыемствах на Бярэзіншчыне прыняла ўдзел прадстаўнічая творчая дэлегацыя са сталіцы на чале з дырэктарам Нацыянальнага музея РБ У.Пракапцовым і дырэктарам музея “Дом Ваньковічаў” С.Вечарам.

Бярэзінская ЦРБ падрыхтавала таксама тэатр маналогу “Граф Патоцкі заслаў сватоў, а мне ўсяго 14 гадоў” з цыкла “Гісторыя горада ў жаночых асобах” паводле мемуараў бярэзінскай графіні Г.Патоцкай-Вансовіч.

Бібліятэкары Вілейскай ЦРБ распрацавалі выставу-прызнанне “Іван Кандрацьеў у сузор’і імён”, якая дэманстравалася ў вёсцы Каловічы на адкрыцці памятнай дошкі гісторыку, краязнаўцу, паэту-песенніку, пісьменніку, перакладчыку Івану Кандрацьеву.

У практыку работы бібліятэк увайшла такая новая форма работы, як правядзенне краязнаўчых квестаў. Квест “Маладзечанскім гасцінцам” прысвячаўся цікавым мясцінам горада. Удзельнікі каманд шукалі сучасныя і страчаныя помнікі ў гарадскім парку і на вуліцах горада, з дапамогай карты знаёміліся з гарадскімі адметнасцямі, паступова разблытвалі своеасаблівы краязнаўчы клубок. А Уздзенская ЦРБ сумесна з раённай газетай арганізавала краязнаўчы квест і фотаконкурс “Калі хочаш родны край спазнаць”.

Бібліятэкі Мінскай вобласці ў 2015 г. не спынялі пошукавай дзейнасці. Новымі матэрыяламі папоўніліся краязнаўча-экалагічныя маршруты Івянецкай гарпасялковай, Ракаўскай, Сакаўшчынскай с/б, Валожынскай ЦБС. Вынікам пошукавай дзейнасці супрацоўнікаў Барысаўскай ЦРБ імя Каладзеева ў рамках акцый “Прикоснись сердцем к подвигу” і “Найти героя” ўстаноўлены ваенныя лёсы 49 чалавек і два фільмы, знятыя тэлекампаніяй “Свет-ТВ”.

Працягам штогадовых акцый Бярэзінскай ЦБС “Каб любіць раён, трэба яго ведаць” сталі краязнаўча-пошукавыя экспедыцыі: “У вёску – па спадчыну”, “Побач са знакамітасцю”, “Сведкі вайны сярод нас”, “Тут калісьці вёсачка была”.У выніку назапашаны матэрыялы пра вядомых землякоў, запісаны ўспаміны жыхароў знікаючых вёсачак, выпускнікоў зачыненых школ, сабраны архіўныя фотадакументы ўдзельнікаў II рэспубліканскага злёту стаханаўцаў 1938 г., устаноўлены імёны закатаваных фашысцкімі карнікамі і пахаваных у брацкай магіле жыхароў в. Дулебы.

У Дзяржынскай ЦРБ прайшлі IV Койданаўскія чытанні “Каб неба мірнае – навек”, якія былі прысвечаны 70-годдзю Вялікай Перамогі. Адным з галоўных і кранальных момантаў мерапрыемства з’явілася выступленне былой партызанкі Вікторыі Мірановіч, якая падзялілася ўспамінамі пра сваё ваеннае мінулае.

Вынікі пошукавай дзейнасці бібліятэк прадстаўляліся на канферэнцыях і конкурсах. Супрацоўнікі Капыльскай ЦРБ імя Астрэйкі ўдзельнічалі ў навукова-практычнай канферэнцыі Інстытута гісторыі НАН Беларусі і БДПУ імя М.Танка “Беларусь, Капыльшчына і Эдвард Вайніловіч”. Некалькі бібліятэк Мінскай вобласці прынялі ўдзел у XXIII рэспубліканскім конкурсе “Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры”. Крупіцкая с/б Мінскага раёна атрымала заахвочвальную прэмію конкурса за даследаванне гісторыі вёскі Анопаль. Краязнаўчы праект Дзяржынскай ЦРБ “Ішоў наш край дарогамі вайны” заняў першае месца ў намінацыі “За пошукавую і даследчую працу”. Салігорская ЦРБ прадставіла на конкурс матэрыял “Душой создавая судьбу”, прысвечаны 95-годдзю з дня нараджэння народнай артысткі СССР Г.К.Макаравай, ураджэнкі г. п. Старобін.

Мядзельская ЦРБ імя М.Танка прыняла ўдзел у I рэспубліканскім конкурсе “Библиотека – центр духовно-нравственного просвещения и воспитания”. На конкурс была прадстаўлена работа “История православия на Мядельщине”. Для рэспубліканскага конкурса “Я родным краем ганаруся”

Стаўбцоўская ЦБС распрацавала праект “Каляндарная абраднасць майго краю, або Як у Старасвержанскай бібліятэцы “ката пяклі”.

Пры рэалізацыі праекта “Библиотека – центр историко-культурного туризма” супрацоўнікі краязнаўчага цэнтра Барысаўскай ЦРБ правялі 30 экскурсій па мясцінах баёў вайны 1812 г. Працягваў сваю дзейнасць краязнаўчы лекторый “Борисов. Место в истории”.

Міншчына – калыска многіх выдатных беларускіх пісьменнікаў. Бібліятэкі вобласці заўсёды аддаюць належную ўвагу вывучэнюю літаратурнай спадчыны, прапагандзе беларускага слова, творчасці сучасных аўтараў.

55-годдзю В.Шніпа Івянецкая гарпасялковая бібліятэка прысвяціла літаратурны партрэт “Ты жывеш, паэт, сярод людзей”, які ўключаў выставу кніг “Проза і паэзія агню”, агляд творчага шляху, экскурс па зборніках пісьменніка. На радзіме паэта, у в. Пугачы, сельская бібліятэка сабрала шмат аднавяскоўцаў на прэзентацыю кнігі “Пугачоўскі цырульнік” і дыялог з В.Шніпам і Л.Рублеўскай “Сто пытанняў дарасламу”.

Бібліятэкі Капыльшчыны адзначылі 110-годдзе з дня нараджэння Яна Скрыгана шэрагам мерапрыемстваў “Ювелір мастацкага слова”. Была арганізавана выстава-партрэт па творчасці пісьменніка, слайд-прэзентацыя “Ян Скрыган”, праведзена літаратурная гадзіна “Кругі жыцця Яна Скрыгана”. Дачка пісьменніка падарыла ЦРБ некалькі кніг пра свайго бацьку.

У Маладзечанскай ЦРБ прайшла навукова-краязнаўчая канферэнцыя “Не наракаю на цябе, мой лёс…”, прысвечаная 70-годдзю з дня нараджэння пісьменніка і вучонага Рыгора Семашкевіча. У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел галоўны рэдактар выдавецтва “Мастацкая літарартура” В.Шніп, сцэнарыст-рэжысёр Нацыянальнай кінастудыі “Беларусьфільм”, У.Мароз, пісьменнікі М.Дукса, Л.Гардынец, Л.Сільнова, а таксама члены сям’і Рыгора Семашкевіча.

Бярэзінская ЦРБ арганізавала тыдзень літаратурнага краязнаўства “Вялікая! літаратура з правінцыяльнай прапіскай”,

у рамках якога ў вясковых бібліятэках прайшлі юбілейныя мерапрыемствы “Бярэзінскі Прышвін” да 85-годдзя з дня нараджэння Р.Ігнаценкі, “Кароль фэнтазі і правінцыйных казак” да 40-годдзя з дня нараджэння пісьменніка-журналіста А.Бычкоўскага, вечарына “Вядомы пісьменнік жыве сярод нас”, прысвечаная ўладальніку літаратурнай прэміі “Залаты Купідон” Я.Хвалею.

У Дзяржынску працягвалася рэалізацыя краязнаўчага праекта “Імя ў гісторыі раёна”, рамках якога арганізаваны цыкл літаратурных знаёмстваў з творчасцю пісьменнікаў-землякоў “Квадры жыцця Івана Калесніка”, “Хараство жыцця і слова. Вершаваная проза жыцця Вацлава Хадасевіча”, літаратурнае знаёмства “Чалавек працы”, прысвечанае пісьменніку-земляку І.Хадановічу, і інш.

У Любанскім раёне прайшлі “Паўлаўскія чытанні” пад назвай “Будзь вечнай пад небам старонка, дзе я нарадзіўся і рос”, прысвечаныя 80-годдзю з дня нараджэння пісьменніка У.Паўлава, з раённым конкурсам чытальнікаў твораў пісьменніка, а таксама арганізаваны юбілейны вечар з удзелам беларускіх творцаў.

Нясвіжская ЦРБ арганізавала літаратурныя чытанні “Памяці паэта быць вечнай” з нагоды 115-годдзя з дня нараджэння паэта У.Жылкі. Удзельнікамі чытанняў сталі навукоўцы цэнтра даследаванняў культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук і супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры.

VIII Віткаўскія чытанні “Народжаны пад знакам паэзіі” прайшлі ў бібліятэках Слуцкай ЦБС. На Стаўбцоўшчыне адбылося традыцыйнае свята “Каласавіны”, прымеркаванае да дня нараджэння Якуба Коласа. Перад удзельнікамі свята выступілі дырэктар Дзяржаўнага музея Я.Коласа З.Камароўская, паэт Н.Гальпяровіч, заслужаны артыст В.Салаўёў, госці з бліжняга замежжа.

Раённы літаратурны вечар памяці “Пісьменнікі Уздзеншчыны на франтах Вялікай Айчыннай” быў прысвечаны ваеннай біяграфіі пісьменнікаў К.Крапівы, П.Глебкі, А.Махнача,

А.Якімовіча і інш., іх творам, напісаным ў гады вайны. Свае творы пра вайну прапанавалі ўвазе прысутных члены Саюза пісьменнікаў Беларусі Г.Нічыпаровіч і В.Сабалеўскі.

Раздзелам “Літаратурная карта Пухавіччыны” папоўніўся сайт Пухавіцкай ЦРБ.

Пры многіх бібліятэках дзейнічаюць аматарскія клубы і літаратурныя аб’яднанні: клуб на Старадарожчыне “Арэскія вытокі” збірае аматараў паэзіі, літаратурна-краязнаўчае аб’яднанне “Жывіца” працуе пры Маладзечанскай ЦРБ, літаратурны клуб “Выток” – у Дзяржынску, літаратурнае аб’яднанне “Рунь” – пры Лагойскай ЦРБ і інш. Члены аб’яднанняў арганізоўваюць святы паэзіі, прэзентацыі зборнікаў, літаратурныя вечарыны і іншыя мерапрыемствы. Напрыклад, у Мінскай ЦРБ прайшла літаратурная сустрэча з пісьменнікамі Міншчыны І.Карнаухавай, С.Быкавай, К.Хадасевіч-Лісавой. У Вілейцы ў рамках праекта “Чытаем кнігі мясцовых аўтараў” адбылася прэзентацыя кнігі Б.Манцэвіча “Эстафета”. На пасяджэнні клуба “Выток” (Дзяржынская ЦРБ) прайшла прэзентацыя першага зборніка вершаў “На ўзвышшы” паэта-аматара А.Анісовіча. Літаратурна-краязнаўчае аб’яднанне “Вытокі” пры Салігорскай ЦРБ арганізавала творчую сустрэчу з пісьменнікам-земляком Ф.Гурыновічам “Яркі лёс, цікавае жыццё”, прэзентацыю зборніка вершаў паэтэсы Н.Семяновіч “Черемуховая вьюга”. Выставай-віншаваннем “Мне шчасце прызначана лёсам” Пухавіцкая ЦРБ адзначыла прыняцце мясцовага паэта У.Рунцэвіча ў шэрагі членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі. У Лагойскай ЦРБ прайшла прэзентацыя калектыўнага паэтычнага зборніка творцаў Лагойшчыны “Пад Купалавай зоркай”.

На базе Жодзінскай гарадской бібліятэкі адбыўся ўжо трэці гарадскі фестываль аўтарскай песні і паэзіі, галоўнай умовай якога з’яўляецца выкананне твораў на словы мясцовых аўтараў.

Бібліятэкары Вілейскай ЦБС выступілі арганізатарамі раённага конкурсу на лепшы літаратурны твор “Не о войне пишу – о человеке”. А Уздзенская ЦРБ сумесна з рэдакцыяй

раённай газеты правяла літаратурны раённы конкурс “Памяць мацней за час”.

Значнай падзяей у культурным жыцці вобласці стаў IX абласны злёт маладых паэтаў Міншчыны “Слова Купалы да творчасці кліча”. Лепшыя вершы маладых паэтаў былі надрукаваны ў аднайменным літаратурным зборніку, у бібліятэках прайшлі сустрэчы з маладымі творцамі.

Літаратары-пачаткоўцы Валожыншчыны ўдзельнічалі ў раённым літаратурным конкурсе “Маладыя галасы-2015”. Валожынская ЦРБ, якая выступіла адным з арганізатараў конкурсу, наладзіла літаратурнае свята, на якім знаёміла чытачоў з маладымі аўтарамі і прэзентавала калектыўны зборнік мясцовых паэтаў “Помнім і жывем”.

З мэтай папулярызацыі беларускай літаратуры бібліятэкамі вобласці выкарыстоўваліся такія традыцыйныя формы работы, як літаратурныя гадзіны, вечары-партрэты і юбілейныя вечарыны, сустрэчы з кнігамі і кніжныя выставы, прымеркаваныя да юбілеяў беларускіх пісьменнікаў, і інш. У справаздачным годзе бібліятэкі святкавалі 80-годдзе з дня нараджэння Рыгора Барадуліна, 90-годдзе з дня нараджэння Івана Навуменкі, 110-годдзе з дня нараджэння Петруся Броўкі, 85-годдзе з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча.Да дня нараджэння Р.Барадуліна прайшоў вечар “Чараўнік паэтычнай стыхіі” ў Чэрвеньскай ЦРБ, акцыі “Кожнаму наведвальніку – кнігу Караткевіча”, “Кожны дзень – з кнігай Караткевіча” арганізавала Бярэзінская ЦБС. Да 50-годдзя з дня нараджэння пісьменніцы Л. Рублеўскай у Дзяржынску прайшоў бенефіс яе кніг “З таго, што помніцца і што думаецца”.

Адным з самых цікавых мерапрыемстваў па папулярызацыі беларускай літаратуры стала творчая сустрэча “Усё пачынаецца з любові” з беларускім паэтам, перакладчыкам, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі імя Я.Купалы У.М.Скарынкіным і яго жонкай В.П.Скарынкінай-Луцэвіч (пляменніцай Я.Купалы), якая адбылася ў Ратамскай с/б Мінскага раёна.

“Дзень памяці Максіма Багдановіча” ладзіўся ў музеі-сядзібе паэта ў в. Ракуцёўшчына Маладзечанскага раёна.

У мерапрыемстве прынялі ўдзел бібліятэкары горада і раёна, пісьменнікі і краязнаўцы, музейныя работнікі і школьнікі. Супрацоўнікі ЦРБ падрыхтавалі конкурс на лепшага знаўцу жыцця і творчасці Максіма Багдановіча пад назвай “Святло далёкай зоркі”.

Сапраўдным святам беларускай культуры выявіў сябе XV Нацыянальны фестываль песні і паэзіі ў Маладзечне, у якім прынялі ўдзел і бібліятэкары горада і раёна. У Вязынцы былі арганізаваны паэтычныя сустрэчы ў з членамі Саюза пісьменнікаў Беларусі Н.Гальпяровічам, Т.Сівец, У.Мазго, М.Шабовічам, В.Шніпам, Т.Атрошанка, К.Цыбульскім і інш. Каля помніка народнаму паэту Я.Купалу гасцей вітаў пісьменнік, даследчык-краязнаўца, супрацоўнік ЦРБ імя М.Багдановіча Міхаіл Казлоўскі.

Тэатр “Жывая кніга” з цыклам “Літаратура ўслых” дзейнічае пры Бярэзінскай ЦРБ. Тэатр аднаго акцёра “Жывое слова” паспрыяў вобразна-эмацыянальнаму ўспрыняццю тэкстаў беларускіх аўтараў падчас вулічных мастацкіх чытанняў. На суд гледачоў былі вынесены монатэатралізацыі апавяданняў ваеннай тэматыкі “Жаніх і нявеста” В.Хомчанкі, “Апошнія і першыя” Б.Сачанкі, “Васількі” М.Лынькова і інш.

Бібліятэкі Пухавіцкай ЦБС у справаздачным годзе правялі чарговыя Чыгрынаўскія чытанні з удзелам удавы і дачкі пісьменніка.

У Жодзінскай ЦГБ у рамках “Календара знамянальных і памятных дат на 2015 г. Пісьменнікі Беларусі” быў рэалізаваны рэкламны праект беларускай сацыяльна значнай літаратуры “Славутыя пісьменнікі зямлі беларускай”, прызваны папулярызаваць айчынную літаратуру і вывучаць чытацкія запыты. Праект уключаў такія мерапрыемствы, як святкаванні юбілейных дат Л.Галубовіча, В.Іпатавай, Э.Скобелева і інш., сустрэча з беларускім пісьменнікам і публіцыстам М.Галдзянковым, сустрэча з лаўрэатамі прэміі “Залаты Купідон” і інш. На прысваенне С.Алексіевіч Нобелеўскай прэміі па літаратуры Жодзінская ЦГБ адгукнулася шэрагам кніжных выстаў-аглядаў творчасці пісьменніцы.

Зеленаборская інтэграваная с/б Смалявіцкай ЦБС арганізавала он-лай-сустрэчу з пісьменніцай Кацярынай Хадасевіч-Лісавой, у Слуцкай ЦРБ прайшла сустрэча з пісьменнікам Анатолем Зэкавым, Будслаўская с/б Мядзельскай ЦБС падрыхтавала пастаноўку п’есы Андрэя Макаёнка "Трыбунал" на сцэне мясцовага Дома культуры.

Электронныя краязнаўчыя рэсурсы бібліятэк Мінскай вобласці

У справаздачным годзе бібліятэкі актыўна папаўнялі бібліяграфічныя БД "Краязнаўства". У Чэрвеньскай ЦРБ база дадзеных утрымлівае 6 678 запісаў, у Мядзельскай ЦРБ – 2 768 запісаў, у Лагойскай ЦРБ – 6 701 запіс, у Дзяржынскай ЦРБ – 4 838 запісаў, у Жодзінскай ЦГБ – 19 162 запісы, у Пухавіцкай ЦРБ – 2 694 запісы, сукупная колькасць запісаў БД "Краязнаўства" і БД "Аналітыка" ў Валожынскай ЦРБ складае 5 860 запісаў, ў Маладзечанскай ЦРБ – 30 160 запісаў.

Працягваўся збор матэрыялаў і папаўненне мясцовых баз дадзеных бібліятэк уласнай генерацыі. Маладзечанская ЦРБ працавала над папаўненнем фактаграфічных БД "Максім Багдановіч у Ракуцёўшчыне", "Вязынка – калыска Янкі Купалы". Старадарожская ЦРБ папаўняла БД "Памяць Старадарожчыны" і БД "Майстры роднага краю", якую вядзе Старадарожская с/б. БД "Вілейшчына" Вілейскай ЦРБ на канец справаздачнага года ўтрымлівае 3 205 запісаў, г. зн. база папоўнілася 580 запісамі. Паўнатэкставая БД "Жодиноведение" ўтрымлівае 60 персаналій. Базы дадзеных уласнай генерацыі Салігорскай ЦРБ "Солигорщина: вчера и сегодня" і "Памятнымі мясцінамі Салігоршчыны" налічваюць 75 і 70 запісаў адпаведна. Лучнікоўская бібліятэка-філіял № 7 папаўняла БД "Лучнікоўскі летапіс" (404 запісы) і "Случчанская хроніка" (1 758 запісаў). Плённая работа вядзецца ў Мядзельскай ЦРБ: БД "Памяць Мядзельшчыны" на канец 2015 г. налічвала 423 тэкставыя дакументы, электронная тэкставая БД "Мядзельшчына – край блакітных азёр" – 144 тэкставыя дакументы, а БД "Максім Танк" утрымлівае 302 запісы. БД уласнай генерацыі Барысаўскай ЦРБ "Вяртанне да вытокаў" і "Слово краеведа" папоўніліся

адпаведна на 40 і 50 даведак. Электронная краязнаўчая фактаграфічная картатэка “Памяць Міншчыны. Персаналіі. Пухавіцкі раён” на канец года ўтрымлівала інфармацыю пра 188 персаналій і налічвала 657 бібліяграфічных запісаў. Пухавіцкая ЦРБ працягвала папаўненне электроннай картатэкі “Юныя таленты Пухавіччыны”, якая на сённяшні дзень складаецца з 88 слайдаў.

Ствараюцца і новыя базы дадзеных. Вілейская ЦРБ распрацавала БД “Ганна Новік: жыццё і творчасць”, якая складаецца з некалькіх раздзелаў (падбаз). У дзіцячым аддзеле Слуцкай ЦРБ створана БД “Горад дзевяці стагоддзяў”, яна ўтрымлівае 1 953 бібліяграфічныя запісы, якім адпавядаюць паўнатэкставыя дакументы.

Бібліятэкі вобласці ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы тэкставых даведак для БД НББ “Беларусь у асобах і падзеях”. У 2015 г. бібліёграфы-краязнаўцы падрыхтавалі даведкі пра ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны М.К.Рагоўскага (Любанская ЦРБ), заслужаную артыстку Беларусі Г.Ф.Бальчэўскую (Мядзельская ЦРБ), літаратуразнаўцу М.В.Няхая (Бярэзінская ЦРБ), Героя Савецкага Саюза У.А.Наржымскага і пісьменніка В.П.Сташэўскага (Капыльская ЦРБ) і іншых выбітных асоб краіны.

У справаздачным годзе Барысаўская ЦРБ рэалізавала шэраг інтэрнет-праектаў краязнаўчага характару: “Ими гордится Борисовщина” (прысвечаны Героям Савецкага Саюза і поўным кавалерам ордэна Славы), “Почетные граждане Борисовского района”, “Обелиски память хранят” (пра помнікі Вялікай Айчыннай вайны), “Память борисовских улиц”, “Писатели-фронтовики Борисовщины”. Некаторыя з гэтых праектаў прадстаўлены на сайце бібліятэкі.

Належную ўвагу бібліятэкі Мінскай вобласці надаюць выдавецкай дзейнасці. Значную частку друкаванай прадукцыі складаюць выданні краязнаўчага характару, а таксама матэрыялы, скіраваныя на прапаганду беларускай літаратуры.

Амаль кожная раённая бібліятэка выпусціла краязнаўчыя календары памятных дат раёна і бібліяграфічныя паказальнікі

паводле інфармацыі аб раёне на старонках мясцовага і рэспубліканскага друку.

У выдавецтве “Чатыры чвэрці” выйшла кніга “Землякі”, выданне якой было ініцыявана Барысаўскай ЦРБ. У гэтай кнізе, прымеркаванай да 90-годдзя ўтварэння Барысаўскага раёна і 130-годдзя вёсак Леонава і Шобікі Барысаўскага раёна, сабраны нарысы гісторыкаў і краязнаўцаў Барысаўшчыны, успаміны жыхароў вёсак раёна.

Сярод выданняў краязнаўчага характару варта адзначыць наступныя: гісторыка-краязнаўчыя выданні “Вайна – трагедыя і подзвіг”, “Скажам дзякуй ветэранам” (да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў), бібліяграфічныя спісы і паказальнікі “Сёстры Хатыні. Вёскі Дзяржынскага раёна, спаленыя разам з жыхарамі”, “Подвижница благочестия. Святая Блаженная Валентина Минская”, інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне “Пастырь. Митрофорный протоиерей Николай Ледник” (Дзяржынская ЦРБ), рэкамендацыйны паказальнік “Па слядах легенды”, прысвечаны Эры Ставер – ураджэнцы Салігоршчыны (Салігорская ЦРБ), бібліяграфічны спіс “Нашы землякі на франтах Вялікай Айчыннай вайны” (Чэрвеньская ЦРБ), зборнік фальклорных песень “Песні, ад якіх святлее душа”, зборнік “Легенды і паданні Крупшчыны” (Крупская ЦРБ), рэкамендацыйныя спісы “Касмічныя дарогі случчан”, “На скрыжаванні жанраў: У.Цэслер”, інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне “Вяртанне да каранёў: гісторыя развіцця пісьменства і друку на Случчыне” (Слуцкая ЦРБ), інфармацыйны зборнік “Літаратурныя мясціны Лагойшчыны” (Лагойская ЦРБ) і інш.

Выходзілі шматлікія выданні, прысвечаныя юбілейным датам знакамітых ураджэнцаў: “Не наракаю на цябе, мой лёс: матэрыялы навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 70-годдзю з дня нараджэння пісьменніка і навукоўца Р.Семашкевіча” (Маладзечанская ЦРБ), “Человек-легенда: к 80-летию со дня рождения Анатолия Александровича Новикова” (Жодзінская ЦГБ), агляд “Яго паэзіі выток” да 80-годдзя з дня нараджэння пісьменніка У.Паўлава (Обчынская с/б Любанскай ЦБС), матэрыялы літаратурных

чытанняў, прысвечаных 115-годдзю з дня нараджэння У.Жылкі “Памяці паэта быць вечнай” (Нясвіжская ЦРБ), краязнаўчы паказальнік “Есть имена и есть такие даты” да 100-годдзя з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза Дз.Гуляева (Салігорская ЦРБ), буклет “Бяссмертны той, хто ў памяці жыве” да 95-годдзя з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза Алены Колесавай (Крупская ЦРБ), краязнаўчае выданне “Пісьменнік і грамадскі деяч: да 135-годдзя з дня нараджэння Язэпа Дылы” (Слуцкая ЦРБ), бібліяграфічныя спісы літаратуры “Родзевіч Леапольд Іванавіч: да 120-годдзя з дня нараджэння”, “Ляшчун Мікалай Міхайлавіч: да 60-годдзя з дня нараджэння” (Лагойская ЦРБ) і інш.

Не абышлі бібліятэкі ўвагай і мясцовых творцаў, былі выдадзены наступныя паэтычныя зборнікі: “Там, дзе Уша серабрыцца: Маладзечаншчына літаратурная”, зборнік успамінаў ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Пухавога А.Л. “Дневники памяти Алексея Пухового” (Бярэзінская ЦРБ), “На хвалі натхнення: зборнік вершаў маладых паэтаў Дзяржыншчыны”, “Я строками взываю к небесам: сборник произведений участников литературно-поэтического клуба “Выток” (Дзяржынская ЦРБ), перавыданне зборніка вершаў Уладзіміра Паўлава “Калодзеж у полі”, зборнік вершаў Івана Муравейкі “За родны край” (Любанская ЦРБ), зборнікі вершаў мясцовых паэтаў П.Цюленева “Музыка души”, М.Захаравай “Проза жизни”, Л.Антанюк “Белый танец” (Старадарожская ЦРБ) і інш.

Юбілейным датам беларускіх пісьменнікаў прысвечаліся буклеты “Нашы знакамітыя землякі” ў Валожынскай ЦРБ; біябібліяграфічныя даведкі “Салдат. Вучоны. Летуценнік. Да 90-годдзя з дня нараджэння І.Навуменкі”, “Жыві сёння!..: да 75-годдзя з дня нараджэння У.Ліпскага” ў Любанскай ЦРБ; “З верай у справядлівасць: нарыс жыцця і творчасці Алеся Пальчэўскага”, “Я сын зямлі сваёй: метадычныя і бібліяграфічныя матэрыялы да 80-годдзя з дня нараджэння Р.Барадуліна” ў Уздзенскай ЦРБ і інш.

Акрамя таго, Дзяржынская ЦРБ падрыхтавала выданне камплекта фотапаштовак “Память, застывшая в камне”, прысвечаных помнікам ахвярам, удзельнікам і героям Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Дзяржынскага раёна.

## Бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей

***Агляд дзейнасці дзіцячых бібліятэк Мінскай вобласці ў 2015 годзе***

### Асноўныя паказчыкі дзіцячых бібліятэк Мінскай вобласці

У Год моладзі дзіцячыя бібліятэкі Міншчыны актыўна займаліся развіццём чытацкіх інтарэсаў дзяцей і падлеткаў, забяспечвалі іх права на інфармацыю, інтэлектуальнае і духоўнае развіццё. У сваёй працы нашы спецыялісты выкарыстоўвалі інавацыйныя методыкі і формы ў распаўсюджванні краязнаўчых, прававых, эстэтычных ведаў, у арганізацыі вольнага часу дзяцей, фарміраванні патрыятызму, прапагандзе сярод дзяцей і падлеткаў літаратуры з мэтай павышэння цікавасці да кнігі і чытання.

У 2015 годзе бібліятэчным абслугоўваннем дзіцячага насельніцтва Мінскай вобласці займаліся 25 дзіцячых бібліятэк і 382 сельскія філіялы.

У 2015 годзе адбылася рэарганізацыя дзіцячых бібліятэк (цэнтральнай ДБ імя А. Гайдара, г. Барысаў; Вілейскай ДБ) шляхам далучэння іх у якасці дзіцячых аддзелаў да цэнтральных раённых бібліятэк.

Паслугамі публічных бібліятэк вобласці карысталася 157,0 тыс. чытачоў-дзяцей (у 2014 годзе – 177,9 тыс.). Чытачамі дзіцячых бібліятэк з’яўляліся 50,8 тыс.чалавек (у 2014 годзе – 78,1 тыс.), з іх да 15 год 43,3 тыс.дзяцей (у 2014 годзе – 59,3 тыс.), якім было выдадзена 741,8 тыс.экз.дакументаў (у 2014 годзе – 1 403,5 тыс.).

Дзіцячы чытач складае 33,9 % ад агульнай колькасці (463,1 тыс.) карыстальнікаў.

У склад карыстальнікаў дзіцячых бібліятэк, акрамя дзяцей да 15 гадоў, уваходзяць таксама бацькі, настаўнікі, вучні старэйшых класаў, студэнты.

Актыўнасць чытання дзяцей да 15 год у дзіцячых бібліятэках Мінскай вобласці склала 15 (у 2014 годзе – 18); абарачальнасць фонду – 1,5 (у 2014 годзе – 2,3).

З мэтай рэалізацыі дзяржаўнай бібліятэчнай палітыкі, накіраванай на захаванне і развіццё патэнцыялу сельскіх тэрыторый, у вобласці функцыяніруюць 270 бібліятэк аграгарадкоў, якімі далучана да чытання 42,3 тыс. дзяцей і падлеткаў ( у 2014 годзе – 48,1тыс.).

Бібліятэчны фонд дзіцячых бібліятэк вобласці налічвае 492,9 тыс. экз. дакументаў (у 2014 годзе – 613,9 тыс. экз.). У сярэднім на адну бібліятэку прыходзіцца 19,7 тыс. экз. (у 2014 годзе – 22,7 тыс.).

Доля выбыцця выданняў з агульнага фонду склала 35,0 тыс.экз.( 2014 годдзе – 104,1 тыс.)

Новыя паступленні склалі 23,9 тыс. экз. (у 2014 годзе – 33,1 тыс. экз). Лічба аб'ёму паступленняў на працягу года вызначаецца неаднолькавасцю: ад 0,5 тыс. экз. дакументаў (Смалявіцкі раён) да 5,3 тыс. экз. дакументаў (г. Жодзіна).

Пры камплектаванні фондаў дзіцячых бібліятэк Міншчыны асаблівая ўвага надавалася набыццю літаратуры ў дапамогу навучальнаму працэсу, літаратуры па пазакласным чытанні, сацыяльна значнай літаратуры, твораў сучасных аўтараў і павышанага попыту.

Актуальным застаецца пытанне папаўнення фондаў сельскіх філіялаў галіновай дзіцячай літаратурай, кнігамі для пазакласнага чытання, дзіцячай  літаратурай сучасных аўтараў.

Для апошніх гадоў характэрна тэндэнцыя да ўстойлівага скарачэння аб'ёму сукупнага бібліятэчнага фонду ў раённых дзіцячых бібліятэках, які за мінулы год скараціўся на 121 тыс. экз.

Ажыццяўлялася нестацыянарнае абслугоўванне бібліюбусам насельніцтва, у тым ліку дзяцей, аддаленых вёсак.

Для 2015 года характэрна інтэнсіфікацыя працэсу камп'ютарызацыі дзіцячых бібліятэк, насычэненне іх электронным, аўдыёвізуальным абсталяваннем. У Мінскай вобласці камп'ютарызавана 19 дзіцячых бібліятэк.

У справаздачным годзе ў дзіцячых бібліятэках вобласці зменшылася набыццё дакументаў на электронных носьбітах. У 2015 годзе ўсяго было набыта 20 электронных дакументаў (у 2014 годзе – 76). Усяго фонд дакументаў на электронных носьбітах у ДБ Міншчыны налічвае 1 627 экз.

### *Мерапрыемствы па прапагандзе чытання*

У дзіцячых бібліятэках Міншчыны працуюць інфармацыйна-адукацыйныя цэнтры.

На базе бібліятэкі сямейнага чытання "Верасок" г. Маладзечна запыты карыстальнікаў задавальняе інфармацыйна-адукацыйны мультымедыйны цэнтр на 3 камп'ютарызаваныя працоўныя месцы з доступам да Інтэрнэта. Працягвае паспяховую працу інфармацыйна-адукацыйны цэнтр "Тэрыторыя IQ " у Слуцкай раённай дзіцячай бібліятэцы, дзе размешчаны фонд на электронных носьбітах, які ўключае папулярныя энцыклапедыі для дзяцей, развіваючыя і навучальныя гульні, электронныя мастацкія кнігі.

Добрыя набыткі ў гэтым кірунку ёсць бібліятэк Салігорскага раёна. Раённая дзіцячая бібліятэка шмат гадоў вядзе электронны каталог і базу дадзеных "Аналітыка". Пры раённай дзіцячай бібліятэцы, Крывіцкай, Хорастаўскай экалагічнай сельскіх бібліятэках Салігорскага раёна працуюць мультымедыйныя цэнтры. Яны створаны для аператыўнага, эфектыўнага і якаснага абслугоўвання наведвальнікаў з выкарыстаннем аўдыявізуальных матэрыялаў і інфармацыі на электронных носьбітах. Рэсурсы цэнтра дапамагаюць супрацоўнікам бібліятэкі выконваць даведкі, рыхтаваць матэрыялы да выстаў, амаль кожнае мерапрыемства не

абыходзіцца без гукавых і наглядных фрагментаў мультымедыя. Пры дзвюх бібліятэках створаны інфармацыйна-адукацыйныя цэнтры (Старобінская гарпасялковая бібліятэка, Ананчыцкая сельская інтэграваная бібліятэка).

Плённа працуюць інфармацыйна-адукацыйныя цэнтры "Твоя жизнь – твой выбор" (Узденская РДБ), "Настаўніку. Выпускніку. Абітурыенту"(Стаўбцоўская ДБ), "У свеце падлетка" (Валожынская ДБ), "Школа інфармацыйнага камфорту" (Лагойская ДБ) і інш.

Актывізавалася работа дзіцячых бібліятэк па папулярызацыі кнігі і чытання праз сацыяльныя сеткі Інтэрнэт (г.Маладзечна, г.Барысаў, г.Салігорск, г.Слуцк, Мінскі раён і інш.).

У справаздачным годзе актыўна вялася работа з кантэнтам сайта "Книжный квартал в лабиринте города" дзіцячага аддзела Слуцкай РЦБ. Разам з Бібліягідам юныя наведвальнікі сайта маюць магчымасць наведаць бульвар Кнігачытаў, прагуляцца па бібліятэчным праспекце, зазірнуць на краязнаўчае скрыжаванне, звярнуцца ў рэсурс-цэнтр і інш.

У справаздачным годзе дзіцячы аддзел Барысаўскай ЦРБ імя І.Каладзеева прыняў удзел у міжнародным онлайн-семінары (вэбінары) "Гайдар – XXI век". У анлайн-сустрэчы, прысвечанай юбілею аповесці "Тимур и его команда", бралі ўдзел літаратуразнаўцы з Расіі і Беларусі. Госця вэбінара, малады беларускі рэжысёр Н.Галуза, прэзентавала фільм "Тимур и его команда".

Барысаўская ЦРБ імя І.Каладзеева ўжо шмат гадоў удзельнічае ў праекце Пасольства ФРГ і Інстытута імя Гётэ ў Мінску "Медиа-автобус "Deutsch Express". Медыя-аўтобус два разы на месяц робіць прыпынак у г.Барысаве, каб карыстальнікі, дзеці і дарослыя, маглі памяняць літаратуру на нямецкай мове. Для юных наведвальнікаў "бібліятэкі на колах" праводзяць цікавыя мерапрыемствы: слайд-прэзентацыі "Масленица по-немецки", "Сказочные путешествия по замкам Германии", "День книги в Германии", "Праздник мам в Германии", "Великие немецкие художники" і інш.

У рамках праекта “Deutsch Express” бібліятэку сямейнага чытання “Верасок” (г. Маладзечна) наведаў нямецкі пісьменнік і перакладчык Герберт Гюнтэр – аўтар кніг для дзяцей, дарослых і моладзі.

Росту аўтарытэту дзіцячых бібліятэк, іх прыцягальнасці для юных наведвальнікаў спрыяла супрацоўніцтва з раённымі і рэспубліканскімі СМІ. Публікацыі ў перыядычных выданнях, падрыхтаваныя журналістамі сумесна з бібліятэкарамі, паведамляюць аб мерапрыемствах, рэсурсах, паслугах, асвятляюць розныя аспекты дзейнасці бібліятэк.

У рэкламаванні дзіцячых бібліятэк папулярныя экскурсіі, дні адчыненых дзвярэй, прэзентацыі праектаў бібліятэк, піяр-апытанні і інш. З’явіліся новыя формы вулічнай рэкламы, такія як “Бібліятэка пад парасонам” (Бярэзінскі раён), “Чытальная зала пад адкрытым небам” (Стаўбцоўскі раён, г. Жодзіна), што дазваляе максімальна раскрыць кніжныя фонды дзіцячай літаратуры, вынесці іх у зону летняга адпачынку дзяцей і падлеткаў.

Пухавіцкая дзіцячая бібліятэка асвоіла новую для сябе форму мерапрыемства – арганізавала дзіцячы буккросінг.

Культурна-асветніцкая дзейнасць дзіцячых бібліятэк была накіравана на рэалізацую мэтавых бібліятэчных праграм і праектаў: “Мир равных возможностей”, “Живая книга”, “Беларускія канікулы ў вясковай бібліятэцы”, “Библиотека. Православие. Духовность”, “Добрые книги”, “Победа во имя живущих” (Салігорскі раён); “Мая зямля, мае землякі”, “Сёння – зярнятка, заўтра праслінка”, “Чыстая планета” (Дзяржынскі раён); “Клопат”, “Лета з добрай кнігай”, “Расцём з кнігай” (Бярэзінскі раён); праект “Сымон і К@” (у падтрымку беларускай кнігі і чытання), “Вясёлая кніжная дзяцінства”, “Па кніжных сцяжынках нашага лета” (Пухавіцкі раён); “Дзеці. Сям’я. Кніга”, “Лета. Кніга. Бібліятэка , “Путь к духовности” (Мінскі раён); “І зноў гартаюцца вайны старонкі”, “Кніжны востраў у акіяне лета”, “Роднай зямлі прыгажосць мы створым сваімі рукамі”, “Край мой родны – лёс мой вечны”, “Сейбіты слова і мудрасці” (Стаўбцоўскі раён); “Наш экадом – Мядзельшчына”

(Мядзельская ДБ); “Ступени чтения”(г. Жодзіна), “Акадэмія школьных навук”, “Стыль жыцця – здароўе”, “Вучымся берагчы прыроду”, “Улетку адпачывай, але чытаць не забывай” (Лагойскі раён) і іншыя.

Бібліятэкі Барысаўскага раёна ўдзельнічалі ў рэгіянальным праекце “Читающие дети и подростки – читающая нация!”. Вялікую цікавасць у юных чытачоў выклікаў фотапраект “Что советуют прочесть известные люди города”, раённы конкурс дзіцяча-юнацкай рукапіснай кнігі “Читаем активно, творим креативно”, конкурс “Необыкновенные пуговицы”, праграма “Литературный завтрак” (агляд навінак літаратуры па радыё “Навіны Барысаўшчыны”), рэкламна-інфармацыйная акцыя “PRO-движение книги и чтения”.

Работу дзіцячых бібліятэк немагчыма ўявіць без правядзення акцый: “Лета з добрай кнігай” (Лагойскі і Пухавіцкі раёны), “Сябра бяры, у бібліятэку ідзі” (Любанская ДБ), “Открой книгу и чудеса начнутся”, “Воздушная библиопочта”, “Вирус чтения” (г. Жодзіна), “Побач жыве ветэран” (Салігорскі раён), “Чытаем кнігі пра вайну” (Клецкая ДБ), “Беларуская кніга чакае вас” (Пухавіцкі раён), “Счастье быть читателем”, “Аллея читающего детства” (Барысаўскі раён), “З новай кнігай – у новый год”, “Дзеці міру – дзецям вайны”(Слуцкая РЦБ, дзіцячы аддзел) і іншыя.

Бібліятэкі Мінскай вобласці акцэнтуюць развіццё масавых формаў работы, такіх як аматарскія аб’яднанні, клубы і гурткі, што аб’ядноўваюць дзяцей паводле іх захапленняў. Па цікавых праграмах працуюць клубы “Казка” і “Падлетак” (Бярэзінская ДБ), ”Вясёлка” і “Шматдзетная сям’я” (Стаўбцоўская ДБ), “Девичьи секреты” і “Лесавічок” (Салігорская ДБ), экалагічны клуб “Чамучкі” і літаратурна-краязнаўчы клуб “Верасок” (Чэрвеньская ДБ), “Нядзельныя сустрэчы”, “Чароўны ліхтарык”, “Мы і нашы дзеці” (бібліятэка сямейнага чытання “Верасок” г. Маладзечна), клуб выхаднога дня “Домовёнок”, літаратурна-інтэлектуальны клуб “ЛІК”, “Золотой ключик” і клуб ранняга развіцця “Кукляшка” (г. Жодзіна), літаратурна-пазнавальны клуб “Чабарок” і

літаратурна-музычная гасцёўня “Натхненне” (Клецкая ДБ), літаратурна-краязнаўчы клуб “Крутагорачка”, экалагічны “Пазнайка” і клуб сямейнага чытання “Тата, мама і я – чытаючая сям’я” (Дзяржынская ЦРБ), экалагічны клуб “Мурашок”(Любанская ДБ), клуб дапытлівых “Чамучкі” і экалагічны клуб “Лесавічок” (Узденская РДБ), “Пятрушка” (Старадарожская ДБ), “Сябры кнігі” (Мядзельская ДБ) і, безумоўна, лялечныя гурткі “В гостях у Василисы” (Нясвіжская ДБ), “Пятрушка” (Бярэзінская ДБ), “Сонейка” (Клецкая ДБ), “Сонейка” (Валожынская ДБ), лялечны тэатр “Маленькая краіна”(Стаўбцоўская ДБ), “Кукляшки” (ДБ г. Жодзіна), “Лукамор’е” (Мядзельская ДБ), лялечны тэатр “Батлейка” (Чэрвеньская ДБ).

Дзіцячыя бібліятэкі Міншчыны асаблівую ўвагу надаюць масавай рабоце, што дазваляе змястоўна арганізаваць вольны час дзяцей, спрыяе фарміраванню культуры міжасобавых зносін.

Усё больш бібліятэк далучаецца да распрацоўкі і ажыццяўлення краязнаўчых праграм для дзяцей . Па праграмах “Край мой родны – лёс мой вечны”, “Пазнай Радзіму – пазнаеш сябе”, “Сейбіты слова і мудрасці” пачалі працаваць бібліятэкі Стаўбцоўскага раёна. Імідж-праект “Вяртанне да вытокаў” створаны дзіцячым аддзелам Барысаўскай ЦРБ імя І.Каладзеева.

Дзейнічаюць літаратурна-краязнаўчыя аб’яднанні, клубы і гурткі, якія ставяць перад сабой задачай збор, захаванне і папулярызацыю культурнай спадчыны продкаў: “Кругагляд” (Валожынская д/б), “Зямля пад белымі крыламі” (Івянецкая д/б), “Сузор’е” (Ракаўская с/б), “Кругагляд” (Сакаўшчынская с/б), “Рамонак” (Гародзькаўская с/б), “Эрудыт” (Пугачоўская с/б), “Сямейная акадэмія (Багданаўская с/б) і інш.

Шматлікія мерапрыемствы бібліятэк, разнастайныя па форме і зместу, робяць свой важкі ўнёсак ў краязнаўства рэгіёнаў: тыдні краязнаўчых ведаў, краязнаўчыя гадзіны, гадзіны разважанняў, гадзіны ўспамінаў і гадзіны знаёмстваў, урокі радзімазнаўства, віртуальныя краязнаўчыя падарожжы, прагляды відэафільмаў, мультымедыйныя прэзентацыі і інш.

Добра арганізавана работа ў краязнаўчым напрамку ў дзіцячых бібліятэках Мядзеля, Салігорска, Слуцка, Лагойска, Стаўбцоў, Маладзечна, Вілейкі, Барысава, Смалявіч.

Мэтанакіравана прайшло медыяпадарожжа "Памятныя мясціны Лагойшчыны" ў Лагойскай ДБ. Юныя наведвальнікі бібліятэкі пазнаёміліся з такімі вядомымі мясцінамі, як Лагойскі парк, літаратурны музей "Акопы", мемарыяльны комплекс "Хатынь", гарналыжныя комплексы "Лагойск" і "Сілічы".

Папулярныя ў юных жыхароў г. Барысава экскурсіі "Сядзіба, або Хатка з матчынай душой" і "Родная хатка" з наведваннем музейна-выставачай экспазіцыі "Бабуліна спадчына" пры дзіцячым аддзеле Барысаўскай ЦРБ імя І.Каладзеева.

У бібліятэцы сямейнага чытання "Верасок" (г. Маладзечна) быў праведзены цыкл мерапрыемстваў "З любоўю да Беларусі".

Дзіцячы аддзел Слуцкай ЦРБ знаёміў дзяцей і падлеткаў з гістарычнай спадчынай і сучасным жыццём Случчыны пасродкам духоўна-краязнаўчага праекта "Слуцк – валошка ў вянку Беларусі". Асноўнымі напрамкамі праекта вылучаны: арганізацыя краязнаўчай бібліятэчнай прасторы, агульнае краязнаўства "Случчыны роднай славутыя крокі", літаратурнае краязнаўства "Не зводзіліся ўсе вякі на Случчыне паэты", царкоўнае краязнаўства "Вялікія святыні малой радзімы", экалагічнае краязнаўства "Там, дзе Случ гамоніць". У рамках праекта адбыліся цікавыя мерпрыемствы: краязнаўчы экскурс "Горад слаўных паясоў", чытанне ўголас "З меха дзеда Васіля", паэтычныя хвілінкі "Мая радзіма – Случчына" і інш.

Валожынскі раён адзначаў у 2015 годзе 75-годдзе. Паўсюдна ў бібліятэках раёна дзейнічала кніжная выстава "Валожынскаму раёну – 75!", праводзіліся святочныя мерапрыемствы: экскурс у гісторыю "Мая маленькая Радзіма" (Івянецкая гарпасялковая бібліятэка), краязнаўчая віктарына "Аб чым расказваюць помнікі гісторыі і культуры Валожынскага краю" (Суднікаўская с/б), агляд літаратуры для дзяцей "75 – Валожынскаму раёну!" (Дорская с/б), гадзіна інфармацыі "У тым краі, дзе жывеш" (Сакаўшчынская с/б), літаратурна-

музычная кампазіцыя “Зямля нам дадзеная лёсам” (Багданаўская с/б), гульня-падарожжа “Геральдыка Валожынскага раёна” (Забрэзская с/б), літаратурна-краязнаўчая гадзіна “Легенды і паданні аб знакамітых мясцінах Валожыншчыны” (Манькаўшчынская с/б) і іншыя, якія знаёмілі ўдзельнікаў з гісторыяй малой Радзімы, з помнікамі культуры, з выданнямі пра раён, з імёнамі знакамітых землякоў – грамадскіх і дзяржаўных дзеячаў, вучоных і пісьменнікаў, мастакоў.

Валожынская ДБ ў краязнаўчай дзейнасці цесна супрацоўнічала з раённым музеем. Цікава прайшла гісторыка-краязнаўчая гадзіна, прысвечаная 75-годдзю ўтварэння Валожынскага раёна. Дырэктар музея падрыхтавала мультымедыйную прэзентацыю “Зямля бацькоў – жыцця крыніца”, этапы развіцця раёна ілюстравалі фотаздымкі з музейнага архіву. Мясцовыя паэты Аляксандр Кулак і Валянціна Гіруць-Русакевіч прачыталі свае вершы, прысвечаныя вёскам, якія падзялілі лёс Хатыні. Школьнікаў зацікавіла выстава “Слова аб роднай зямлі”, дзе былі прадстаўлены працы мясцовых краязнаўцаў, а таксама кнігі літаратараў з Валожыншчыны.

З нагоды 75-годдзя з дня заснавання Нясвіжскага раёна быў арганізаваны гарадскі краязнаўчы рынг “Я люблю мой Нясвіж”, падчас якога навучэнцы школ горада спаборнічалі паміж сабой на лепшае веданне гісторыі Нясвіжчыны, прайшлі краязнаўчыя гадзіны, віртуальныя вандроўкі, гістарычныя падарожжы, гадзіна гістарычнага партрэта і інш.

Належнае месца ў краязнаўчай рабоце бібліятэк займае папулярызацыя мясцовага фальклору і святаў народнага календара, афармляюцца кніжныя выставы, тэматычныя паліцы да свята Нараджэння Хрыстова, Вялікадня і іншыя. Юным чытачам Любаншчыны вельмі спадабаліся фальклорныя пасядзелкі “Чакае ў госці нас Мядовы Спас”.Фальклорнае падарожжа “Зазірнём у мінулае” прайшло ў Ракаўскай с/б (Валожынскі раён).

Цікава быў праведзены пазнавальны квэст “За скарбам у краіну майстроў” у Ізбіноўскай с/б (Вілейскі раён). Дзеці

апынуліся ў казачнай краіне майстроў у пошуках скарбаў. Яны даведаліся, што, паводле народных перакананняў, скарбы могуць быць звычайнымі і заклятымі, зачараванымі. А на варце закапаных скарбаў знаходзяцца самыя розныя нячысцікі – кладнік, лесавік, пушчавік, купальскі дзядок, палявік, чорт, хут. Майстры дома рамёстваў далі дзецям слушныя падказкі, парады і шмат чаму навучылі: плесці паясы і вянкі, ляпіць з гліны абярэгі, танцаваць старадаўні танец "Таўкачыкі", смажыць яешню. Вандроўнікі пераадолелі ўсе перашкоды і вярнуліся з падарожжа з багатым набыткам.

Адметнай з'явай у працы дзіцячых бібліятэк стала святкаванне Тыдня беларускага пісьменства і друку. Ладзіліся кніжныя выставы, гадзіны інфармацыі і гісторыі, літаратурныя чытанні, марафоны прыказак і прымавак, гістарычныя панарамы.

Папулярызацыя беларускай мовы і нацыянальнай літаратуры сярод дзяцей і падлеткаў заўсёды знаходзіцца ў полі ўвагі бібліятэкараў. Разгортваюцца пастаянна дзеючыя кніжныя выставы "Беларускія пісьменнікі – дзецям", "Айчынная кніга ў фокусе агляду", "Беларускія пісьменнікі- юбіляры", "Шануй беларускую мову", "Чытайце па-беларуску", "Каб слова роднае жыло" і інш. Выдаюцца буклеты і закладкі "Пасябруй з беларускай кнігай", "Гэтыя беларускія кнігі павінен прачытаць кожны школьнік", "5 беларускіх топ-кніг", рэкамендацыйныя спісы "Маладая літаратура Беларусі" і іншыя.

Цікава аформлена кніжна-ілюстраваная выстава "Хата, поўная гасцей" (Дзяржынская ЦРБ, дзіцячы аддзел), прысвечаная беларускім пісьменнікам-юбілярам. Выстава аздоблена вырабамі з саломкі, у экспазіцыі выкарыстаны прадметы нацыянальнага побыту.

Мар'інагорская г/б (Пухавіцкі раён) працуе па праекту "Сымон і К@", які прадугледжвае знаёмства дзяцей з беларускай кнігай. Юныя чытачы Бярэзінскай дзіцячай бібліятэкі прымалі ўдзел у акцыі "Гаворым па-беларуску", у рамках якой праз літаратурную гульню "Старонкі з моўнай скарбонкі" адбывалася знаёмства наведвальнікаў бібліятэкі з беларускімі прыказкамі і прымаўкамі, загадкамі і прыкметамі, жартамі і лічылкамі.

Да Міжнароднага дня роднай мовы і Сусветнага дня паэзіі ў Салігорскай ДБ прайшла акцыя «Родная мова – мой выток, мая аснова», накіраваная на папулярызацыю творчасці беларускіх пісьменнікаў. Адбылася цікавая сустрэча з Р.А.Казлякевіч, загадчыцай аддзела па сувязях з грамадствам часопісаў «Вясёлка» і «Буся». У Мядзельскай ДБ адбыўся дзень беларускай кнігі “Ключ ад скарбаў мовы матчынай”.

Сустрэчы з дзіцячымі пісьменнікамі і пісьменнікамі-землякамі, святы і прэзентацыі беларускіх кніг, агляды літаратуры, літаратурныя вечарыны, хвілінкі-чыталінкі, конкурсы чытальнікаў, літаратурныя конкурсы, віктарыны, гульні, тэатралізаваныя сустрэчы з літаратурнымі героямі, лялечныя спектаклі па творах беларускіх пісьменнікаў, дні беларускіх кніг і казак, падарожжы па старонках любімых кніг садзейнічалі актывізацыі цікавасці да беларускай мовы і літаратуры.

Адкрыццё Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі традыцыйна лічыцца галоўным мерапрыемствам года ў дзіцячых бібліятэках. Кожны дзень тыдня – гэта яркая кампанія па папулярызацыі кніг розных жанраў і тэматыкі. У кожнай бібліятэцы была распрацавана ўласная праграма тыдня: “Библиотека, книга, я – вместе верные друзья” (Лагойская ДБ), “Веселится детвора, Неделя книжкина пришла” (Пухавіцкая РДБ), “Свет ведаў адчыняе кніга” (Стаўбцоўская ДБ), “Время читать”(г.Жодзіна), “Добрым кнігам – добры дзень” (Бярэзінская ДБ), “Открываем книгу – открываем мир” (Мядзельская ДБ), “І прыходзіць свята кнігі” (Валожынская ДБ), “Пусть чтение зажжёт сердца” (Слуцкі раён), “Цуды ў кніжным царстве” (Любанская ДБ), “Я з кнігай адчыняю свет” (Дзяржынская РЦБ, дзіцячы аддзел) і інш.

У час Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі ў Салігорскай ДБ адбылася сустрэча з беларускім пісьменнікам У.І.Ягоўдзікам, лаўрэатам Літаратурнай прэміі імя Я.Маўра. Штодзень для наведвальнікаў малодшага ўзросту ладзіўся лялечны спектакль “Дюймовочка” паводле казкі Г.К.Андэрсена. Наведвальнікам прапаноўваліся хвілінкі гумару “Насмеши друзей”, літаратурная мазаіка “Жили-были братья Гримм”, экалагічны калейдаскоп

“Пернатая королева”. Дзяцей заўсёды чакалі літаратурныя гульні, віктарыны, цікавыя кніжныя выставы.

Маленькія жыхары г. Узды сустрэліся з выдатным пісьменнікам Д. Вінаградавым, які пазнаёміў дзяцей са сваімі кніжкамі: “Сказкі старого леса”, “В зоопарке”, “Хитрый крокодил” і інш.

Тыдзень дзіцячай кнігі ў Мінскай РЦБ адкрыла літаратурная дэгустацыя “Собираясь в дальний путь, шоколадку не забудь”. Разам з Машай і Мядзведзем юныя чытачы адправіліся ў займальнае падарожжа па старонках казак, у якіх упамінаюцца розныя прысмакі. Дзеці разам з казачнымі персанажамі ўдзельнічалі ў віктарынах, конкурсах, гульнях.

Мар’інагорская ГБ (Пухавіцкі раён) запрасіла юных чытачоў разгадаць таямніцу кніжнай вясёлкі і выратаваць яе ад электронных прышэльцаў, якія паставілі сваёй мэтай знішчыць кнігі і ўкараніць свае электронныя носьбіты. Для гэтага кожны дзень тыдня быў адведзены розным колерам: казачнае вандраванне “Чырвоная кніга ў казках і вершах”, падарожжа па кнізе К. Хадасевіч-Лісавой “Казкі сіняй падушкі”, экалагічны круіз “Блакітная кніга ў творах беларускіх пісьменнікаў” і інш. Дзеці павінны былі ўратаваць кожны колер і аднавіць вясёлку. Юныя чытачы пацвердзілі сваю любоў да яркай, маляўнічай, “жывой” традыцыйнай кнігі. Пераможцы атрымалі прызы.

У Жодзінскай ДБ у рамках праекта “КЛИЧ” (к лучшему интересному чтению) і ў мэтах павышэння ролі кнігі і чытання ў жыцці падрастаючага пакалення, развіцця цікавасці да мастацкага слова, стымулявання чытацкай і творчай актыўнасці быў праведзены другі гарадскі творчы конкурс “Книга и чтение в моей жизни”, які становіцца традыцыйным і прымеркаваны да Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі. Па выніках конкурсу быў выдадзены зборнік “Читать это модно” з сачыненнямі яго ўдзельнікаў.

У бібліятэках Слуцкага раёна працягвалася работа праграмы па падтрымцы дзіцячага чытання “Чытаем разам”. Значная ўвага надавалася папулярызацыі чытання як сведчання паспяховасці асобы, стымуляванню чытацкай актыўнасці праз

правядзенне разнастайных мерапрыемстваў, адраджэнню традыцый сямейнага чытання. Сярод цікавых, запамінальных мерапрыемстваў вылучаюцца: літаратурная вандроўка па кнізе М. Прышвіна “В краю дедушки Мазая” (Вежская с/б), парад кніг-юбіляраў 2015 года “Чытайце самі, чытайце разам з намі” (Квасыніцкая с/б), літаратурнае асарці “Цудоўны казачнік” (Замосцкая с/б), кніжная навігацыя “Чытаем на роднай мове” (Агароднікаўская с/б) і інш.

Да Дня бібліятэк у Слуцкай РЦБ прайшоў бібліятэчны кірмаш “BOOK-fair”. Дзіцячы аддзел падрыхтаваў для юных чытачоў выставу-заклік “Пусть станет мир сплошной библиотекой”, мастакі правялі арт-сесію. Вельмі эмацыянальнай атрымалася сустрэча з супрацоўнікамі часопіса “Бярозка”. Пісьменнік Г.Аўласенка адказаў на шматлікія пытанні ўдзельнікаў сустрэчы. Святочны настрой стварыла выступленне беларускай музычнай групы “Laulals”.

Да Міжнароднага дня дзіцячай кнігі амаль ва ўсіх дзіцячых бібліятэках былі арганізаваны кніжныя выставы, прысвечаныя 210-годдзю з дня нараджэння Г.К.Андэрсена, прайшлі дні казак, гутаркі, літаратурныя падарожжы.

Патрыятычны напрамак

У год 70-годдзя Перамогі савецкага народа над нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Вялікай Айчыннай вайне бібліятэкі Міншчыны ў цэнтры сваёй увагі трымалі патрыятычны напрамак работы.

Урокі мужнасці, гадзіны памяці, вечары-сустрэчы з ветэранамі, фестывалі ваеннай кнігі, эстафеты кніг аб вайне, тыдні славы і мужнасці, тыдні патрыятычнай кнігі, дні памяці, конкурсы дзіцячага малюнка, мультымедыйныя прэзентацыі, віртуальныя экскурсіі, вечары гістарычнай хронікі, гістарычныя рэпартажы, літаратурныя вечары, літаратурныя вахты памяці, вандраванні па ваенных кнігах, гадзіны мужнасці, гутаркі – знайшлі сваё месца ў рабочых планах кожнай бібліятэкі вобласці.

У справаздачным годзе бібліятэкі Валожынскага раёна прынялі актыўны ўдзел у раённым аглядзе-конкурсе на лепшую

выставу “Подзвіг вялікі і вечны”. Усе выставы ўключалі і выданні для дзяцей.

Удзельнікі літаратурнага клуба “Кругагляд” Валожынскай ДБ запісалі на раённым радыё віншавальную паштоўку да дня Абаронцаў Айчыны і Узброеных сіл РБ.

У бібліятэцы сямейнага чытання “Верасок” (г. Маладзечна) вельмі ўдалым атрымаўся інтэрактыўны праект "Лісты з фронту".

На кніжным востраве памяці змаглі апынуцца юныя чытачы дзіцячага аддзела Слуцкай ЦРБ. Да ўвагі прысутных была прапанавана медыя-прэзентацыя “Дзяцінства, апаленае вайной”, агляд-рэйтынг “Пяць лепшых кніг аб вайне”, патрыятычная акцыя “Спасибо деду за Победу!”.

Добра дапамагалі актывізацыі чытання кніг ваеннай тэматыкі кніжныя выставы “З болем аб вайне”, “Заўжды будуць жыць іх імёны” і мастацка-ілюстраваны стэнд “Маленькія героі вялікай вайны” (Бярэзінская ДБ), выстава-рэквіем “Победе нашей нет цены!” (Салігорская ДБ), “Войной опалённые строки” (Стаўбцоўская ДБ), “След вайны ў нашых сэрцах” і “Дзеці вайны” (Мінская РЦБ), “Кніжны востраў памяці” (Пухавіцкая ДБ),“Ступені Перамогі” (Лагойская ДБ) і інш.

Наведвальнікаў Пухавіцкай бібліятэкі прыцягвала “Сцяна падзякі”, на якой былі прадстаўлены біяграфіі ветэранаў вайны – жыхароў горада, плакат са стыкерамі, на якіх напісаны віншаванні ветэранам ад наведвальнікаў бібліятэкі. На “далоньках” з паперы дзеці напісалі словы падзякі ветэранам.

У рамках праекта “Победа во имя живущих” (Салігорская ДБ) прайшлі мерапрыемствы: вечар памяці “Победившим в сорок пятом – слава!”, патрыятычная гадзіна “О павших память священна...”, урок мужнасці “Не гаснет памяти огонь”, бібліяграфічныя агляды “И дети тоже победили” і “Пусть будет ясным небо, а травы будут зеленее...”, вахта памяці “Храним в сердцах Великую Победу”, літаратурна-патрыятычная гадзіна “Я расскажу вам про войну...” і іншыя. Дню Перамогі былі прысвечаны цыклы гучных чытанняў “Читаем книги о войне”, па выніках якіх дзеці ў малюнках адлюстроўвалі свае ўяўленні

аб мірным жыцці, перадавалі пачуцці ад прачытаных твораў, ствараючы “Книгу Мира”.

Акцэнтаваць увагу юных чытачоў на гераічных старонках нашай гісторыі, баявых подзвігах землякоў дапамагалі героіка-патрыятычныя акцыі, мітынгі-рэквіемы, дні салдацкай славы.

Любанская цэнтральная дзіцячая бібліятэка прымала ўдзел у раённым бібліятэчным праекце “70-годдзю Перамогі – 70 патрыятычных спраў”, у якім заняла другое месца. У бібліятэцы праходзіла акцыя-конкурс “Прачытай кнігу аб вайне”, праводзілася анкетаванне “Аб вайне мы даведаліся з кніг”, конкурс малюнкаў “Я толькі чуў аб вайне…”, адбылася прэзентацыя па кнізе “Ніколі не забудзем”, мультымедыйная прэзентацыя “Дзеці вайны” і інш.

Бібліятэкі Барысаўскага раёна ўдзельнічалі ў рэалізацыі рэгіянальнага праекта “И память подвига нам книга оживляет”. У бібліятэках рэгіёна адбылася акцыя “Улицы нашей Победы”, прайшла дэкада воінскай славы “Помним! Гордимся! Спасибо за Победу”. Юныя чытачы прымалі ўдзел у гадзінах памяці, гісторы і мужнасці, літаратурна-музычных вечарах.

Для юных чытачоў Мядзельшчыны праведзены тыдзень ваеннай кнігі з выставай-праглядам “Мужнасці вечны агонь”, урокам мужнасці “Маленькія гісторыі пра вялікую вайну”, гадзінай патрыятычнай кнігі “Старонкі гэтых кніг – гісторыя вайны”, вусным часопісам “Дзеці і вайна”.

Перамозе савецкага народа над нямецка-фашысцкімі захопнікамі былі прысвечаны шматлікія мерапрыемствы ва ўсіх бібліятэках вобласці. Арганізоўваліся сустрэчы юных наведвальнікаў бібліятэк з ветэранамі і ўдзельнікамі ВАВ.

Урокамі сапраўднага патрыятызму сталі мерапрыемствы, прысвечаныя Дню памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, на якія ў бібліятэкі Міншчыны запрашалі ўдзельнікаў вайны ў Афганістане.

Героіка-патрыятычная тэматыка знайшла адлюстраванне ў мерапрыемствах Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі.

Справаздачны Год моладзі ў Беларусі актывізаваў бібліятэчную работу ў напрамку грамадзянскага выхавання

падрастаючага пакалення. Амаль ва ўсіх дзіцячых бібліятэках былі арганізаваны кніжныя выставы “2015 год – Год моладзі ў Беларусі”, “Моладзевая ростань”, “Моладзевая планета”, "Молодёжная орбита", “Моладзь – будучае краіны Беларусь”, “От нас с тобой зависит – в какой стране мы будем жить!” , “Молодёжь Беларуси сегодня”, "Будущее создавать молодым", “Што чытаць маладым?”, “Свет моладзі: цікава аб розным”. Праводзіліся вусныя часопісы, дні маладзёжнай перыёдыкі, гутаркі-дыялогі і інш.

На працягу года супрацоўнікі імкнуліся фарміраваць у вучняў цікавасць да сімвалаў нашай Радзімы. Для дзяцей і падлеткаў афармляліся кніжныя выставы і адкрытыя прагляды да Дня Незалежнасці РБ, да Дня Дзяржаўнага герба і сцяга РБ, Дня Канстытуцыі, дня выбараў Прэзідэнта Беларусі. Ладзіліся гутаркі і інфармацыйныя імпрэзы “Усё аб выбарах” і "Я – грамадзянін Беларусі”, урокі патрыятызму “Сімволіка Беларусі”, гадзіны інфармацыі “У гэтых сімвалах – гонар і слава”, урокі дзяржаўнасці “Дзяржаўныя сімвалы РБ”, краязнаўчыя відэавандроўкі “Мая Радзіма – Беларусь”, відэапрагляды “Герб і сцяг РБ” і інш.

Бібліятэкі вобласці праводзяць работу, накіраваную на павышэнне ўзроўню прававой культуры школьнікаў. Рэгулярна ўдакладняюцца спісы падлеткаў на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх, спісы праблемных у сацыяльным плане сямей. Пастаянна аказваецца маральная і псіхалагічная дапамога падлеткам, якія стаяць на ўнытрышкольным уліку і ў інспекцыі па справах непаўналетніх. З імі сістэматычна праводзяцца бібліятэрапеўтычныя гутаркі, гутаркі аб правах і абавязках, аб асновах бяспекі жыццядзейнасці падлеткаў. Падлеткаў запрашаюць на сустрэчы з раённымі інспектарамі па справах непаўналетніх, прыцягваюць да заняткаў у клубах і гуртках. Работа здзяйсняецца ў цесным кантакце з настаўнікамі школ (дзе вучацца гэтыя дзеці) і школьнымі бібліятэкарамі.

З дапамогай мультымедыйных прэзентацый бібліятэкі знаёмяць сваіх юных карыстальнікаў з дзіцячым прававым сайтам. Афармляюцца кніжныя выставы “По лабиринтам

права”, “Дети в мире прав”, “Закон паважаць і разумець”, “Кожнае дзіця мае права”,“Твои права”, “Па гэтых законах табе жыць”, “Правовая неотложка” і інш. Праводзяцца дні, ўрокі і гадзіны прававых ведаў, літаратурна-прававыя віктарыны, інфармацыйныя гадзіны і інфарм-дасье, гульні-расследаванні, адкрытыя дыялогі і інш., пасродкам якіх бібліятэкары знаёмяць аўдыторыю з правамі дзяцей у краіне і свеце, інфармуюць аб адказнасці за правапарушэнні.

З мэтай павышэння прававой культуры дзяцей і падлеткаў, аказання дапамогі ў атрыманні інфармацыі, у пераадоленні цяжкасцей падлеткавага ўзросту, арыентацыі на здаровы лад жыцця, прапаганды літаратуры па правах і абавязках дзяцей і падлеткаў у Валожынскай ДБ арганізаваны інфармацыйна-адукацыйны цэнтр для дзяцей і падлеткаў “У свеце падлетка”. У бібліятэцы вядзецца картатэка “Банк сацыяльнай інфармацыі па праблемах дзяцінства”, дзе сабрана інфармацыя аб культурных і навучальных установах, установах, дзе аказваецца псіхалагічная, юрыдычная і медыцынская дапамога дзецям, падлеткам і бацькам.

У Салігорскай дзіцячай бібліятэцы арганізаваны інфармацыйна-адукацыйны куток “Мир подростка”, у Бярэзінскай дзейнічае інфармацыйна-прававы цэнтр “Ведай свае правы змалку” з матэрыяламі аб правах дзяцей і ахове дзяцінства, па прафарыентацыі, пра шкодныя звычкі і іх наступствы.

У Капыльскай ДБ працуе цэнтр прававой інфармацыі, дзе кожны жадаючы можа атрымаць неабходныя веды прававой тэматыкі.

Да Міжнароднага дня правоў дзіцяці ў Лагойскай ДБ была праведзена прававая відэаэкскурсія “Маленькія дзеці на вялікай планеце”, удзельнікі якой прынялі актыўны ўдзел у гульні “Дазваляецца – забараняецца” і віктарыне “Знаўцы права”.

“Чароўная сіла дабрыні” – пад такой назвай прайшоў дзень адчыненых дзвярэй для выхаванцаў дзіцячага дома

сямейнага тыпу ў дзіцячым аддзеле Слуцкай РЦБ, на якім адбылося прадстаўленне лялечнага тэатра “Бурацiна”.

У Салігорскім раёне бібліятэкі прынялі ўдзел у міжведамаснай прафілактычнай акцыі “Дружим с законом!”. У межах акцыі прайшлі наступныя мерапрыемствы: сустрэча з удзелам псіхолага псіханеўралагічнага дыспансера і ўрача Салігорскага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі “Сохрани себя для жизни”, адкрыты дыялог з участковым інспектарам Салігорскага РАУС “Закон в нашей жизни” (Старобінская гарпасялковая бібліятэка), гадзіна разважання з удзелам участковага інспектара Салігорскага РАУС “Не навреди себе и другим” (Краснаслабодская гарпасялковая экалагічная бібліятэка). На мерапрыемствы запрашаліся дзеці, якія знаходзяцца на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх.

Пры Бярэзінскай дзіцячай бібліятэцы цікава працуе клуб “Падлетак”, дзе вялікая ўвага надаецца прафілактыцы супрацьпраўных паводзін падлеткаў, прафілактыцы алкагольнай, нікацінавай і наркатычнай залежнасці.

У Клецкай ДБ прававым выхаваннем займаецца створаны пры дзіцячай бібліятэцы маральна-прававы клуб “Прававы эрудыт”.

Важным крокам у жыцці кожнага школьніка з’яўляеца выбар будучай прафесіі. Каб пазнаёміць карыстальнікаў з рознымі прафесіямі, дапамагчы ім у выбары навучальных установ, у многіх бібліятэках дзейнічаюць кніжныя выставы.

Адным з напрамкаў дзейнасці бібліятэк Нясвіжскага раёна з’яўляецца работа па прафарыентацыі дзяцей і падлеткаў. Праз выставы-парады, выставы-рэкамендацыі, гутаркі, трэнінгі, круглыя сталы, прэзентацыі кніг бібліятэкі дапамагаюць юным чытачам вызначыць свае здольнасці, магчымасці, інтарэсы і выбраць прафесію для душы.

Пры Валожынскай ДБ пастаянна дзейнічае цэнтр дадатковай інфармацыі “Выбар прафесіі – выбар лёсу”, афармляюцца папкі “Выбіраем прафесію“ з інфармацыяй аб прафесіях, запатрабаваных на рынку працы Валожынскага раёна. Традыцыйнымі для бібліятэк раёна сталі ўрокі

прафарыентацыі “Ад мары да выбару прафесіі”, псіхалагічныя практыкумы “Я ў свеце прафесій” і дні абітурыента.

У рамках літаратурна-музычнай гасцёўні “Натхненне” (Клецкая ДБ) прайшоў хіт-парад “Выбіраем прафесію”.

Значнае месца ў арганізацыі работы бібліятэк Міншчыны адведзена абслугоўванню сацыяльна неабароненых катэгорый насельніцтва, у тым ліку дзяцей. Дзіцячыя бібліятэкі рэгіёнаў працуюць у цесным кантакце з цэнтрамі карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, сацыяльнымі прытулкамі, органамі мясцовай улады, аховы здароўя, праводзяць маніторынгі сваёй зоны абслугоўвання, па выніках якіх маюць звесткі аб колькасці дзяцей-сірот, інвалідаў і пажылых людзей, аб дзецях-інвалідах, шматдзетных сем’ях, што дапамагае ўдасканальванню надомнага абслугоўвання гэтай катэгорыі карыстальнікаў. Ва ўсіх бібліятэках арганізоўваліся мерапрыемствы, прымеркаваныя да Дня інвалідаў і да Міжнароднага дня абароны дзяцей.

Праца з групай дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі вядзецца ў рамках сацыяльных праектаў “Клопат” (Бярэзінская ДБ), “Свет роўных магчымасцей” (Салігорская ДБ), “Вера. Надзея. Любоў” і “Асаблівае дзіця” (Слуцкая РЦБ) і інш.

Мар’інагорская дзіцячая бібліятэка (Пухавіцкі раён) працягвала супрацоўніцтва з “SOS – дзіцячая вёска”. 63 выхаванцы гэтай вёскі сталі карыстальнікамі абанемента, 41 – чытальнай залы. Дзеці прымалі актыўны ўдзел у рабоце летняга клуба “Том і Джэры” – адказвалі на пытанні віктарын, прыносілі малюнкі і сачыненні на конкурс.

Падчас летняга адпачынку на базе аддзела абслугоўвання дзіцячага чытача Дзяржынскай ЦРБ працаваў кансультацыйны пункт аддзялення сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі, дзе падлеткі мелі магчымасць атрымаць кансультацыю псіхолага і буклеты з рэкамендацыямі. Ім прапанавалася медыягадзіна “Твой камп’ютар і магчымасць гуляць у камп’ютарныя гульні”.

Творча працуе Салігорская дзіцячая бібліятэка паводле праекта “Свет роўных магчымасцей”. Гэты культурна-адукацыйны праект накіраваны на забеспячэнне дзецям з

абмежаванымі магчымасцямі і іх бацькам адкрытага доступу да інфармацыі праз інфармацыйна-бібліятэчнае абслугоўванне. Для дзяцей праводзяць спецыяльныя мерапрыемствы: пальчыкавыя гульні “Два кота”, казачны кактэйль “Пером волшебным он взмахнёт и в мир чудес вас окунёт”, гульні-вандроўкі “Мультяшная страна” і інш.

Дзеці і падлеткі, выхаванцы ДУА “Сацыяльна-педагагічны цэнтр Салігорскага раёна, апынуліся ў цяжкім становішчы. Сям’я не стварыла ім належных умоў жыцця, і таму дзецям патрабуецца асаблівая ўвага, цяпло і клопат. Бібліятэкары наведваюць выхаванцаў цэнтра, прыносяць ім часопісы і ладзяць мерапрыемствы: крыжаваную палітру “Соберитесь, не ленитесь, над кроссвордом потрудитесь”, гадзіну загадак “Отгадайте-ка, ребятки, про зверей и птиц загадки”, прэс-турнір “По страницам детских журналов”, літаратурнае бюро знаходак “Герои добрых книг спешат на встречу с вами”, прэзентацыю“Осень-чародейка”.

Валожынская дзіцячая бібліятэка працягвала супрацоўніцтва з раённым сацыяльным прытулкам і раённым цэнтрам карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі дзяцей–інвалідаў. Для дзяцей з сацыяльнага прытулку праводзіліся экскурсіі па бібліятэцы “Место встречи – страна чудес”, агляды перыядычных выданняў “Што прынёс нам паштальён”, прагляды літаратуры “У краіне незвычайных кніг”. Выхаванцы – пастаянныя наведвальнікі чытальнай залы “Малышок”, тут яны з цікавасцю бавяць час: знаёмяцца з новымі кнігамі і часопісамі, малююць, складаюць пазлы. Члены бібліятэчнага лялечнага гуртка “Сонейка” неаднойчы пабывалі ў сацыяльным прытулку. Для выхаванцаў раённага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі дзяцей-інвалідаў падрыхтавалі гульнёва-пазнавальную гадзіну “С добрым сердцем и открытой душой”, дзеці здолелі наведаць бібліятэку, дзе ім былі прапанаваны экскурсія, віктарыны, выступленне лялечнага гуртка. У Дзень інвалідаў члены лялечнага гуртка “Сонейка” і літаратурнага клуба “Кругагляд” пабывалі ў сацыяльным прытулку і цэнтры карэкцыйна-

развіваючага навучання і рэабілітацыі з забаўляльнай праграмай “Дзеці – дзецям”. У пераднавагоднія дні для дзяцей з прытулку была падрыхтавана гульня-віктарына “Як свет сустракае Новы год”.

У Бярэзінскай ДБ рэалізоўваецца мэтавая праграма “Клопат” па падтрымцы дзяцей з фізічнымі абмежаваннямі. У межах праграмы ажыццяўляецца супрацоўніцтва з групай дзіцячага садка № 3 для дзяцей з асаблівасцямі развіцця, для якіх ладзяцца разнастаныя мерапрыемствы, выступленні лялечнага гуртка “Пятрушка”. Цікава была арганізавана дабрачынная акцыя для дзяцей-інвалідаў да Міжнароднага дня аховы дзяцей “Нашы сэрцы – хворым дзецям ” і забаўляльная праграма “Дзяцінству сонца падарыце”.

У рамках праграмы “Асаблівае дзіця” ў дзіцячым аддзеле Слуцкай ЦРБ адбыліся: лялечная вандроўка “Сузор’е казак Андэрсена”, казачна–загадкавы марафон “Сонечны зайчык кніжнага лета”, віртуальны фітачасопіс “Лясная аптэка на службе чалавека”, забаўляльная праграма “Восеньская прагулка Кнігавічка”.

У справаздачным годзе пытанні дапамогі ў сямейным выхаванні і арганізацыі сямейнага адпачынку заставаліся ў цэнтры ўвагі дзіцячых бібліятэк Міншчыны. І гэта зразумела, бо менавіта ў сям’і падрастае і выхоўваецца пакаленне, якому належыць заўтрашні дзень, а значыць – ад яго залежыць будучыня нашага грамадства.

Хочацца адзначыць працу бібліятэк Мінскага раёна, у якіх назапашаны вялікі вопыт па сямейным выхаванні. Калектыў Мінскай РЦБ узнагароджаны падзякай Патрыяршага Экзарха і камплектам кніг за другое месца ў рэспубліканскім конкурсе “Бібліятэка – цэнтр духоўнай асветы і выхавання” ў намінацыі “Семья – наследница моральных и духовных ценностей”. Правядзенне конкурсаў “Лепшая шматдзетная сям’я”, дзён сямейнай кнігі “Кніжнае дрэва сям’і”, святаў да Дня маці стала для бібліятэк раёна традыцыйным.

Любанская ЦДБ актыўна вядзе сваю дзейнасць паводле праграмы “Дзеці. Сям’я. Кніга”. Да Міжнароднага жаночага дня

ў бібліятэцы цікава прайшла літаратурна-музычная праграма “Свята самых мілых дам – бабуль, сясцёр і мам”. У час навагодняга святкавання бібліятэкары прывіталі сваіх маленькіх чытачоў праграмай “Рэзідэнцыя Дзеда Мароза запрашае”.

З мэтай прыцягнення да чытання юных карыстальнікаў і іх бацькоў, павышэння рэйтынгу кнігі ўсе бібліятэкі Міншчыны прымалі ўдзел у рэспубліканскай акцыі “Сямейнае чытанне”.

Пры сённяшнім пашырэнні сацыяльных функцый бібліятэкі выкарыстоўваюць больш актыўныя формы ўзаемадзеяння з юным чытачом і яго сям’ёй праз кніжныя выставы, традыцыйныя сямейныя святы, бацькоўскія гадзіны, дні дабрыні, калейдаскопы сямейных гісторый, круглыя сталы. Праходзяць сустрэчы сяброў бібліятэкі, працуюць клубы сямейных зносін.

Асноўныя мерапрыемствы ладзіліся да Міжнароднага жаночага дня, Міжнароднага дня сям’і, Дня маці. Арганізоўваліся выставы “Шар зямны на далонях Маці”, “Искусство быть семьёй”, “Матчына сэрца – сонца”, “Маці, сонца, вясна”, “Для бабулі і матулі”, “Чытае мама, чытае тата, чытаю Я”,“Сустрэча з дзіцячай кнігай” і інш.

Актыўна працаваў клуб сямейнага чытання “Тата, мама і я – чытаючая сям’я” (Дзяржынская ЦРБ, дзіцячы аддзел), у рамках якога адбыўся шэраг цікавых і пазнавальных мерапрыемстваў: гадзіна пяшчоты “Вось яна якая, мамачка мая”; фестываль сямейнай творчасці “Добрых рук цудоўнае тварэнне”, вынікам якога стала галерэя малюнкаў, вырабаў з бісеру і прыродных матэрыялаў; дзень імянінніка, вечар сустрэчы пакаленняў; сямейны конкурс “Кніжны хіт сям’і”, на якім сям’я – ўдзельніца прадставіла свае любімыя кнігі і паказала добрае веданне дзіцячай літаратуры.

З вялікім задавальненнем дзеці і іх бацькі наведваюць сямейныя літаратурна-музычныя клубы “Імяніннік” пры Заастравецкай і Лазавіцкай сельскіх бібліятэках (Клецкі раён).

Падчас гадзіны дабрыні і павагі “Хто мацней любіць маму” ў Пухавіцкай ДБ была праведзена конкурсная праграма

“Ты ў мяне адзіная на свеце”. Дзеткі прымалі ўдзел у конкурсах, адказвалі на пытанні анкеты “Хто лепш ведае сваю матулю”.

Сярод наведвальнікаў бібліятэк Салігорскага раёна карысталіся поспехам святочныя праграмы да Дня сям’і “Сям’ю з’яднае мудрасць кніг” (Старобінская гарпасялковая бібліятэка), вячоркі ў фітабары “Под знаком дружбы и семьи” (Хорастаўская сельская экалагічная бібліятэка), свята чытацкіх задавальненняў “Любимые книги моей семьи” (Ананчыцкая сельская інтэграваная бібліятэка), літаратурная гульня “Дружная семья – богатая семья” (Крывіцкая сельская бібліятэка) і інш.

Заслугоўвае ўвагі праца аматарскага клуба “Шматдзетная сям’я” (Стаўбцоўская ДБ). Сярод удзельнікаў клуба карыстаюцца попытам кніжныя выставы “Прапануем дзецям і бацькам”, “Кінь мышку – вазьмі кніжку”, “Свет у нашых руках: пра правы чалавека”. У клубе арганізоўваліся сямейныя дні адпачынку, дні адчыненых дзвярэй, святы сям’і, інфармацыйныя гадзіны, агляды-конкурсы і іншае.

Чытанне дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту з’яўляецца важнай ступенню ў фарміраванні духоўна і інтэлектуальна развітай асобы, таму бібліятэкі прызваны да ўзмацненне работы па абуджэнні цікавасці дашкалят да чытання. Дзіцячыя бібліятэкі Мінршчыны годна спраўляюцца з пастаўленай задачай.

Бярэзінская ДБ у рамках праекта “Расцём з кнігай праводзіла экскурсіі” на базе дзіцячых садкоў “Па сцяжынках Чытай-горада” з літаратурна-тэатралізаваным прадстаўленнем “Гуси-лебеди” лялечнага гуртка “Пятрушка”, дні дашкольніка “Кропля за кропляй”, кніжныя дэсанты “Кніжка ў дзіцячым садку”, дні рэкламы кніг і часопісаў “Твая першая кніжка” і “Лепшыя сябры дзяцей – часопісы”, конкурсныя праграмы “Ты представь себе на миг, как бы жили мы без книг”, гульні-хвілінкі “С книгой по дорогам детства”і інш.

Школа “Зярнятка” (Дзяржынская ЦРБ, дзіцячы аддзел) працягвала праграму “Сёння – зярнятка, заўтра – раслінка”, у рамках якой для маленькіх праходзілі ўрокі майстэрства, урокі

жывой прыроды, урокі Феі Асцярожнасці, урокі праваслаўнай прамудрасці і іншыя.

“Дошколёнок-книголюб” – паводле гэтага праекта працуюць бібліятэкі Слуцкага раёна. Партнёрскае супрацоўніцтва ў рамках праекта з установамі дашкольнай адукацыі садзейнічае папулярызацыі сямейнага чытання і пашырэнню творчых здольнасцяў дзяцей. У дашкольных установах раёна створаны куткі чытання, ладзяцца мерапрыемствы, рэкамендуюцца кнігі для прачытання, праводзяцца экскурсіі ў бібліятэку.

Уздзенская ДБ працягвала працу па далучэнні дашкольнікаў да чытання ў рамках праграмы “Я не чытач – я толькі вучуся”, якая ўключала правядзенне гадзін-загадак, літаратурных гульняў, гадзін ветлівасці, прэс–аглядаў.

Нясвіжская раённая дзіцячая бібліятэка распрацавала праект супрацоўніцтва з установамі дашкольнай адукацыі “Бібліякроха”.

Усяжская с/б (Смалявіцкі раён) працавала па праграме “Разам з казкай мы расцём”, распрацаванай з улікам асаблівасцей дзіцячай чытацкай аўдыторыі, наяўнасці дзіцячага садка і адсутнасці школы. Для дашкалят праводзіліся такія мерапрыемствы: прэзентацыя кніжнай выставы “Маё захапленне – казка”, літаратурны калейдаскоп “Цуда пачынаецца” па казках Г. К. Андэрсена, літаратурнае падарожжа “Свет ведаў адкрывае кніга” і інш. Дзякуючы праграме маленькія чытачы добра ведаюць, што такое бібліятэка, і становяцца надзейнымі сябрамі кніжкі.

Смалявіцкая ДБ адчыніла запрасіла наведвальнікаў дзіцячых садкоў да сюжэтна-ролевай гульн “Дзіўны кніжчын дом”, дзе дзяцей сустракалі Чырвоны Капялюшык і Кот у ботах.

Вядзецца пэўная работа па выяўленні і падтрымцы таленавітых дзяцей, стварэнні ўмоў для творчай самарэалізыцыі падрастаючай асобы. Праводзяцца раённыя агляды-конкурсы, выдаюцца зборнікі першых спроб пяра. Больш поўнаму раскрыццю здольнасцей юных творцаў спрыяюць злёты, творчыя конкурсы, выставы дзіцячых малюнкаў і самаробак.

Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка падрыхтавала сваіх маладых аўтараў да ўдзелу у IX абласным злёце маладых паэтаў Міншчыны «Слова Купалы да творчасці кліча».

Вельмі цікавая работа па эстэтычным выхаванні дзіцячага чытача арганізавана ў бібліятэцы “Верасок”(г. Маладзечна). На працягу года праводзіліся мерапрыемствы цыклу “Сонечны прамень творчасці”. У бібліятэцы адбыўся чарговы злёт юных талентаў Маладзечаншчыны "Чароўны свет дзяцінства", прысвечаны 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

У дзіцячым аддзеле Дзяржынскай ЦРБ працавала школа літаратурнага развіцця “Я расту”.

Шмат увагі развіццю творчых здольнасцей дзяцей надае аматарскае аб’яднанне юных паэтаў “Першацвет”, якое створана пры Старадарожскай ДБ.

У Смалявіцкай ДБ працуе гурток выхаднога дня “Сонейка”, на занятках якога дзеці майструюць самаробкі, сачыняюць байкі, малююць.

У Мядзельскай ДБ дзейнічае кніжная выстава “Ад кніг – да творчасці”, на якой прадстаўлены кнігі па дэкарытаўна-прыкладной творчасці, вышыўка, вырабы з бісеру, саломкі, прыродных матэрыялаў, паперы, створаныя чытачамі. Працавала творчая майстэрня “Волшебство новогоднего праздника”, дзе бібліятэкары разам з дзецьмі рабілі ўпрыгожванні для навагодняга афармлення бібліятэкі, праводзяцца майстар-класы па вырабу віншавальных паштовак у розных тэхніках дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: папяровай аплікацыі (айрыс фолдынг і квілінг), выцінанкі і арыгамі. Усе дзіцячыя работы былі прадстаўлены на выставе “Паштоўкі для мамы”, “Пазычу колеры ў вясёлкі” (да Дня маці). На выставе “Свет маіх захапленняў” была прадстаўлена творчасць наведвальнікаў аддзялення дзённага знаходжання людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

У Нясвіжскім раёне стала традыцыяй арганізоўваць да Міжнароднага дня абароны дзяцей святочнае адкрыццё выставы

дзіцячых работ ізастудыі “Радуга” Нясвіжскага цэнтра пазашкольнай работы. На свята “Свет вачыма дзяцей” штогод збіраюцца маленькія мастакі, іх бацькі, бабулі і дзядулі. Штогод ладзіцца выстава работ навучэнцаў мастацкага класа Нясвіжскай ДШМ. Сёлета на выставе былі лепшыя творы – пераможцы міжрэгіянальнага пленэра, які праходзіў раёне.

Прэзентацыя творчых работ удзельнікаў аб’яднання па інтарэсах “Весёлая кисточка” пад назвай “Чароўнае канфеці” адбылося ў дзіцячым аддзеле Слуцкай РЦБ. Юных мастакоў вітала паэтка Г. Міклашэвіч.

У рамках клуба “Семейка” пры Капыльскай дзіцячай бібліятэцы амаль месяц дзейнічала персанальная выстава модульнага арыгамі “Сказка из бумажного листа” пастаяннай чытачкі Валянціны Мяцельскай.

Адным з важных напрамкаў дзейнасці дзіцячых бібліятэк раёна застаецца адраджэнне духоўнасці. Ва ўсіх бібліятэках праходзяць тыдні праваслаўнай кнігі, праваслаўныя чытанні, гадзіны цікавых размоў “Дзіцячая Біблія”, урокі духоўнасці “О святом и вечном”, прэзентацыі кніг для дзяцей выдавецтва Экзархата “Свет под книжной обложкой”, ладзяцца лялечныя спектаклі па біблейскіх матывах, агляды–знаёмствы з кнігамі Б. Ганагі “Навстречу детским сердцам”.

Юныя наведвальнікі цікавяцца кнігамі, прадстаўленнымі на кніжных выставах “Дзецям аб веры” (Бярэзінская ДБ), “Свет и сила духовного слова” (Салігорская ДБ), “На шляху да духоўнасці” (Стаўбцоўская ДБ) і іншыя, якія насычаны цікавымі фактамі пра кананізаваных святых, пра праваслаўныя святы.

Адраджэнню і ўмацаванню хрысціанскіх духоўных каштоўнасцей, перадачы іх падрастаючаму пакаленню спрыяла сістэматычная і мэтанакіраваная работа клубаў па інтарэсах Слуцкага раёна. Па цікавай праграме пры Слуцкай гарадской дзіцячай бібліятэцы № 3 працуе клуб “Преображение”.

Усё больш бібліятэк наладзілі супрацоўніцтва з царквой. Жодзінская, Капыльская, Смалявіцкая, Бярэзінская, Салігорская, Мядзельская, Вілейская, Слуцкая, Лагойская дзіцячыя бібліятэкі сумесна са святарамі праводзяць урокі духоўна-маральнай

чысціні, гутаркі пра духоўныя традыцыі беларускага народа, якія суправаджаюцца паказам відэафільмаў на рэлігіныя тэмы.

Бібліятэкі Салігорскага раёна прынялі ўдзел у фестывалі праваслаўнай культуры «Кладзезь». З 2010 года Салігорская дзіцячая бібліятэка плённа працавала над рэалізацыяй праекта "Добрые книги." У межах праекта, які з'яўляўся адным са складнікаў фестывалю, у РДБ адбылася сустрэча з дзіцячым пісьменнікам А. Смятаніным "Путешествие на бумажном кораблике".

Заслугоўвае ўвагі дзейнасць Валожынскай дзіцячай бібліятэкі, дзе пастаянна працуе куток духоўнай літаратуры "Дарога да храма душы", а ў чытальнай зале "Малышок" – кніжныя паліцы "Вера. Любоў. Міласэрнасць" і "Чытанне для душы". У бібліятэцы адбыліся прагляды навінак і былі арганізаваны выставы духоўнай літаратуры "Дзецям аб веры", "Свет каляднай зоркі", "Сустракаем Каляды і Новы год", "Запаліце зоркі памяці і надзеі" (да Дня памяці продкаў) і інш.

Для больш якаснага задавальнення чытацкіх запытаў юных наведвальнікаў у Клецкай ДБ выдадзены буклеты "Святыні нашага краю", "Кладовые мудрости", "Десять заповедей Божьих".

Ухвальская сельская бібліятэка (Клецкі раён) распрацавала праграму па духоўнага выхавання на 2015–2018 гг. "На шляху да духоўнасці". У рамках праграмы былі арганізаваны кніжныя выставы "Дзецям аб праваслаўнай веры", "Да дабра праз кнігу", праведзены гутаркі, гадзіны духоўнасці, цыклы духоўных чытанняў.

У Смалявіцкай ДБ адбыўся Тыдзень праваслаўнай кнігі "Цяпло веры твайго сэрца".

Мядзельская ДБ падрыхтавала мультымедыйную прэзентацыю "Праваслаўная кніга для дзяцей". Насычаным і цікавым быў дзень праваслаўнай кнігі "Живое слово мудрости духовной", пытанні маралі асвятлялі ўрокі дабрыні "Дабрыня – гэта сонца" і "Душу исцелит добро", гутаркі па кнігах Б.Ганага "Что такое добро?", абмяркоўваліся кнігі з серыі "Чытанне для душы".

Плённа працуюць бібліятэкі па выхаванні экалагічнай культуры падрастаючага пакалення. Бібліятэкі актыўна ўключыліся ў раённыя, абласныя, рэспубліканскія мэтавыя праграмы па экалогіі, распрацоўвалі асабістыя праекты. Мэтанакіравана працуюць у экалагічнай асвеце дзіцячага насельніцтва Слуцкая, Жодзінская, Мядзельская, Капыльская, Салігорская, Вілейская, Валожынская, Нясвіжская, Лагойская, Дзяржынская, Маладзечанская, Смалявіцкая дзіцячыя бібліятэкі. Папулярныя ў бібліятэках клубы юных аматараў прыроды. Пашыраюцца сувязі з інспекцыямі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Праводзяцца месячнікі, тыдні, дні экалогіі, конкурсы знаўцаў прыроды, экападарожжы, экалагічныя сцяжынкі, гадзіны эказнаёмстваў, дні экалагічнай кнігі, фотапаляванні, экспедыцыі, дэсанты і іншае.

Бібліятэкі стварылі ў сваіх інтэр’ерах куткі прыроды і экалогіі, выкарыстоўваючы элементы фітадызайну.

Асабліва вылучаецца дзейнасць бібліятэк Салігорскага раёна. Добра працуе ў РДБ цэнтр экалагічнай асветы для дзяцей і падлеткаў, дзе сабраны фонд выданняў экалагічнай тэматыкі – энцыклапедычныя, даведачныя, навукова-папулярныя і мастацкія выданні. Афармлены кніжныя выставы “Как не любить нам эту Землю” і “Каждый в ответе за жизнь на планете”. Дзейнічае выстава дзіцячых вырабаў з прыроднага матэрыялу «Природы чудное приволье». У цэнтры працуе школа экалогіі «Есть одна планета – Сад…». Для маленькіх чытачоў праводзяцца цыклы мерапрыемстваў па экалогіі: экалагічныя ўрокі, віктарыны, пазнавальныя гадзіны,экалагічныя альманахі, гадзіны карыснай інфармацыі, заавандроўкі, экамаршруты і інш. Пры цэнтры экалагічнай асветы для малодшых школьнікаў створаны гурток «Лесовичок».

Добрыя набыткі ў эколага-асветніцкай рабоце з вучнямі маюць бібліятэкі, якім нададзены статус экалагічных. Ва ўсіх бібліятэках аформлены кніжныя выставы і тэматычныя паліцы па экалогіі. Неардынарна арганізавана кніжная выстава “Кошык літаратурных прысмакаў” у Хорастаўскай сельскай экалагічнай

бібліятэцы, якая надоўга запомніцца юным чытачам сваімі падраздзеламі, аформленымі “пад бульбу” – “Фантыстыка і прыгоды”, “пад гарбуз” – “Казачны свет”, “пад моркву” – “Мелодыя вершаў”, “пад бурак” – “Родная прырода”, “пад капусту” – “Для вас, эрудыты!”, “пад цыбулю” – “Вясёлыя старонкі”. У бібліятэцы арганізаваны фітабар «Зёлкі з кніжнай скарбонкі», у якім ладзяцца цікавыя мерапрыемствы для дзяцей: паэтычныя хвілінкі «Зіма блукае ў адзіноце», гучныя чытанні «Весна торопится», урок экалагічнага выхавання «Земля не должна пустовать», экалагічная экспедыцыя «Я иду по лесу», пазнавальна-забаўляльная праграма «Лесная аптека на службе человека».

Крупская сельская бібліятэка (Крупскі раён) працавала па рэалізацыі доўгатэрміновай мэтавай рэгіянальнай праграмы “Любіць і аберагаць непаўторнае хараство”. Пры бібліятэцы для дзяцей ёсць гурток “Лесавічок”, які праводзіў экалагічныя падарожжы, віктарыны, літаратурна-экалагічныя турнэ і інш.

По мэтавай экалагічнай праграме “Экалогія пачынаецца з душы” працавала Заастравецкая сельская бібліятэка (Клецкі раён), якая была неаднаразовай ўдзельніцай конкурсаў па экалагічнай адукацыі і асвеце насельніцтва. Экалагічнае выхаванне ў бібліятэцы пачынаецца ўжо з інтэр’ера, дзе аформлены зялёныя зоны, якія ствараюць станоўчы эмацыянальны настрой і камфортныя ўмовы, фарміруюць эстэтычны густ чытачоў. Асаблівую ўвагу чытачоў-дзяцей прыцягвае арыгінальная экалагічная хатка, у афармленні якой удала спалучыліся інфармацыйна-асветніцкія матэрыялы і вырабы з прыроднага матэрыялу. Большую частку экалагічнага кутка складаюць самаробкі, створаныя дзецьмі. У кутку змешчаны экалагічны гімн, тэматычныя папкі газетна-часопісных публікацый, матэрыялы аб рабоце літаратурна-экалагічнага клуба “Фларыда”.

Рэалізацыя праграмы “Наш экадом – Мядзельшчына” садзейнічала папулярызацыі экалагічных ведаў сярод школьнікаў Мядзельшчыны. Раённая дзіцячая бібліятэка

выпісвае 11 часопісаў на экалагічную тэматыку для чытачоў рознага ўзросту.

Праграма “Экалогія і бібліятэка” Смалявіцкай ДБ сваёй мэтай лічыць навучанне юнага пакалення жыццю ў згодзе з прыродай, разуменню прыродных з’яў і гуманнаму стаўленню да акаляючага свету. У рамках праграмы праходзілі мультымедыйныя прэзентацыі, экалагічныя вечарыны, агляды, падарожжы, гульні.

Экалагічная адукацыя пры дапамозе кнігі – адзін з галоўных напрамкаў работы Нясвіжскай дзіцячай бібліятэкі. Для юных наведвальнікаў адбыўся шэраг мерапрыемстваў экалагічнай накіраванасці: экаабардаж “Живи, сверяя каждый шаг с природой”, экалагічны круіз-гульня “Сохраним планету эту, у нас другой на свете нету”, інфарм-дайджэст “Птушкі робяць наш свет прыгажэйшым”, літаратурна-экалагічная медыягадзіна “Хит-парад удивительных животных” і інш.

Да Сусветнага дня аховы навакольнага асяроддзя ў бібліятэках Старадарожскага раёна быў прымеркаваны тыдзень экалагічных ведаў “Мир природы открывает книга”, які ўключаў змястоўныя і цікавыя мерапрыемствы ў выглядзе экалагічных гадзін, прагулак, дзён экалагічнай кнігі, круглыя сталы.

Наведвальнікаў Капыльскай дзіцячай бібліятэкі парадавала “гаманкая” выстава “Сава – птушка 2015 года”, якая чакала дзяцей у дзень жывёл і птушак падчас правядзення Тыдня дзіцячай кнігі. Выстава расказвала аб атрадзе савападобных, на стэндах размяшчалася інфармацыя пра гэтых прыгожых птушак, якія з’яўляюцца сімвалам мудрасці і ведаў. Побач – фігуркі мудрай птушкі, выкананыя з розных матэрыялаў, сярод іх сава, якая сядзіць на стосе кніг, – вядомы сімвал бібліятэк. Прываблівалі чытачоў часопісы і кнігі з творамі, дзе совы – галоўныя героі.

Выязная выстава жывёл з прэзентацыяй Мінскага заапарка была арганізавана для дзяцей Мінскага раёна ў бібліятэцы аграгарадка Гатава. Дзеці праслухалі інфармацыю аб сталічным заапарку, яго насельніках, з цікавасцю назіралі

за звычайным вожыкам, стэпавай чарапахай, хамяком, пацукамі і мышамі

Пры Гародзькаўскай сельскай бібліятэцы (Валожынскі раён) працуе экалагічны клуб "Рамонак", усе мерапрыемствы, сцэнарыі па экалогіі складаюцца і праводзяцца на мясцовым матэрыяле. У рамках клуба прайшло экалагічнае свята "Зямля ў нас адна", ўдзельнікі якога даведаліся шмат цікавага пра нашу планету, пра радзіму Беларусь, яе прыроду. Змястоўнымі атрымаліся экалагічныя вандроўкі "Тайны зялёнай крыніцы", "З павагай да ўсяго жывога" і інш. Бібліятэка ладзіла ў рамках клуба выставу работ з прыроднага матэрыялу "Прырода і фантазія", прайшоў турнір знаўцаў "Што ў лесе расце, хто у лесе жыве".

Да Дня Чарнобыльскай трагедыі ў бібліятэках афармляліся кніжныя выставы і адкрытыя прагляды, праходзілі дні-напаміны, гадзіны памяці, літаратурныя гадзіны, прагляды відэастужак і інш.

Разнастайна і вынаходліва будуюць бібліятэкі Міншчыны сваю працу з дзецьмі ў час іх летняга адпачынку. Традыцыйна да Дня абароны дзяцей ва ўсіх бібліятэках праводзяцца масавыя мерапрыемствы, якімі бібліятэкі пачынаюць летнія канікулы: забаўляльна-гульнёвыя праграмы, конкурсы малюнкаў на асфальце, гульні-вандроўкі і інш.

Зрабіць адпачынак школьнікаў больш актыўным і карысным дапамагаюць летнія праграмы чытання "С книгой в летнем рюкзаке" (Салігорская ДБ), "Лето и книга"(г. Жодзіна), "Па кніжных сцяжынках нашага лета" (Пухавіцкая РДБ),"Лета не для суму" (Любанская ДБ),"Летняе сонца на кніжнай старонцы" (Дзяржынская ЦРБ, дзіцячы аддзел), "Лета з добрай кнігай" (Бярэзінская ДБ, Валожынская ДБ), "Улетку адпачывай, але чытаць не забывай" (Лагойская ДБ), "Наше лето книгами согрето" (Клецкая ДБ), "Лета. Кніга. Бібліятэка" (Уздзенская ДБ), "Познай мир вместе с книгой" (Старадарожская ДБ), "Лето с книгой в рюкзаке"(Мядзельская ДБ), "Кніжная эстафета сонечнага лета" (Вілейскі раён), "Лето, полное книжных

чудес”(Нясвіжская ДБ), “Книга в летнем рюкзаке” (Капыльская ДБ) і інш.

Усе праграмы скіраваны на падтрымку чытацкай культуры дзяцей і падлеткаў, стымуляванне дзіцячага чытання.

Пазнавальныя гадзіны, урокі бяспекі, відэакруізы, літаратурныя падарожжы, конкурсы на лепшых знаўцаў казак, віктарыны і іншыя мерапрыемствы прыцягваюць юных карыстальнікаў у дзіцячыя бібліятэкі Мінскай вобласці як месца чытання і цікавых зносін.

Да рэспубліканскай акцыі “Лета з добрай кнігай” далучыліся ўсе бібліятэкі Салігорскага раёна, якія абслугоўваюць дзяцей і падлеткаў. Распачалася акцыя тэатралізаваным святам “Библиоступеньки .У нашего крыльца нет забавам конца”, якое наладзіла РДБ для хлопчыкаў і дзяўчынак школьных аздараўленчых лагераў і маленькіх жыхароў горада. Бібліятэкары запрасілі ўсіх жадаючых далучыцца да акцыі. Дзіцячая бібліятэка на час летніх канікул ператварылася ў творчую пляцоўку, дзе ладзіліся цікавыя мерапрыемствы.

На адкрыццё летніх чытанняў у Мінскім раёне завіталі пісьменнікі М.Пазнякоў і А.Зэкаў, а таксама супрацоўнікі выдавецтва “Народная асвета”.

Юныя наведвальнікі Лагойскай ДБ улетку сустрэліся з дзіцячымі пісьменнікамі В.Ляскоўскім і А.Мальчэўскай.

У Валожынскай ДБ акцыя “Лета з добрай кнігай” пачалася святам кнігі “Пад ветразем кнігі да новых адкрыццяў”. Да дзяцей завіталі пісьменнікі С.Быкава, І.Карнаухава, Г.Аўласенка, В.Гіруць-Русакевіч, удзельнікі літаратурнага клуба “Кругагляд” прачыталі вершы гасцей. Цікава і захапляюча прайшоў у гульнёвай форме бібліятэчны квэст “Я с книгой открываю мир”. Заданні былі разнастайныя, усе пытанні былі накіраваны на развіццё логікі і інтэлекта.

У час летніх канікул у гарадской бібліятэцы № 2 г. Барысава адчынілася бібліякафе “Когда писатель сам рисует книжки”, прысвечанае творчасці пісьменніка і мастака У.Суцеева.

У Бярэзінскай дзіцячай бібліятэцы на працягу лета праходзіў конкурс на лепшага чытача “Кніжная вясёлка лета”.

Для юных дзяржынцаў у летні час пры бібліятэцы працавала творчая майстэрня. Гэта спрыяла абуджэнню творчай актыўнасці дзяцей.

У рамках праграммы летняга чытання ў Людвіноўскай інтэграванай с/б (Вілейскі раён) было створана рэкламнае “Дрэва кнігачыта”: на лістках імправізаванага дрэва запісваліся водгукі аб прачытаных кнігах або пажаданні героям кніг.

У Быстрыцкай сельскай бібліятэцы (Капыльскі раён) нарадзілася ідэя выставы “Кнігі з банцікамі для дзяўчынак і кнігі ў кепачках для хлопчыкаў”. У бібліятэцы прайшлі бібліятэчныя гадзіны з рэкламай кніг “Я раю прачытаць”, тэатралізаванае адкрыццё дзіцячай пляцоўкі “Мы, лета і кніга”, літаратурныя гульні “Каб было цікава і табе, і мне, і ўсім”.

Папулярызацыя здаровага ладу жыцця застаецца сярод прыярытэтных напрамкаў работы дзіцячых бібліятэк Міншчыны. Свае намаганні ў прывіцці дзецям і падлеткам сур’ёзнага стаўлення да ўласнага здароўя бібліятэкары аб’ядноўваюць з настаўнікамі, урачамі, бацькамі. Ва ўсіх бібліятэках афармляюцца куткі здароўя, кніжныя выставы, адкрытыя прагляды літаратуры, тэматычныя паліцы, якія заклікаюць да здаровага жыцця.

Матэрыял з перыядычных выданняў адлюстроўваецца ў папках–дасье “Захавай сваё здароўе”, “Шкодныя звычкі – ворагі здароўя”, “Наркотыкі – праблема грамадства”. Выпускаюцца інфармацыйныя напаміны, закладкі, буклеты, праводзяцца акцыі “Жыццё без наркотыкаў”, “Моладзь за здаровы лад жыцця”, “Стоп,спайс”, “Адмовімся ад шкодных звычак” і іншыя. Юныя чытачы ўдзельнічаюць у адкрытым мікрафоне, тэматычных дыскатэках, маральных дыялогах, гадзінах ведаў, гадзінах прафілактыкі, уроках здароўя, шчырых гутарках, слайд-вандроўках, гадзінах праблемных пытанняў, інфарм-хвілінках.

Барысаўская ЦРБ імя І.Каладзеева ініцыявала рэгіянальны сацыякультурны праект “Чистому городу Борисову

– чистое слово!”. У рамках праекта адбыліся мерапрыемствы: гадзіны-спрэчкі “Сквернословие и его влияние на здоровье”, гадзіны моўнага этыкету “Есть слова пострашнее, чем порох” і “Доброе слово ворота открывает”, слайд-гутаркі “Чистота мысли и слова” і “Разговорчики в сети”, гутаркі аб маральнасці “Сквернословию – нет!”, гульні “Эстафета добрых слов” і інш.

У бібліятэках Мінскага раёна маюць сталую прапіску мерапрыемствы для дзяцей і падлеткаў, якія навучаюць правілам паводзін на прыродзе, на вуліцах і дарогах: гульня вандроўка “В городе дорожных наук”, гадзіна-папярэджванне “Вода не прощает ошибок”, актуальная гутарка“Лета і твая бяспека” і інш. Асноўныя веды, навыкі па ахове ўласнага здароўя чытачы-падлеткі Дзяржынскай ЦРБ атрымліваюць у майстэрні зносін “Стыль жыцця” , Салігорскай РДБ – у школе “Подросток: надежды и тревоги”.

Традыцыйным у вобласці стала правядзенне круглых сталоў з удзелам сацыяльных педагогаў школ, праваахоўных органаў, медыцынскіх спецыялістаў, псіхолагаў і запрошаных дзяцей, якія ўваходзяць у групу рызыкі. Пад няспыннай увагай бібліятэк прафілактыка такіх негатыўных з’яў, як курэнне, наркаманія, п’янства, СНІД, ужыванне спайсаў. Бібліятэкі Салігорскага раёна прымалі ўдзел у выкананні мэтавага праекта «Здаровы Я – здаровая краіна!» па прафілактыцы п'янства, наркаманіі, таксікаманіі, ВІЧ-інфекцыі і фарміраванні здаровага ладу жыцця сярод вучнёўскай моладзі на 2013-2015 гг. У бібліятэках праводзіліся наступныя мерапрыемствы: мультымедыйныя прэзентацыі «От иллюзии – к бездне» (РДБ) і «Стоп! Спайс!» (Хорастаўская сельская экалагічная бібліятэка), гадзіна шчырай размовы «Да здароўя – праз кнігу» (Старобінская гарпасялковая бібліятэка) і іншыя. У рамках рэспубліканскай інфармацыйна-адукацыйнай акцыі «Беларусь против табака» праводзіліся мерапрыемствы, накіраваныя на папярэджванне шкодных звычак у дзяцей і падлеткаў.

Пошук новых форм і метадаў работы ў арганізацыі абслугоўвання дзіцячага чытача не спыняецца. Раскрыццю творчага патэнцыялу дзіцячых бібліятэк спрыяў абласны

семінар “Папулярызацыя і падтрымка чытання дзяцей і падлеткаў у век інфармацыйных тэхналогій” (на базе ДУ “Мінская абласная бібліятэка імя А.С.Пушкіна” і Цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі імя М.Астроўскага г. Мінска), які надаў новы імпульс інавацыйнай бібліятэчнай дзейнасці .

## Камплектаванне і арганізацыя адзінага фонду

Бібліятэчны фонд публічных бібліятэк Мінскай вобласці на 01.01.2016 г. складае 6 7004 969 экз. За мінулы год, у параўнанні з 2014 г., ён паменшыўся на 344 363 экз.

У 2015 г. па-ранейшаму вялікая ўвага надавалася даручэнню Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па накіраванні на камплектаванне фондаў бібліятэк не менш 15 % грашовых сродкаў ад сумы бюджэтнага фінансавання на ўтрыманне дадзеных установаў. Усяго з бюджэту вобласці на камплектаванне фондаў выкарыстана 12 840,6 млн. руб., што складае 14,2 % ад бягучага фінансавання бібліятэк.

Асноўнай крыніцай фінансавання камплектавання бібліятэчных фондаў застаецца мясцовы бюджэт. Так у 2015 г. сістэме публічных бібліятэк Мінскага раёна на камплектаванне фонду (за выключэннем перыёдыкі) было выдзелена 703,8 млн. руб., Салігорскага раёна – 566,7 млн. руб., Барысаўскага раёна – 535,6 млн. руб; ад 298,4 млн. руб. да 206,5 млн. руб. атрымалі публічныя бібліятэкі Нясвіжскага, Любанскага, Маладзечанскага, Слуцкага, Пухавіцкага, Мядзельскага, Лагойскага раёнаў і г. Жодзіна; ад 184,1 да 153,3 млн. руб. асвоілі публічныя бібліятэкі Капыльскага, Уздзенскага, Дзяржынскага, Валожынскага, Клецкага раёнаў. У астатніх сістэмах публічных бібліятэках вобласці фінансаванне камплектавання з мясцовага бюджэту складала ад 93,0 да 10,8 млн.

Большая частка грашовых сродкаў бюджэтнага фінансавання, як і ў папярэднія гады, была накіравана на аплату падпіскі на перыядычныя выданні. Па вобласці ў цэлым гэтая лічба складае 7 803,2 млн. руб. Па-ранейшаму лідыруючыя

пазіцыі ўтрымліваюць Маладзечанскі і Салігорскі раёны, дзе на падпіску было выкарыстана 783,4 млн. руб., і 707,1 млн. руб. адпаведна. На падпіску для публічных бібліятэк Вілейскага, Дзяржынскага, Мінскага, Пухавіцкага раёнаў у 2015 годзе было выкарыстана ад 591,8 да 446,4 млн, руб.; для публічных бібліятэк Капыльскага, Нясвіжскага, Валожынскага, Стаўбцоўскага, Барысаўскага, Мядзельскага раёнаў выкарыстана ад 389,1 да 327,7 млн, руб.; для для публічных бібліятэк Клецкага, Смалявіцкага, Уздзенскага, Любанскага, Слуцкага, Лагойскага, Чэрвеньскага раёнаў і г. Жодзіна – ад 295,1 да 168,0 млн. руб. У астатніх раёнах сума падпіскі на перыядычныя выданні складала ад 96,1 да 65,5 млн. руб. Рэпертуар падпісных перыядычных выданняў, у бібліятэках вобласці ў сярэднім складае 145 назваў часопісаў і 35 назвы газет.

Паляпшэнню дзейнасці бібліятэк па прапагандзе беларускай кнігі, папулярызацыі новых дасягненняў у галіне навукі і культуры рэспублікі спрыяе паступленне ў бібліятэчныя фонды літаратуры, выдадзенай у рамках сацыяльна важнага дзяржаўнага заказу.

Так, у 2015 г. за сродкі з мясцовага бюджэту было набыта 110 назваў сацыяльна важных выданняў колькасцю 18 001 экз. на агульную суму 1 131,2 млн. рублёў. Акрамя таго, паступіла ў фонды публічных бібліятэк вобласці 7 223 экз. сацыяльна важных выданняў на суму 1 322,3 млн. руб. за сродкі з рэспубліканскага бюджэту. Усяго фонды бібліятэк вобласці папоўніліся на 25 245 экз. сацыяльна важных выданняў на агульную суму 2 521,1 млн. руб.

Найбольш шырокі пералік назваў сацыяльна важных выданняў, уключаных у тэматычны план выпуску, прадстаўлены ў публічных бібліятэках Мінскага (223 назваў, 2 785 экз.), Бярэзінскага (217 назваў, 1005 экз.), Слуцкага (215 назваў, 2 230 экз.) Барысаўскага (180 назваў, 1 905 экз.) раёнаў. У абмежаванай колькасці назваў і экзэмпляраў выданні паступілі ў сістэмы публічных бібліятэк Старадарожскага (68 назваў, 448

экз.), Чэрвеньскага (57 назваў, 348 экз.) і Вілейскага (46 назваў, 459 экз.) раёнаў.

Штогод бібліятэкі вобласці атрымліваюць кнігі праз "Белкнігу" за кошт рэспубліканскага бюджэту. У 2015 годзе з гэтай крыніцы фонды бібліятэк папоўніліся амаль на 8000 экз. дакументаў на суму 1 491,3 млн. рублёў.

За кошт падарункаў чытачоў і розных арганізацый кніжны фонд публічных бібліятэк таксама папоўніўся на 15 090 экз. на агульную суму 501,7 млн. руб.

За ўласныя прыбыткі публічнымі бібліятэкамі нашай вобласці было набыта 1 334 экз. дакументаў на агульную суму 97,1 млн. руб.

Так, па выніках 2015 г. з розных крыніц камплектавання ў фонды публічных бібліятэк вобласці паступіла 319,6 экз. дакументаў. Большасць новых паступленняў застаецца ў цэнтральных бібліятэках. Ва ўсіх сістэмах публічных бібліятэк вобласці адзін сельскі філіял (без уліку бібліятэк аграгарадкоў) атрымліваў у сярэднім каля 146 экз. кніг. Разам з тым адзін сельскі філіял сеткі публічных бібліятэк Слуцкага раёна ў сярэднім атрымаў 385 экз. кніг, а ў Вілейскім, Нясвіжскім і Старадарожскім раёнах – ад 20 да 137 экз. Рэпертуар перыядычных выданняў па вобласці ў сярэднім складае 15 назваў часопісаў і 8 назваў газет. Самую вялікую колькасць перыёдыкі атрымлівалі сельскія бібліятэкі Дзяржынскага раёна – 55 назваў часопісаў і 24 назвы газет. Складанае становішча ў сельскіх бібліятэках Старадарожскага раёна: тут у 2015 годзе паступала 5 назваў часопісаў і 3 назвы газет.

Па-ранейшаму вялікая ўвага надавалася камплектаванню бібліятэк аграгарадкоў. Так, у 2015 г. паступіла 142,3 тыс. экз. дакументаў, у т.л. кніг 56,6 тыс. экз. У сярэднім адна бібліятэка аграгарадка атрымала каля 187 экз. кніг, 21 назву часопісаў і 9 назваў газет.

У кожнай сістэме публічных бібліятэк распрацаваны планы мерапрыемстваў, накіраваных на захаванасць бібліятэчных фондаў. Сярод іх – праверкі наяўнасці каштоўных выданняў, ачыстка фондаў ад састарэлай, дублетнай,

няпрофільнай літаратуры, актыўная работа з даўжнікамі і г.д. Так у 2015 г. выключана 664,2 тыс. экз. дакументаў, у тым ліку кніг – 469,6 тыс. экз. (70,7 %) , перыядычных выданняў – 189,3 тыс. экз. (28,5 %), іншых дакументаў – 5,3 тыс. экз. (0,8 %). Дакументы выключаліся па наступных прычынах: зношаныя – 398,9 тыс.экз.(60,0 %), састарэлы змест – 38,9 тыс. экз. (5,9%), дублетныя, страчанныя і інш. – 41,1 тыс. экз. (6,2 %), заканчэнне тэрміну захоўвання – 185,3 тыс.экз. (27,9%).

Пытанні стану і выкарыстання фондаў рэгулярна абмяркоўваюцца на нарадах пры дырэктары, работа з фондам адлюстроўваецца ў планах работы і справаздачах бібліятэк.

## Інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне

Спецыфіка сучаснага даведачна-інфармацыйнага абслугоўвання чытачоў заключаецца ў арыентаванні агульнай працы бібліятэкі на задавальненне індывідуальных запытаў карыстальнікаў. Сённяшнія наведвальнікі бібліятэкі з'яўляюцца спажыўцамі, якія жадаюць атрымаць патрэбную і поўную інфармацыю хутка і якасна. І для таго, каб даведачна-інфармацыйнае абслугоўванне выконвалася на добрым прафесійным узроўні, неабходна пастаянна папаўняць і ўдасканальваць інфармацыйныя і даведачныя рэсурсы бібліятэкі.

Бібліяграфічная работа паступова праходзіць этапы аўтаматызацыі. Так, усё большая колькасць бібліятэк набывае праграму “Аліс”, якая дазваляе весці аналітычны роспіс у аўтаматызаваным рэжыме, а таксама аўтаматызавана ажыцяўляць абслугоўванне чытачоў. Бібліятэкі ствараюць уласныя сайты, праз якія прапагандуюць бібліяграфічныя веды (у 6 бібліятэках Старадарожскага раёна запушчаны свае сайты); ствараюць даведачныя службы пасродкам тэлефоннай сувязі або электроннай пошты (бібліятэкі Стаўбцоўскага раёна, Мінская абласная бібліятэка ім. А. С. Пушкіна), арганізуюць доступ да сеткі Інтэрнэт па тэхналогіі Wi-Fi (бібліятэкі Капыльскага

раёна); арганізуюць віртуальныя выставы (бібліятэкі Салігорскага раёна) і іншае.

Такім чынам, у бібліяграфічным абслугоўванні, як і ў большасці іншых напрамкаў дзейнасці бібліятэк, выкарыстоўваюцца навейшыя лічбавыя тэхналогіі, што дае выдатную магчымасць для якаснага выканання запатрабаваных сёння грамадствам функцый сучасных інфармацыйна-культурных установ.

У сувязі са зменамі ў дзяржаўна-грамадзкай будове нашай краіны, якія адбыліся напрыканцы мінулага стагоддзя, і ў выніку – у заканадаўчай базе рэспублікі, заўважаецца павышэнне запытаў насельніцтва на інфармацыю ў галіне юрыспрудэнцыі і права. Бібліятэкі ўзялі на сябе абавязак па забеспячэнні грамадзянам доступу да дакладнай, поўнай і аператыўнай прававой інфармацыі. З гэтай мэтай у планы дзейнасці прававых цэнтраў і адпаведных аддзелаў абласных бібліятэк уключаны: мерапрыемствы прававой тэматыкі (“Яднанне Беларусі і Расіі” – бібліятэкі Уздзенскага раёна; урокі прававых ведаў “Ведай свае правы, спажывец” – бібліятэкі Крупскага раёна; брэй-стромінгі “Ад права да права” – бібліятэкі Смалявіцкага раёна; “Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека” – бібліятэкі Пухавіцкага раёна, “Абарані сябе сам” – бібліятэкі Нясвіжскага раёна; спецыялізаваныя прававыя праграмы “Я – дзіця, я – чалавек, або Кніга мудрых парад” – бібліятэкі Чэрвеньскага раёна; гадзіны прававой інфармацыі “Твае правы, падлетак”, віктарыны “Прававая азбука для падлеткаў” (Бярэзінскі раён); прававыя лабірынты “Свае правы жадаю я ведаць” (Дзяржынскі раён).

Публічныя цэнтры прававой інфармацыі існуюць ужо практычна ў кожнай бібліятэцы раёнаў (бібліятэкі Мядзельскага раёна арганізавалі ПЦПІ у 4-х бібліятэках у 2015 г.).

Адзначым таксама, што працягваецца праца бібліятэк вобласці ў кансорцыўме “LibКард”. У 2015 г. інфармацыйна-бібліяграфічны аддзел Мінскай абласной бібліятэкі стаў рэкардсменам уводу і прыняцця артыкулаў СЭК.

Бібліятэкі актыўна фарміруюць бюлетэні новых паступленняў featured рознай тэматыкі, ствараюць новыя тэматычныя картатэкі, папкі-дасье (бібліятэкі Лагойскага, Пухавіцкага раёнаў і інш.) Хоць бібліятэкі і ідуць у правільным кірунку, існуе яшчэ праблема пераходу да сучаснага электроннага фармату ў арганізацыі працы. Напрыклад, не картатэкі і папкі, а базы дадзеных (можна пераняць вопыт бібліятэк Барысаўскага раёна).

Належнае месца займае выдавецкая дзейнасць бібліятэк. Варта адзначыць выдадзеныя бібліятэкамі Мінскага раёна анатаваныя бібліяграфічныя спісы літаратуры. У бібліятэках вобласці афармляюцца стэнды "Інфармацыйнае бібліятэчнае агенцтва" (Вілейскі раён). Праводзяцца бібліятэчныя і інфармацыйныя ўрокі – "Расстаноўка фонду ў бібліятэцы", "Кніга ці камп'ютар: за і супраць", "Даведачнае бюро бібліятэкі", "Якія таямніцы захоўваюць каталогі" ( Лагойскі, Крупскі, Слуцк і раёны); Рэгулярна ладзяцца тэматычныя выставы і выставы новых паступленняў кніг, бібліяграфічныя агляды "Бібліякактэйль" (бібліятэкі Любанскага, Уздзенскага, Мядзельскага, Валожынскага раёнаў); Бібліяграфічная дзейнасць бібліятэк прапагандуецца па радыё (Клецкі раён – 16 выступленняў бібліятэкараў).

Інфармацыйнае і даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне патрабуе высокай кваліфікацыі супрацоўнікаў, адпаведнай арганізацыі бібліятэчна-бібліяграфічных рэсурсаў і наяўнасці сучасных камп'ютарных тэхналогій. Спалучаючы створаныя для паўнавартаснага функцыянавання бібліятэк умовы і намаганні падрыхтаваных спецыялістаў, можна спадзявацца на паспяховую працу як асобных аддзелаў і сектараў, такі і бібліятэкі ў агульным.

## Метадычная дзейнасць

Дзейнасць аддзелаў бібліятэчнага маркетынгу цэнтральных бібліятэк вобласці ў 2015 годзе была накіравана на распрацоўку, вывучэнне і падтрымку сучасных перадавых напрамкаў у рабоце; павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў; умацаванне сувязей з грамадскасцю; стварэнне пазітыўнага іміджу бібліятэк.

У мінулым годзе бібліятэкі Мінскай вобласці актыўна працавалі над стварэннем і рэалізацыяй мэтавых комплексных праграм па вядучых напрамках дзейнасці: “На шляху да духоўнасці” 2015–2018 гг. (Крупскі раён), “Лета. Кніга. Бібліятэка” (Пухавіцкі раён), “Край мой родны – лёс мой вечны” (Стаўбцоўскі раён), “Моладзь Клеччыны” (Клецкі раён), “Любіць і аберагаць непаўторнае хараство” 2012–2015 гг. (Крупскі раён), “Дзеці. Сям’я. Кніга” 2011–2015 гг. (Старадарожскі раён), “Гартае сэрца ўспамін” 2014–2015 гг. (Мядзельскі раён), “Жыве народ пакуль жыве яго гістарычная памяць” (Вілейскі раён), “Будуем храм у душах” (Капыльскі раён), “Чытаем разам” 2008–2015 гг. (Слуцкі раён), “Зямля мая, святая і адзіная…” (Мінскі раён), “Лета, кніга, я – сябры” 2014–2015 гг. (г. Жодзіна), “Расцём з кнігай (далучэнне малодшых школьнікаў да чытання)” 2012–2015 гг. (Чэрвеньскі раён).

На працягу года публічнымі бібліятэкамі Мінскай вобласці вялася работа па стварэнні і рэалізацыі наступных доўгатэрміновых праектаў: “Беларускія канікулы ў вясковай бібліятэцы” (Салігорскі раён), выхаваўча-асветніцкі праект для моладзі “Дыскатэка – тэрыторыя выхавання і агітацыі” 2012–2016 гг. (Бярэзінскі раён), “Ішоў мой край дарогамі вайны” (Дзяржынскі раён), “Кніга – ключ да скарбаў мовы матчынай” 2013–2015 гг. (Лагойскі раён), “Літаратурнае сузор’е Пухавіччыны” (Пухавіцкі раён), “Чыстаму гораду Барысаву – чыстае слова” 2013–2015 гг. (Барысаўскі раён), “Школьны ўрок у бібліятэцы” (Мядзельскі раён), “Нефармальнае краязнаўства: мультымедыйная дзейнасць бібліятэкі” (Вілейскі раён), “Моладзь Беларусі не жыве ў скрусе” (Маладзечанскі раён),

“Слуцк – валошка ў вянку Беларусі” (Слуцкі раён), IDEA BOX” (“Вместилище идей») 2013–2015 гг. (Мінскі раён), “Чытаць – добра, а чытаць добрую літаратуру – яшчэ лепш” 2013–2015 гг. (г. Жодзіна), “Чытаем па-беларуску” 2012–2018 гг. (Чэрвеньскі раён), “Бібліятэчнае скрыжаванне” (Нясвіжскі раён).

Узровень прафесійнай падрыхтоўкі работнікаў вызначае якасць і эффектыўнасць усёй дзейнасці бібліятэк. З гэтай мэтай сістэматычна праводзяцца семінары, практыкумы, нарады, круглыя сталы, дні метадычнай дапамогі і інш. Так, у 2015 годзе былі праведзены семінары: “Бібліятэка – культурны і інфармацыйны цэнтр аграгарадка (на базе Скаўшынскай сельскай бібліятэкі Салігорскага раёна), “Памяць у спадчыну: кніга і чытанне ў сістэме патрыятычнага выхавання моладзі” (Крупскі раён), “Бібліятэчны дзень у маёй Беларусі” (на базе Мятлічыцкай сельскай бібліятэкі Лагойскага раёна), “Стратэгія развіцця сучасных бібліятэк у свеце, які змяняецца” (Барысаўскі раён), “Кніга і чытанне – важны сродак інтэгравання дзяцей і падлеткаў у сацыякультурным асяроддзі” (на базе Тучанскай сельскай бібліятэкі Клецкага раёна), “Фарміраванне грамадзянска-маральных арыенціраў у сучаснай моладзі” (Уздзенскі раён), “Бібліятэчная выстава – якой ёй быць” (Мядзельскі раён), “Гадуем патрыётаў: духоўнасць, веды, традыцыі” (Смалявіцкі раён), “Роль чытання ў фарміраванні культуры моладзі” (Маладзечанскі раён), “Сучасная моладзь у сучаснай бібліятэцы” (Слуцкі раён), “Патрыятычнае выхаванне як частка дзяржаўнай моладзевай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь і яго рэалізацыя ў публічных бібліятэках” (Мінскі раён), “Моладзь і бібліятэка” (Валожынскі раён); круглыя сталы: “Моладзевы фармат: моладзь у бібліятэчным асяроддзі” (Дзяржынскі раён), “Сацыяльнае партнёрства ў сучаснай бібліятэцы” (Стаўбцоўскі раён), “Масавая работа ў кантэксце сучасных праблем” (Крупскі раён), “Ініцыятыва і творчасць у рабоце з моладдзю” (Смалявіцкі раён), “Кніга і чытанне як духоўная спадчына праваслаўя ў культуры беларускага народа (Маладзечанскі раён), “Бібліятэка для моладзі: сучасная, цікавая, неабходная” (г. Жодзіна), “Яе вялікасць беларуская

кніга” (Чэрвеньскі раён); практыкумы: “Арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання ў раённай дзіцячай бібліятэцы” (Салігорскі раён), практыкум па асновах камп’ютарнай граматнасці бібліятэкараў “Камп’ютарная лесвіца” (Дзяржынскі раён), “Арганізацыя і рэдагаванне алфавітнага і сістэматычнага каталогаў” (Лагойскі раён), “Новыя тэхналогіі ў рабоце бібліятэк” (Мінскі раён), “Аўтаматызацыя бібліятэчных працэсаў” (Валожынскі раён) і інш.

Сярод іншых форм павышэння кваліфікацыі бібліятэчных кадраў – кансультацыі і метадычныя парады, школы метадыста і школы дырэктара, метадычныя саветы, канферэнцыі і інш.

Павышэнню прафесійнага майстэрства маладых супрацоўнікаў і супрацоўнікаў, якія не маюць спецыяльнай адукацыі, спрыяюць разнастайныя па тэматыцы заняткі, практыкумы, пасяджэнні ў “Школе пачынаючага бібліятэкара”, “Школе маладога бібліятэкара”, “Школе камп’ютарных ведаў”, “Школе маладога спецыяліста”, “Альтэрнатыўнай школе бібліятэкара”, на “Факультэце бібліятэчных ведаў”. Так, у 2015 годзе адбыліся: заняткі выязной школы прафмайстэрства “За вопытам – у сельскую бібліятэку” (Бярэзінскі раён), дзелавая гульня “Лесвіца поспеху” (Лагойскі раён), метадычная гадзіна “Прафесійнае чытанне бібліятэкараў” (Стаўбцоўскі раён), кансультацыя “Бібліятэка, кніга і летні адпачынак дзяцей і падлеткаў” (Клецкі раён), заняткі “Арганізацыя, вядзенне і рэдагаванне бібліятэчных каталогаў” (Крупскі раён), дзень спецыяліста “Методыка падрыхтоўкі бібліяграфічнага агляду літаратуры” (Старадарожскі раён), пасяджэнне “Новыя тэхналогіі ў рабоце з чытачамі” (Мядзельскі раён), дзень спецыяліста “Аматарскае аб’яднанне запрашае” (Смалявіцкі раён), школа маладога бібліятэкара “Інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне” (Слуцкі раён), кансультацыя “Аб рабоце з дзецьмі ў летні перыяд” (Чэрвеньскі раён) і інш.

З мэтай вывучэння інфармацыйных запатрабаванняў карыстальнікаў і ўдасканальвання іх абслугоўвання ў бібліятэках вобласці на працягу справаздачнага года праводзіліся сацыялагічныя і маркетынгавыя даследаванні,

анкетаванні і апытанні, аналіз бібліятэчнай дзейнасці: “Наша бібліятэка вачыма чытачоў” (Лагойскі раён), “Моладзевае чытанне: актуальныя праблемы і творчыя знаходкі” (Крупскі раён), “Моладзь і кніга” (Маладзечанскі раён).

Пазітыўны ўплыў на стан бібліятэчнай справы ў раёне аказвае выдавецкая дзейнасць. У дапамогу бібліятэкарам складаюцца метадычныя рэкамендацыі, парады і дапаможнікі, сцэнарыі да юбілеяў пісьменнікаў, рэкамендацыйныя спісы літаратуры і г.д. Так, у 2015 годзе былі выдадзены: рэкамендацыйны спіс сцэнарыяў масавых мерапрыемстваў “Жывое слова пра вайну” (Салігорскі раён), бібліяграфічны паказальнік “Лагойшчына: мінулае і сучаснае” (Лагойскі раён), зборнік фалькорных песень “Песні, ад якіх святлее душа” (Крупскі раён), “Пісьменнікі-землякі на франтах Вялікай Айчыннай” (Уздзенскі раён), “Шчырая і мужная песня паэта: да 110-годдзя з дня нараджэння П. Глебкі (Старадарожскі раён), інфармацыйнае выданне “Яны пісалі пра вайну” (Смалявіцкі раён), метадычныя рэкамендацыі “Калі ўзыходзіць сонца свабоды”: да 115-годдзя з дня нараджэння Сымона Баранавых (Маладзечанскі раён), інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне “Пісьменнік і грамадскі дзеяч: да 135-годдзя з дня нараджэння Язэпа Дылы” (Слуцкі раён), метадычныя рэкамендацыі “Вопыт бібліятэк у арганізацыі працэсу бібліятэрапіі” (Мінскі раён), буклет “Час чытаць: праграма мерапрыемстваў да Тыдня дзіцячай кнігі” (г. Жодзіна), спіс да 70-годдзя вызвалення Беларусі “Нашы землякі на франтах Вялікай Айчыннай вайны” (Чэрвеньскі раён), брашура “Памяці Міхаіла Сазончыка прысвячаецца…” (Нясвіжскі раён) і інш.

Пошуку новых форм і метадаў работы з чытачамі, стварэнню прыцягальнай атмасферы ў бібліятэках спрыяюць рэспубліканскія, абласныя і раённыя агляды-конкурсы па самых розных напрамках бібліятэчнай дзейнасці.

Станоўчую ролю ў стымуляванні работы бібліятэк адыгрывае штогодні рэспубліканскі конкурс “Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры”. Прызёрамі XXIII конкурсу сталі: Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева (1 месца ў намінацыі “За падтрымку і развіццё

чытання”); Дзяржынская цэнтральная раённая бібліятэка (1 месца ў намінацыі “За пошукавую і даследчую працу”).

Публічныя бібліятэкі Мінскай вобласці актыўна прымалі ўдзел у I Рэспубліканскім конкурсе «Библиотека – центр духовно-нравственного просвещения и воспитания». Амаль усе яны ўзнагароджаны граматамі Сінадальнага савета рэлігійнай адукацыі і катэхізацыі Беларускай Праваслаўнай Царквы.

У 2015 годзе былі арганізаваны і праведзены наступныя раённыя конкурсы: “Бібліятэка – нефармальнае аб’яднанне па інтарэсах” (Бярэзінскі раён), “Мая бібліятэка: ўчора і сёння” (Пухавіцкі раён), “Адкрыты свет ідэй для моладзі” (Мядзельскі раён), “І хай пакаленні памятаюць” – агляд-конкурс на лепшае афармленне выставы, на лепшы аўтарскі сцэнарый, прысвечаны 70-годдзю Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі (Нясвіжскі раён), “Гісторыі слаўнай вялікія даты” (Слуцкі раён), “Захаваем прыроду разам” (Мінскі раён).

2015 год быў аб’яўлены ў Рэспубліцы Беларусь Годам моладзі, таму прыярытэтнымі напрамкамі работы бібліятэк абралі інфармацыйна-асветніцкія, культурна-адукацыйныя праграмы, праекты і мерапрыемствы, якія садзейнічаюць папулярызацыі чытання сярод моладзі.

23 мая на Лагойшчыне ў чарговы раз сабраліся маладыя паэты Міншчыны на злёт “Слова Купалы да творчасці кліча”. Мерапрыемства адбылося ў філіяле літаратурнага музея Янкі Купалы “Акопы”, які знаходзіцца ў маляўнічай вёсцы Харужанцы. У свяце прынялі ўдзел вядомыя паэты М. Чарняўскі, В. Шніп, Г. Каржанеўская, галоўны рэдактар “ЛіМа” Т. Сівец, больш за 20 маладых людзей розных прафесій, студэнты і школьнікі, якія захапляюцца літаратурай і робяць свае першыя крокі ў творчасці. Іх вершы ўвайшлі ў 9 выпуск альманаха “Слова Купалы да творчасці кліча”.

Такім чынам можна зазначыць, што метадычная дзейнасць, накіраваная на аказанне тэарэтычнай і практычнай дапамогі бібліятэкам Міншчыны, шматбаковая і эфектыўная, а таму формы работы дзеля дасягнення станоўчых вынікаў штогод ўдасканальваюцца і пашыраюцца.

# Бібліятэкі Міншчыны ў 2015 годзе: агляд дзейнасці

**Складальнікі:** Анацка В. Л.
Бубіна П. В.
Гіль В. М.
Кравец С. С.
Мельнічак А. А.
Рудзянок І. С.
Чыжык К. А.
Шакура В. І.

**Падпісана да друку:** 17.03.2016 г.

**Тыраж** 3 экз. Заказ № 3

Рызограф Мінскай абласной бібліятэкі імя А. С. Пушкіна
220005 г. Мінск, вул. Гікалы, 4
Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна